(4) 1408

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

INSTITUT für WEISSRUTHENISCHE KULTUR

Abteilung der Humanitärwissenschaften

АЛ. ШЛЮБСКІ

МАТАР'ЯЛЫ
ДА ВЫВУЧЭНЬНЯ ФОЛЬКЛЁРУ і МОВЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

I.

AL. ŠLUBSKI

MATERIALEN
FÜR ERFORSCHUNG DER VOLKSDICHTUNG UND SPRACHE DES WITEBSK-GEBIETES

ВЫДАНЬНЕ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
У МЕНСКУ—1927

(4) 1408

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

INSTITUT für WEISSRUTHENISCHE KULTUR

Abteilung der Humanitärwissenschaften

АЛ. ШЛЮБСКІ

МАТАР'ЯЛЫ
ДА ВЫВУЧЭНЬНЯ ФОЛЬКЛЁРУ і МОВЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

I.

AL. ŠLUBSKI

MATERIALEN
FÜR ERFORSCHUNG DER VOLKSDICHTUNG UND SPRACHE DES WITEBSK-GEBIETES

ВЫДАНЬНЕ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
У МЕНСКУ—1927

ИНСТИТУТ
БЕЛОРУССКОЙ
КУЛЬТУРЫ

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

БЕЛАРУСКАЯ ЭТНОГРАФІЯ Ў ДОСЬЛЕДАХ І МАТАР'ЯЛАХ

КНІГА II

АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК
КАТЭДРА ЭТНОГРАФІІ.

Al'herd

Ал. ШЛЮБСКІ.

МАТАР'ЯЛЫ ДА ВЫВУЧЭНЬНЯ ФОЛЬКЛЁРУ і МОВЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

ЧАСЬЦЬ І

КОШТАМ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
У МЕНСКУ 1927

Надрукавана згодна з пастановаю Аддзелу Мовы і Літаратуры ад 20/I 1927 г. у ліку 2.000 экзэмпляраў.

Неадменны Сакратар ІБК *В. Ластоўскі.*

II 106.902

Менск. Друкарня Інбелкульту. Зак. № 126. 2000 эк. Галоўлітбел 25991.

ЗЬМЕСТ.

	Стар.
Уступ	1— 11
Замовы	13— 41
I. Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне замоў	15— 16
II. Матар'ялы аб замоўніках	17— 30
III. Тэксты замоў	31— 41
Калядныя песьні	43— 56
I. Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне калядных песень і звычаяў	45— 46
II. Калядныя звычаі	47— 48
III. Тэксты калядных песень	49— 56
Запусныя песьні	57— 63
I. Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне запусных песень і звычаяў	59
II. Звычаі	60— 61
III. Тэксты запусных песень	62— 63
Веснавыя песьні	65— 94
I. Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне зьбіраньня веснавых песень і звычаяў	67— 68
II. Веснавыя звычаі	69— 71
III. Тэксты веснавых песень	72— 94
Русальныя песьні	95— 99
I. Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне русальных песень і звычаяў	97
I. Русальныя песьні	98— 99
Купальскія песьні	101—133
I. Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне купальскіх песень і звычаяў	103—104
II. Купальскія звычаі	105—106
III. Тэксты купальскіх песень	107—125
Пятроўкі	125—133
Песьні працы	135—174
I. Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне песень, якія сьпяваюцца пры працы	137—139
II. Жніўныя і талочныя звычаі	140—141
III. Тэксты жніўных песень	142—165
Тэксты талочных песень	166—172
Ільняная песьня	173
Стругоўскія песьні	173—174
Пастушшая песьня	174
Паказьнікі	177—187
I. Альфабэтны сьпіс песень	177—181
II. Паказьнік песенных сюжэтаў	182—185
III. Географічны паказьнік	186—187
Памылкі друку	188

У С Т У П.

Аддаючы на суд крытыкі першую частку сваёй дзесяцігадовай зьбіральніцкай працы (першы запіс зроблены 23 сакавіка 1913 г.; апошні—у лютым 1923 г.), якая мае 2.500 №-роў запісаў розных відаў народнай творчасьці, я павінен сказаць некалькі слоў аб крыніцах, з якіх я чэрпаў матар'ял і аб падсобніках, якімі я карыстаўся пры апрацаваньні сабранага матар'ялу.

Увесь матар'ял, за невялікімі выключэньнямі (якія ўсюды адзначаны), запісан маёй уласнай рукой у былых паветах: Полацкім, Віцебскім, Лепельскім, Сеньненскім, Сураскім, Вяліскім і Парэцкім (цяпер Дзямідаўскім). Матар'ял запісан у беларускіх вёсках са слоў беларускага жыхарства і галоўным чынам са слоў жанчын, якія ў сучасны момант, дзякуючы агульна-жаноцкай консэрватыўнасьці, зьяўляюцца галоўнымі захоўцамі вуснай беларускай народнай творчасьці. Пераважная большасьць запісаў зроблена са слоў няпісьменных жанчын, якія далей сваёй воласьці або павятовага гораду нідзе ня былі; гарадзкая культура, русіфікуючы беларускае жыхарства, не датыркнулася беспасярэдна да мотываў іх нацыянальнай творчасьці; русіфікатарскія ўплывы, якія часам знаходзяцца ў запісаных са слоў іх матар'ялах, занесены на вёску мужчынскай паловай жыхарства...

Усюды, дзе мной рабіліся больш-менш важныя запісы, адзначана са слоў каго яны рабіліся, таксама адзначана становішча казальніка ў выяўленьнях, цікавых для этнографа; з аднымі адзначэньнямі месцаў запісаў, бяз іншых этнографічных уваг, засталіся толькі тыя нумары, якія былі запісаны: папершае, ня мной, альбо, падругое, мной пры выпадковых умовах у месцах, дзе ня быў падрыхтаваны грунт для этнографічных запісаў; у этнографічнай літаратуры адзначана падазронасьць і неахвотнасьць жыхарства да незнаёмых сялянам асоб, што зьбіраюць этнографічныя матар'ялы. Такія адносіны ніколькі не зьмяніліся аж да самых апошніх дзён. Зразумела, пры такіх умовах пытаць прозьвішча або што іншае, нельга, калі ня хочаш канчаткова сапсуць сабе справу.

Такім парадкам, запісы сабранага мной матар'ялу з беларускай вуснай народнай творчасьці былі зроблены ў гэтках мясцовасьцях:

Александрова, двор Аршанскага п.

Амельчынкі Мікалаеўскай в., Полацк. п.; матар'ял атрыманы з Полацкай Камісіі па ахове помнікаў старажытн.

Арлоўка Струнскай в., Полацк. п.; са слоў няпісьмен. дзяўчыны.

Асіньнікі Арцейкаўскай в., Полацк. п.; са слоў няпісьмен. старухі.

Аўдзейкава Руднянскай в., Гарадоцк. п.; са слоў чырвонаармейца Івана Башкова, 27 год.

Бабінічы Бабініцкай в., Віцебск. п., са слоў 60-гадовай, няпісьмен. жанчыны „Анухрэўны".

Бародзеншчына, воласьць Парэцкага п. (на рубяжы з Вязьмёнск. вол. Вяліск. п.); са слоў старух.

Барсукі Каралеўскай в., Віцебск. п.; са слоў Мар'і Стэфкінай, 59 год, няпісьмен.

Белавіна Баранаўск. в., Вяліск. п.

Белая Дуброва Жарабыцкай в., Віцебск. п.; са слоў старух.

Будніца Будніцкай в., Вяліск. п.

Верхняе Альгова Будніцкай в., Вяліск. п.; са слоў Ганны Трахімавай, 29 год, няпісьмен. і Ганны Івановай, 40 год—малапісьменнай.

Віцебск, песьні—са слоў няпісьмен. сялянкі Віцебскага п., загаворы—са слоў пісьменнай мяшчанкі г. Віцебска Э. Малецкай.

Вязьменская в., Вяліск. п.; апісаньне вясельля са слоў селяніна Аляксандра Аксюцёнка, 34 год.

Вяліж; вясельныя звычаі—са слоў 60-гадовага мешчаніна г. Вяліжа І. Хлеўнікава; казка—са слоў малапісьмен. мяшчанкі Аляксандры Кіраёнак; прыпеўкі—са слоў чырвонаармейца, вяліск. мешчаніна, Рамана Касаўцава, пісьменнага; зьява—са слоў сялян; псальмы—са слоў мешчаніна Багдановіча („Малафеевіча"), пісьмен., 80 год.

Вярхоўе Будніцк. в., Вяліск. п.; са слоў Н. Г. Лесавой.

Гарадзец Будніцк. в.. Вяліск. п.; са слоў няпісьмен. маладзіцы (у дзявоцтве Якаўлевай).

Гарбачэва Бабініцк. в., Віцебск. п.

Гарбаценкі Юравіцк. в., Полацк. п.; са слоў Натальлі Гарбачэнка, 25 г.; Мар'і Старовай, 45 г.; Аф. Чаркасавай, 23 г.; Мар'і Старавойтавай, 45 г.

Матар'ялы атрыманы з Полацк. Кам. па ахове помнік. старажыт.

Глушанкі Юравіцк. в., Полацк. п.; са слоў Пятра Прасакова, 16 год. Матар'ял—з Полацк. Кам. па ахове пом. старажыт.

Далуева Андрэеўскай в., Полацк. п.

Дзейкаўшчына, хутар каля с. Крутага Вязьмёнскай в., Вяліск. п.; са слоў Параскевы Іванавай (Кіраёнак), 80-гадовай загаворшчыцы, няпісьменнай.

Дутчына Лескавіцкай в., Віцебск. п.; са слоў Н. Шчукінай, 26 г., няпісьмен.

Екіманьня Домнікаўская в., Полацк. п.; са слоў Базыля Старавойтава, 84 г.; матар'ял атрыманы з Полацк. Кам. па ахове помнік. стараж.

Жагулі Маклакоўскай в., Вяліск. п.

Жарабычы Жарабыцкай в., Віцебск. п.; прыпеўкі—са слоў дзяўчын, якія вучыліся ў пачатковых школах.

Жукоўшчына, Вяліская Абодніца, Вяліск. п., загавор—са слоў малапісьменнай „шляхцянкі" 54 г. Эрдман, якая родам з Полацкага п.

Забор'е Чарэйскай в., Сеньненскага п.

Забулдычына, Вазьнясенскай (цяпер—Чырвонаармейскай) в., Полацк. п.; са слоў Анастасьсі Пятроўны Юргялевіч („Юргялевічыхі"), 75 г., няпісьмен. „хадзіла на прыгон".

Іванова Вазьнясенскай в., Полацк. п.; песьні і прыпеўкі—са слоў дзяўчын; апавяданьні—са слоў Надзеі Шлюбскай, 50 г., пісьмен.; апошняя шмат гадоў жыла ў с. Межаве, суседняй Аляксандраўскай в.

Кавалі Бабініцкай в., Віцебск, п.; са слоў Ганны Хлапцовай, 17 г., пісьмен.

Канец Вязьмёнскай в., Вяліск. п.; са слоў Радзівона Струкава, 90 г., няпісьмен.

Карбаны Аршанск. п.

Каханы Ветрынскай в., Полацк. п.; са слоў Антона Шашкі, 27 г., малапісьм.

Кашавічы Кашавіцкай в., Сураск. п.; са слоў: Домны Лебедзевай, 50 г., няп.; Параскевы Самусёнкавай, 19 г.; Мар'і Саўчанкавай, 23 г.; Ульяны Ермачэнкавай, 45 г., няпісьм.; Марыны Таташкінай, малапісьм., 19 г.; Натальлі Лакеевай, 37 г., няп.; Барбары Ягарэнкавай, 17 г.; невялікі лік песень запісан Ганчаровым, якія песьні ім запісаны ўстанавіць па некаторых прычынах нельга.

Косаўшчына, Усайскай в., Лепельск. п.; са слоў Веры Чартковай, 26 г., малап.

Крутае Вязьмёнскай в., Вяліск. п.; песьні і прыпеўкі—са слоў Палагеі Пушкаровай, 60 г., няпісьмен.; Параскевы Аксюцёнак, 60 г., няпісьмен.; Аўдакеі Кіраёнак, 45 г., няпісьмен.; Дар'і Аксюцёнак, 45 г., няпісьмен.; Е. Міронавай, 45 г.; Барбары Глушчонак, 25 г., няпісьм.; Кацярыны Ерамёнак, 25 г., няпісьм.; Марушкі Валодчанка, 18 г., няпісьм.; Ганны Аксюцёнак, 15 г.; Ганкі Палахінай, 19 г., няпісьм.; В. Аксюцёнак, дзяўчынка 7 год (з яе слоў—некаторыя прыпеўкі); Пётры Аксюцёнак, 43 г., малапісьмен.; Мікіты Кіраёнак, 14 г., пісьмен.; казкі—са слоў Міхайлы Іванова (каля 50 г., пісьмен.), які жыў па ўсёй Віцебшчыне, але казкі выўчыўся са слоў вядомага ў 1880 гадох у Вязьмёнскай вол. казачніка Аўсіма Антонава Сказкі.

Крыжы (с. Кресты) Крастоўск. в., Вяліск п.; са слоў дзяўчыны.

Крынкі Аршанск. п.

Курганы Узкаўскай в., Вяліск. п.

Лескавічы Лескавіцк. в., Віцебск п.

Лёзна Аршанск. п.; са слоў дзяўчыны, якая хадзіла працаваць у суседнія мяйсцовасьці.

Лубок, Вяліская Абодніца, Вяліск. п.; са слоў Якаўлевай, старухі загаворшчыцы, няпісьмен.

Маклакоўская в., Вяліск. п.; са слоў Лукі Бараўчыкова, запіс 1870 г. Кісялёва.

Маклок Вяліск. п.; запіс 1870 г. Кісялёва са слоў Піліпа Архіпава; рэшта—са слоў Хвёдара Пястунова.

Мамуты Будніцкай в., Вяліск. п.; са слоў Сьцяпана Жаркова, 90 г., няпісьмен.

Марацова Маклакоўскай в., Вяліск. п.; са слоў Арыны Пятушыхі, 58 г., няпісьмен.

Межава Аляксандраўскай в. (цяпер Чырвонаармейскай), Полацк. п.; песьні і апавяданьні—са слоў Надзеі Шлюбскай; прыказкі—са слоў Анупрэя Шлюбскага.

Мілавіды Будніцкай в., Вяліск п.; са слоў дзяўчын, малапісьменных.

Міхалова Маклакоўск. в., Вяліск. п.

Мясаеды Міхалоўшчынскай в., Віцебск. п.

Нівы Будніцкай в., Вяліск. п.; песьні—са слоў Ефрасіньні Карпавай, 20-гадовай маладухі, няпісьменнай; загавор—са слоў Данілы Мінаева, земляроб 65 год, няпісьмен., загаворшчык.

Ніжняе-Краснае Будніцкай в., Вяліск. п.; са слоў маладзіцы Акуліны Якаўлевай, 25 г., няпісьменнай.

Нікрапольле Сялюцкай в., Віцебск. п.; са слоў Лукер'і Багданавай (у дзявоцтве Рагозінай), 71 г., няпісьмен., бацькі яе былі вуніятамі.

Павулянка Мішкаўскай в., Віцебск. п.; са слоў Надзеі Лапіцкай, 12 год, малапісьмен.

Пазьнякова Юравіцкай в., Полацк. п.; са слоў Настасьсі Дегцяровай, 16 г.; матар'ял атрыманы з Полацкай Кам. па ахове помнік. стараж.

Палоска Сярцейскай в., Вяліск. п.; са слоў чырвонаармейца 22 г. Грыгора Глухарова.

Плоскае Абчугск. в., Сеньненск. п.; са слоў 55-гадовай няпісьмен. старухі.

Полацак.

Полтанава Сярцейскай в., Вяліск. п.; прыпеўкі—са слоў Івана Бярлінава, 25 г., малапісьмен.; быў у палоне ў Нямеччыне.

Праявіна Маклакоўскай в., Вяліск. п.; са слоў Палагеі Зубковай, няпісьмен., 17 г.

Прудок Маклакоўск. в., Вяліск. п.; са слоў Пятрака Пушкарова, 36 год, пісьмен., былы жаўнер, родам з Трусаўшчыны, Вязьмёнскай в., таго самага п.

Псярцы Вярхоўскай в., Віцебск. п.; са слоў Арыны Лапіцкай, 37 г., няпісьмен.

Пышнікі Курынскай в., Віцебск. п.

Рабыя Паташынскай в., Гарадоцк. п.

Ражнова Вязьнясенскай (цяпер Чырвонаармейск.) в., Полацк. п.; са слоў Н. Шлюбскай, 50 г., пісьмен.

Ражнова Юравіцкай в., Полацк. п.; са слоў. Мар'і Старавойтавай, 45 г. (запіс Гарбачэнкі). Матар'ял—з Полацк. Кам. па ахове пом. стараж.

Ракіціна Невельскага п.

Расона Вязьнясенск. (цяпер Чырвонаармейск.) в., Полацк. п.

Себескі п.

Сенькава Бабініцкая в., Віцебск. п.

Сінякі Будніцкай в., Вяліск. п.; песьні—са слоў старухі Саўчанка, 60 год, няпісьменнай; прыпеўкі — са слоў маладзіцы Дар'і Саўчанка, 22 год, малапісьменнай.

Скачыхі Кубліцкай в., Лепельск. п.; са слоў Веры Разумнікавай, 33 год, малапісьменнай.

Смалькі Лескавіцк. в., Віцебск. п.; са слоў жанчыны 40 г., няпісьменнай.

Сураскі п.
Таўсьцюкі Астровенскай в., Віцебск. п.; са слоў 70-гадовай няпісьменнай жанчыны.
Трахімёнкі Арцейкаўскай в., Полацк. п.; са слоў 51-гадовай старухі, няпісьмен.
Туроўля Тураўлянскай в., Полацк. п.; са слоў Аляксандра Хруцкага, 44 г., пісьменнага.
Туры Крастоўскай в., Вяліск. п.
Ужляціна Старасельскай в., Віцебск. п.; са слоў Івана Акаловіча, жыхар Віцебску, але жыў і завучыў запісаныя песьні ў с. Ужляціне, пісьменны.
Узкаўская в., Вяліскага п.
Улазьні Гарадоцкага п.
Хадаўцы Сеньненскі п.; са слоў маладзіцы, няпісьменнай.
Хаершчына Віцебскі п.; са слоў 50-гадовай старухі, няпісьменнай.
Чанавічы Астровенскай в., Віцебск. п.; са слоў Канапелькі, 35 год, няпісьменнай.
Чаркасы Аршанскі п.
Чацьвярня Маклакоўскай в., Вяліск. п.; са слоў Карнея Піліпава, няпісьменнага.
Чэплі (Цэпля) Чэпельскай в., Вяліск. п.
Шакоры Жарабіцкай в., Віцебск. п.
Шаркі Жарабіцкай в., Віцебск. п.
Шаршні Усьвяцкай в., Вяліск. п.
Шумілава Сярцейскай в., Вяліск. п.
Шчучэйская в., Парэцкага п.; са слоў Ганны Аляксандравай.
Шчуч'е Парэцкага п.
Юравічы Юравіцкай в., Полацк. п.
Язьвіна Старасельскай в., Віцебск. п.
Янавічы мястэчка Віцебск. п.

Падсобкамі пры апрацоўцы матар'ялу былі пералічаныя ніжэй зборнікі беларускай народнай творчасьці, якія я мог знайсьці ў менскіх бібліотэках; некаторыя працы, праўда, другарадныя, адсутнічаюць; сьпіс падсобкаў зьмешчан у альфабэтным парадку:

Аникіевічъ.—С. У.—Сѣнненскій у., Могилевской губерніи. Могилевъ, 1907.

Анимелле.—Б. Б. К.—Бытъ бѣлорусскихъ крестьянъ („Этнографическій Сборникъ Русск. Географич. О-ва", вып. 2, 1854).

Безсоновъ.—Б. П.—Бѣлорусскія пѣсни. Москва, 1871.

Безсоновъ.—К. П.—Калики перехожіе, I-VI. Москва, 1861—1864.

Бѣлановичъ. — Пѣсни, записанныя въ Вилейскомъ уѣздѣ („Минская старина", II, Минскъ, 1911).
Бѣлоцерковецъ.—Ж. П.—Жатвенныя пѣсни въ Борисовскомъ у. Минской губ. („Зап. С.-З. Отд. Руск. Географ. Общ." 1912, 3).
Бренъ.—О. Р. Б.—Особенности религіознаго быта крестьянъ Бѣльскаго у., Гродненской губ. Вильна, 1887.
Булгаковскій.—П.—Пинчуки. Спб. 1890.
Быковскій.—К.—О праздникѣ Купалы („Памятная книжка Виленскаго Генералъ-Губернаторства на 1868 г." Спб. 1868).
Быковскій.—С. О.—Свадебные обряды и пѣсни въ Пинскомъ уѣздѣ Минской губ. (ibidem).
Bykowski.—Pieśni obrzędowe ludu ruskiego z okolic Pińska (Zbiór wiadomości do antrop. krajowej. Kraków. II). Адменьнікі па адбітку.
Бычко-Машко.—С. Н. П.—Сборникъ народныхъ пѣсенъ, записанныхъ въ поселкѣ Калюга-Камарна Рогоз. в., Кобринск. у., Гродненской губ. Спб. 1911.
Гильтебрандтъ.—С. П.—Сборникъ памятниковъ народнаго творчества въ Сѣверо-Западномъ краѣ. Вильна, 1866.
Hryniewič.—В. Р.—Hryniewič, A. i Ziaziula, A. Biełaruskije pieśni z notami, I-II. Pieciarburh, 1910—1912.
Гуковскій.—С. Л. Б.—Свадьба у литовскихъ бѣлоруссовъ. Ковна, 1894.
Дембовецкій.—О. М. Г.—Опытъ описанія Могилевской губ. I, Могилевъ, 1882.
Демьяновичъ.—О духовныхъ стихахъ, употребительныхъ въ Брашевскомъ приходѣ Кобринскаго у. Вильна, 1892 г.
Дмитріевъ.—С. П.—Собраніе пѣсенъ, сказокъ, обрядовъ и обычаевъ крестьянъ Сѣверо-Западнаго края. Вильна, 1869.
Добровольскій.—З.—Загадки, записанныя въ Смоленскомъ уѣздѣ („Живая Старина", 1905, I-II).
Добровольскій.—С. С.—Смоленскій Этнографическій Сборникъ. I-IV. Спб., 1891—1903.
Д.-Запольскій.—Б. С.—Запольскій, М. Бѣлорусская свадьба и свадебныя пѣсни. Кіевъ, 1888.
Д.-Запольскій.—П. П.—Бѣлорусское Полѣсье, I. Пѣсни Пинчуковъ. Кіевъ, 1895.
Zieńkiewicz.—P. G.—Piosenki Gminne ludu Pińskiego. Kowno, 1851.
Ивановъ.—К. С.—Крестьянская свадьба въ Витебской Бѣлоруссіи („Записки Сѣв.-Зап. Отд. Русскаго Географич. Общ." 1912, III).

Karłowicz.—P. B.—Podania i bajki ludowe zebrane na Litwe. Kraków, 1887.

Карскій.—Б.—Бѣлорусы, I, III. в. 1, Вильна—Москва, 1904—1916.

Карскій.—Б. П.—1) Бѣлорусскія пѣсни с. Берёзовца Новогрудскаго у., Минской губ. („Русскій Филологич. Вѣст.“, XII-XIII). 2) Бѣлорусскія пѣсни д. Новосёлокъ Затрокскихъ Виленской губ., Трокскаго у. (ibidem, XXI).

Киркоръ.—С. Я.—Слѣды язычества въ праздненствахъ, обрядахъ и пѣсняхъ („Живописная Россія“, III).

Киркоръ.—Э. В. В.—Этнографическій взглядъ на Виленскую губернію („Этнографич. Сбор.“ Русск. Геогр. Общ. 1858, III).

Косичъ.—Л. Б.—Литвины—Бѣлоруссы Черниговской губерніи. Спб., 1902.

Костылевъ.—Пѣсни крестьянъ с. Краснозаборье, Рославльскаго у., Смоленской губ. („Русск. Филологическ. Вѣст.“ XII).

Крачковскій.—Б. С.—Бытъ западно-русскаго селянина. Москва, 1874.

Lastoŭski.—P.—Pгypeŭki. Wilnia, 1918.

Лёсік.—Ксяневіч, Вясельныя песьні („Адраджэньне“ I, 1922).

Ляцкій.—П. З.—Матеріалы для изученія творчества и быта бѣлоруссовъ. Пословицы, поговорки, загадки. Москва, 1898.

Малевичъ.—Б. П.—Бѣлорусскія пѣсни. Спб., 1907.

Мезерницкій.—Н. Т. П.—Народный театръ и пѣсни въ г. Стародубѣ, Черниговской губ. („Живая Старина“, 1909, I, IV; 1910, I-II).

Никифоровскій.—Б. П.—Бѣлорусскія пѣсни „Частушки“. Вильна, 1911.

Никифоровскій.—О. В. Б.—Очерки Витебской Бѣлоруссіи I-VIII. Москва, 1892—1899.

Никифоровскій.—П. З.—Простонародныя загадки („Памят. кн. Витебской губ. на 1898 г.“ Витебскъ, 1898).

Никифоровскій.—П. П. — Полупословицы и полупоговорки, употребляемыя въ Витебской Бѣлоруссіи („Зап. С.-Зап. Отд. Русск. Геогр. Общ.“ I-III).

Носовичъ.—Б. П.—Бѣлорусскія пѣсни („Записки Русскаго Географ. Общ.“, V, 1873).

Носовичъ. — С. П. — Сборникъ бѣлорусскихъ пословицъ. Спб. 1874.

Радченко.—Г. П.—Гомельскія народныя пѣсни. Спб., 1888.

Розенфельдъ.—Б. П.—Бѣлорусскія народныя пѣсни. Спб. 1904.

Романовъ.— Б. С.—Бѣлорусскій Сборникъ, I-VIII. Кіевъ—Витебскъ—Вильна, 1886—1912.
Романовъ.—Д. П.—Древнія русскія пословицы („Зап. С.-Зап. Отд. Русск. Геогр. Общ.“ I-III).
Романовъ.—М.—Матеріалы по этнографіи Гродненской губ., I-II. Вильна, 1911—12.
Siemieński.—P. L.—Podania i legendy polskie, ruskie, litewskie. Poznań, 1845.
Сербовъ.—Б. С.—Бѣлоруссы-Сакуны. Петроградъ, 1915.
Серебренниковъ.—О. О.—Обычаи и обряды крестьянъ Себежскаго у. при крестинахъ, свадьбахъ и похоронахъ („Памят. кн. Витебской губ. на 1865 г.“).
Сержпутовскій.—С. Р.—Сказки и разсказы бѣлоруссовъ-полѣщуковъ. Спб. 1911.
Сержпутоўскі.— К. А.—Казкі і апавяданьні беларусаў з Слуцкага павету. 1926.
Степанецъ.—Крестьянская свадьба въ южном Полѣсьѣ („Записки Сѣв.-Зап. Отд. Русск. Географ. Общ.“, 1910, I).
Tyszkiewicz.—W.—Tyszkiewicz Konstanty, Wilija i jej brzegi. Drezno, 1871.
Tyszkiewicz.— O. P. B.—Tyszkiewicz Eustachy, Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilna, 1847.
Federowski.—L. B.—Lud. Białoruski na Rusi Litewskiej, I-III, Kraków, 1897—1903.
Czeczot.—P. w. N. D.—Piosnki wieśniacze z nab Niemna i Dźwiny. Wilno, 1846.
Шейнъ.—Б. П.—Бѣлорусскія народныя пѣсни. Спб. 1874.
Шейнъ.—М.—Матеріалы для изученія быта и языка русскаго населенія Сѣверо-Западнаго края. I-III, Спб. 1887—1902.
Янчукъ.—П. М.—По Минской губернии („Труды Этнографич. Отд.“ Общ. Л. Е. А. Э. т. IX, в. I).

Песенны матар'ял падзелены на групы згодна таму падзелу, які яму дае сам народ, і дзеля гэтага здарылася так, што адзін сюжэт у розных мясцовасьцях адносіцца да розных аддзелаў песень, якія сьпяваюцца ў розныя часткі году; гэты *народны* падзел я ўнёс у кнігу нязьменна, лічачы, што ён дае этнографу матар'ял сачыць за пачынаючай разьвівацца ў народзе роўнадушлівасьцю да сваёй вуснай творчасьці і старадаўных звычаяў.

У навуковых мэтах я знайшоў патрэбным сурова выраўняць навуковую клясыфікацыю беларускай народнай творчасьці, якая адсутнічае ў папярэдніх фольклёрных выданьнях. Дзякуючы таму, што народ песьням аднаго цыклю даваў розныя найменьні, у беларускай этнографічнай літа-

ратуры пануе з навуковага боку часта самы хаотычны, падзел народнай творчасьці на паасобныя групы.

Клясыфікацыя народнай творчасьці, якую я ўжываю, а таксама і парадак разьмеркаваньня матар'ялу, наступныя: замовы калядныя песьні, запусныя песьні, веснавыя песьні, русальныя песьні, купальскія песьні, песьні пры працы, хрэзьбінскія песьні (да якіх далучаны дзіцячыя песьні), вясельныя песьні, хаўтурныя галашэньні, бытавыя песьні, прыказкі, загадкі, казкі, творы са сьлядамі гэроічнага эпосу, духоўныя вершы.

У такім-жа хронолёгічным парадку разьмяркоўвае матар'ял і акад. Е. Карскі (Бѣлорусы, том 3, в. I, Москва, 1916 г.).

У зборніку зьмешчана большая частка матар'ялу па вуснай народнай творчасьці, які быў мной сабраны на абшарах паўночна-заходняй Беларусі, іншы раз незалежна ад знахаджэньня падобных сюжэтаў у друку, паводле наступных прычын:

1. Для выяўленьня географічнай распаўсюджанасьці песенных сюжэтаў.

2. Для вывучэньня асаблівасьцяй мовы, бо папярэднія запісы па Віцебшчыне адзначаюцца недакладнасьцю.

3. Усе запісы зроблены ў новых мейсцах, дзе яны раней не рабіліся.

4. Для параўнаньня больш-менш аднастайных песень 40—80 гадоў мінулага стагодзьдзя з песьнямі XX ст.

Пры адзначэньні адменьнікаў маім заданьнем было адзначыць адменьнікі ў магчымай паўнаце выключна беларускага фольклёру.

Пры выяўленьні ўжо пройдзенага этнографамі зьбіральніцкага шляху, я ўзяў усю паўночна-заходнюю тэрыторыю Беларусі, якая складаецца з такіх паветаў: Аршанскага (да рубяжу з Горацкім паветам), Віцебскага (ён блутаецца з зачыненым Сураск. п.), Вяліскага (тое самае), Гарадоцкага, Дісьненскага, Дзьвінскага, Дрысенскага, Ілуцкага (Курлян. губ.), Лепельскага, Люцынскага, Невельскага, Нова-Аляксандраўскага (Ковенск. губ.), Парэцкага (Дзямідаўскага), Полацкага, Себескага, Сеньненскага і Сураскага (часамі блутаецца з Віцебскім і Вяліскім пп.).

Захаваньне дарэволюцыйнага адміністрацыйнага падзелу тлумачыцца тым, што тэрыторыя, якую я разглядаю ў сучасны момант, уваходзіць у склад чатырох дзяржаў: БССР, РСФСР, Польшчы і Літвы; падругое—такі падзел робіць лёгкім карыстаньне дарэволюцыйным друкаваным матар'ялам.

Адносна запісаў мовы павінен адзначыць, што я ўжываю беларускі літаратурны альфабэт з увядзеньнем новых знакаў: „и“, „є“ для вызначэньня няпоўнай мяккасьці і няпоўнай цьвёрдасьці папярэдняга зычнага; „о“ ўсюды пад націскам*); дыфтонгі, якія можна знаходзіць у мяйсцовасьцях, дзе зьбіраўся матар'ял, апушчаны, галоўным чынам, з мэтай лепшай праверкі іх ужываньня ў мове і для выяўленьня тэрыторыі іх распаўсюджанасьці, як прыклады, адзначу некаторыя прыкмечаныя мной дыфтонгі; у Полацкім павеце, Домнікаўская воласьць—„навуо̯́з“, „сіе̯́на“, „зіярно́“, „хвуо̯́ра“, той самы павет, Вазьнясенская волàсьць: „сіяліба“, „піячні́к“, „віяніе̯́ц“, „шыэльма“; Віцебскі павет, Старасельская вол.—„ліябёды“ (назва вёскі), Вялікі павет, с. Крутое—„атрія̯́д : па 'трія̯́ду“, той самы павет, Крастоўская вол.—„мніе̯́“, „у дваріэ“, той самы павет, Маклакоўская вол.—„авюо̯́с“, „гарié̯лка“.

У часе падрыхтоўкі гэтага зборніку да друку я карыстаўся радамі і паказаньнямі Старшыні Аддзелу Мовы і Літаратуры Інстытуту Беларускае Культуры С. М. Некрашэвіча, якому лічу сваім абавязкам выказаць шчырую падзяку за прыхільныя адносіны да маёй працы.

*) „Г“ усюды чытаецца, як лацінскае „Н“.

ЗАМОВЫ

I.

Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне замоў *).

Замовы, якія маюцца ў друку (у тым ліку і мае гэтай кнігі), на абшары былых 15 паветаў разьмяркоўваюцца такім парадкам:

Аршанскі павет: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Романовъ. Б. С., V); м. Рудня—2 (тс.); м. Мікуліна—8 (тс.); Высокае—2 (Романовъ, Матеріалы для изуч. говоровъ Могилев. губ. „Живая старина", 1902, III—IV).

Віцебскі павет: без азначэньня валасьцей і вёсак—7 (Романовъ, Б. С., V). Віцебск—2 (Шлюбскі). Гайдукова—4 (Романовъ, Б. С., V). Каралёва—1 (тс.). Каралёўская воласьць—4 (Шейнъ, М., II). Сялюты—1 (Романовъ, Б. С., V). Сялюцкая в.—1 (тс.). Таўсьцюкі—1 (Шлюбскі).

Вяліскі павет: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шлюбскі). Вяліж—1 (тс.). Дзейкаўшчына—4 (тс.). Жукаўшчына—4 (тс.). Крутое—1 (тс.). Лубок—4 (тс.). Нівы—2 (тс.).

Гарадоцкі павет: без азначэньня воласьці і вёскі—4 (Романовъ, Б. С., V). Мішневічы—2 (тс.). Хвошно—1 (тс.). Некалькі загавораў і апісаньні лекаваньня некаторых хвароб знаходзяцца ў нарысе Ив. Махова (Ив. Кузьмина): „Какъ у насъ лечатъ" (Витебскія губ. Вѣд.; 1902, № 192).

Лепельскі павет: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шейнъ, М., II). Замовы і некаторыя др. этнографічныя матар'ялы знаходзяцца ў нарысе Варэнка: Przyczynek do lecznictwa ludowego (Materyaly antropołogicznoarcheolodiczne i etnograficzne... Krakow, т. I), галоўным чынам вёскі Пуцылкавічы.

Люцынскі павет: без азначэньня воласьці і вёскі—1. (Романовъ, Б. С., V). Ляудеры—2 (тс.).

Нова-аляксандраўскі павет: Дукшты—3 (Шейнъ, М., II).

Парэцкі (Дзямідаўскі) павет: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шейнъ, М., II). Баркі—7 (тс.). Іконькава—6 (Добровольскій, С. С., I).

Полацкі павет: Арлова—1 (Шлюбскі). Забулдычына—2 (тс.). Межава—1 (тс.). Полацак—7 (тс). Экімань—6

*) Матар'ялы гэтых глаў кнігі часткова надрукованы ў артыкуле: *„Вынікі зьбіраньня вуснае народнае творчасьці"* ў часопісу „Крывіч", Коўна, 1927. № 12; стар. 38—56 укл.

(тс). Гл.: „Выписки изъ Полотскихъ магистратскихъ актовыхъ книгъ и протестаціи пана Паука о позаливанью чимсь дома его, на знакъ чаровъ и пана Лисовскаго о присылкѣ изъ дома пани Чеслевской, такъ же на знакъ чаровъ, таракановъ", Сообщено А. Созоновымъ („Витебскія губ. Вѣд." 1864, № 5).

Себескі павет: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шлюбскі).

Сеньненскі павет: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Романовъ, Б. С., V). г. Сянно—4 (тс.). Лісічына—1 (тс.). Торбінка—1 (тс.). Ульяновічы—2 (тс.).

Сураскі павет: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шлюбскі).

У Раманава (Б. С., V) знаходзіцца 3 загаворы з абазначэньнем: Віцебская губэрнія.

Матар'ялы аб загаворах, загаворшчыках і чараўніцтве па Віцебскай губ. знаходзім у Шэйна (М., III), И. Поливена: Нѣсколько словъ о колдунахъ и знахаряхъ Витебской губ. (Витебскія губ. Вѣд., 1865, № 41) і Е. Бѣлозерскаго: Наши знахари и прорицатели (Витебск. губ. Вѣд., 1900, № 241). Мной-жа па гэтаму прадмету сабраны матар'ялы ў такіх мясцовасьцях: Вяліскі павет: Вяліж—Будніцкай вол., Крутое, Лісяны і Старое Сяло—Вязьмёнск. в. Буянова, Шалгуны і Бабуры—Чэпельскай в., Віцебскі п.: Месаеды—Міхалоўшчынскай вол., Сабачонкі, Шавелі—Веляшкоўскай вол. Полацкі п.: Забулдычына і Мошкарыцы—Вазьнясенскае вол., Межава-Александраўскай вол., Сураскі п.

Аб чараўнікох Віцебшчыны цікавыя матар'ялы падае Мік. Нікіфароўскі ў працы: „Простонародныя примѣты и повѣрья"...

Беларускія замовы ў першы раз навукова разгледжаны акад. Е. Карскім у яго досьледзе: „Бѣлорусы", III, 1, сс. 57—96. Архіўны матар'ял аб знахарстве выкарастан М. Даўнар-Запольскім у 1890 г. ў нарысе: „Чародѣйство въ Сѣверо-Западном краѣ въ XVII—XVIII в. („Этнографическое Обозрѣніе"); з прац, якія выйшлі пасьля досьледу акад. Е. Карскага, беларускія замовы закрануў Н. Познанскій у досьледзе: „Загаворы" („Записки историко-филологическаго факультета Петроградскаго университета", 1917. CXXXVI).

II.

Матар'ялы аб замоўніках.

Той посьпех, які мелі (а часткай маюць і цяпер у некаторых куткох Беларусі) розныя „загаворшчыкі", „знахары" і „калдуны", тлумачыцца надзвычайнай забабоннасьцю нашага вясковага селяніна. Мне ў 1914 г. ад беларускі, якая хадзіла „па ахвяры" на „Ефрасіньню" (23/V ст.ст.) у Полацак і якая ў першы раз убачыла там цягнік, давялося чуць, як яна апавядала аб вандроўцы ў сваёй вёсцы: „да душы, сястрыцы, хуць казалі, што пірамоз нейкій цягніць, не! Чэрці іх калёсы круцюць, я сама дужа добра чарцей відзіла прыміж калёс". (Межава, 60—65 вёрст ад Полацку). Калі ў Полацкім павеце ў першы раз зьявіўся цягнік, то сяляне звалі яго „чортавай кабылай", а некалькі жанчын нібы, паводле народных паданьняў, ад страху памерла, бо ім здалося, што наступіла сканчэньне сьвету. Якраз перад гэтым, як апавядаюць сяляне, ксяндзы казалі народу, што хутка пачнецца сканчэньне сьвету і што перад сканчэньнем па зямлі будуць бегаць „чортавы кабылы", а ўвесь сьвет будзе абцягнуты дротам (меўся на ўвазе, як відаць, тэлеграф). Дзякуючы гэтай царкоўна-касьцельнай агітацыі аб сканчэньні сьвету (якая вядзецца нават і цяпер), у час аднэй сонечнай зацьмы сяляне аднэй вёскі на Межаўшчыне (б. Полацкага п.) са страху перад нібы наступаючым сканчэньнем сьвету пачалі ламаць, біць і нішчыць свае хатнія прылады і маёнтнасьці. Існуе такое, напрыклад, паданьне: „Як радзіўся Ісўс Хрыстос, дык ён пусьціў жысьць на дзьве тысячы гадоў; цяпер жывём пасьледнюю сотню, а там сканчэньне сьвету" (Забулдычына, 1914).

Чалавек, які ў разумовых адносінах стаяў вышэй цёмнай вёскі, у вачох сялян гэтай вёскі рабіўся асобай, што мае справу з чарцямі. Так, у некаторых месцах Полацкага павету ў пачатку XIX стагодзьдзя жылі езуіты. Аб іх народ захаваў шмат легендарных паданьняў; вясковы беларус упэўнен, што езуіты былі „чарнакніжнікамі", і што яны мелі „чарнакніжныі" кнігі, пасьля чытаньня якіх да езуітаў прыходзілі чэрці і патрабавалі сабе працы. Каб выклікаць чар-

цей, трэба было на падлозе правесьці крэйдай круг, у сярэдзіну якога пакласьці „расьпяцьця“, на яго пастанавіць стол, і тры езуіты пры запаленых сьвечках павінны чытаць „чарнакніжныі кнігі“; сьвечкі павінны быць пасьвечанымі „на грамніцы“. Калі прыдуць чэрці і ня даць ім працы, то яны тады накідваюцца на тых, хто іх выклікаў. На вёсцы нават называюць цэлы шэраг імён, якім нібы засталіся ад езуітаў „чарнакніжныі“ кніжкі; цікава, што гэта або людзі памёршыя якім-небудзь надзвычайным парадкам, або вар'яты; сяляне тлумачаць іх сьмерць, вар'яцтва тым, што яны выклікалі чарцей, „начытаўшыся чарнакніжных кніжак“ і ня ведаючы, што з імі зрабіць; вось чэрці на іх і накідаюцца (Межава, 1919).

Зразумела, што пры такой упэўненасьці ў існаваньні чарцей, воражна настроеных проці чалавека, селянін шукае такіх людзей, якія маглі-б абараніць яго як ад чарцей, так роўна і ад людзей, што насылаюць зло на другіх праз дапамогу нячыстай сілы. І такімі асобамі зьяўляюцца „калдуны“ і ў меншай меры „загаворшчыкі“ і „знахары“. Замовамі на вёсцы займаюцца амаль што ўсе старыкі і старухі, якія дажылі да глыбокай старасьці, гадоў, так, да 70—90. У найбольш цёмных куткох Вяліскага павету, напр., у Усмынскай вол. замоўнікаў можна было знаходзіць у кожнай вёсцы.

Але ў апошнія дзесяцігодзьдзі, асабліва з 1917-1918 г.г., калі на вёску пачалі зварочвацца сяляне, што забраныя былі на расійска-нямецкую вайну, аўторытэт знахароў вельмі пахіліўся, значная большасьць мужчын знахаром ня верыць; да іх зьвяртаюцца цяпер, галоўным чынам, жанчыны, якія, агулам кажучы, вядомы сваёй вялікай консэрватыўнасьцю.

Цяпер можна пачуць, як сяляне сьмяюцца з знахара, у якога захварэла карова, і ён ня змог яе вылечыць (Крутое, 1920). У другім месцы сын расьсердаваўшыся лае бацьку—знахара—за яго замовы, як пустыя заняткі, як „чмýр“, і жартуючы дадае: „Ты скора ўсю ваду распрадасі з Дзьвіны“. (Яны жылі на беразе Дзьвіны). (Будніцкая вол., 1919). У трэцім месцы матрос, піўшы з знахáром гарэлку і лаяўшыся з ім, набіў апошняга; знахар пачаў пагражаць матросу: „Я табе падьдéлаю“. А матрос раззлаваўся больш і мацней пачаў біць за гэта знахара. Сяляне зьвярнулі на гэта ўвагу і адзначаюць з некаторым расчараваньнем, што знахар нічога матросу ня мог зрабіць (Сураскі п., 1920). У чацьвертым месцы селянін, гаворачы аб загаворах, кажа: „Чмурá гэта ўсё“ і тут-жа апавядае, як яго маці вазіла яго па ўсіх вядомых знахарох, каб вылечыць яго ад аднэй хваробы, так нічога яны не зрабілі і да гэтага дня ён хворы (Маклок, 1919).

Затрымаемся на некалькіх больш вядомых знахарох.

З апошніх найбольш вядомых замоўнікаў ня толькі ў Вяліскім павеце, але наогул на Віцебскай Беларусі быў „Старасельскі Ціт“. Прозьвішча яго ніхто ня ведаў, а ўсе называлі яго: „Ціт Сямёнавіч“. Жыў ён у вёсцы Старое Сяло, Вязьменскай вол., Вяліск. п. (у 15 вяр. ад гораду Вяліжу). Народ лічыў Ціта „ведзьмако́м“; дый выгляд у яго быў страшны, як сьведчаць людзі, што яго знялі: сярэдняга росту, прысадзісты, твар суровага выразу, з вачыма „на-выкат“, пануры, у гутарку ўступаў рэдка і больш маўчаў, гаварыў „у но́с“. Ёсьць паданьне, што ведзьмакі самі „напускаюць“ на сябе такі выгляд, каб іх баяліся. Ціт быў няпісьменны, але разумны селянін. Шэсьць гадоў быў Вязьменскім валасным старшынёю; у салдатах ня служыў і ні ў якіх гарадох, апрача Вяліжу, ня быў; замаўляць пачаў з самых маладых гадоў. Ціт быў „прахва́льный“, г. зн. услаўлены. Да яго прыяжджалі сяляне, якія жылі ад Старога Сяла больш чым за 100 вёрст—з паветаў Віцебскага, Бельскага і Парэцкага; яго ведалі, нават, у Полацкім павеце. Зьвярталіся да Ціта ня толькі вясковыя сяляне, але і мяшчане гораду Вяліжу і нават некаторыя паны. Зьвярталіся да яго і знахары менш вядомыя, што ня мелі такой моцы, як Ціт.

Жыў Ціт заможна; меў надзельнай зямлі 25 дзесяцін і куплёнай—50 дзесяцін. Грошы для куплі зямлі ён сабраў сваімі замовамі. У гаспадарцы меў машыны: малатарню, веялку і інш.; быў ён надта добры пчалавод і меў 90 калод пчол. Меў Ціт тры хаты: у аднэй жыла яго сям‘я, у другой зьмяшчаліся людзі, якія прыяжджалі да яго, а ў трэцяй ён лячыў і замаўляў. Сам Ціт шмат маліўся богу, пабудаваў у Старым Сяле капліцу, але ў царкву не хадзіў; кажуць, што поп у с. Крутам (да прыходу якога належала Старае Сяло) лаяў Ціта ў царкоўных прамовах затое, што ён не хадзіў у царкву і да споведзі і маніўся „даставіць яго эта́пам“. Між тым Ціт меў у сваёй хаце, дзе адбываліся замовы, шмат абразоў. У сваёй гутарцы Ціт любіў ужываць шмат так званых „мацюго́ў“; ён надта баяўся хмар з громам. Як толькі загрыміць гром, то ён падае на калені і, сашчапіўшы рукі моліцца, адначасна страшэнна лаючыся „пама́цярнаму“, а як пройдзе хмара, ён лаецца яшчэ бо́льш і „гаго́ціць“. У прыватным жыцьці Ціт, як кажуць у вёсцы, дзе ён жыў, „ду́жа любіў баб“. Паводле слоў асоб, якія добра ведалі Ціта, ня было ніводнага дня, каб у Ціта ня было ніводнага чалавека з пацыентаў; а ўзімку ў яго начавала кожны дзень чалавек па дзесяць; кажуць, што за год у Ціта бы-

вала ня менш 600 чалавек. Ціт ні да кога ня езьдзіў; усе, у каго была да яго справа, павінны былі прыяжджаць да яго самі. Асабліва шмат да яго прыяжджала сялян за рознымі радамі, у дзень Яна Хрысьціцеля (7 студзеня ст. ст.).

Ціт любіў, каб яго ўпрашвалі, і перш чым „памагчы", ён заўсёды „атнéківаўся", што нічога ня ведае і што нічога ня ўмее. Усіх, што прыяжджалі да Ціта, ён перш частаваў гарбатай з двухвядзёрнага самавару.

Ціт браўся дапамагаць абсолютна ад усіх хвароб, якія толькі маглі ўзьнікнуць у сялянска-мяшчанскім быту як з боку фізычнага, так і з боку духоўнага, а таксама і ў сямейна-інтымных адносінах; дапамагаў ён як людзям, так жывёліне і расьлінам; па словах народу, меў ён вялікую моц ня толькі лячыць і насылаць хваробу, але і зьнімаць „адзéлываць" з людзей і жывёлы нядобрыя замовы другіх знахароў. Бывалі, праўда, выпадкі, калі ён адмаўляўся ад дапамогі, кажучы, што ўжо позна і дапамагчы няма ніякай магчымасьці. Быў такі выпадак: прышоў да яго селянін, які хварэў катарам жывата. Ціт зьняў са сьцяны абраз, паставіў яго на міску з вадой, сам стаў на каленкі і пачаў, нешта шэпчучы, дуць на ваду; праз некаторы час ён адказаў: „Не, я табе ні памагу, і ніхто табе ні паможыць". Трэба адзначыць, што гэтыя словы былі сказаны селяніну, які некалькі скептычна адносіўся да замоў, а таму Ціт, добра ведаючы, што яго замовы зьяўляюцца эксплёатацыяй цёмнага сялянства, а не рэальнай дапамогай, і адмовіўся нібы з прычыны нявылечнасьці хваробы. Хаця некаторыя асобы сьведчаць, што Ціт быў цьвёрда ўпэўнен у тым, што ён дапамагае сваімі лекамі. Якія дзействы злучаў Ціт з замовамі і якія ўжываў замовы—аб гэтым вестак не захавалася, бо ўсе лекі адбываліся ў поўнай таемнасьці ў асобнай хаце, уваход у якую быў забаронен ня толькі прыежджым, але нават і членам яго сям'і. Аднэй дзяўчыне, якая мела нейкую нутраную хваробу, ён даў замоўленую ваду і сказаў, калі ўзыйдзе месяц, стаць проці яго і выпіць „тры сёрбы" (глыткі) гэтай вады, памыць ёю твар і памачыць пад каленкамі—і тады ўсё пройдзе. За дапамогу, раду, замоўленую ваду і г. д. з бліжэйшых сялян Ціт ня браў ніякай платы, але яны павінны былі яму адрабляць; з прыежджых Ціт менш трох рублёў і аднэй бутэлькі гарэлкі ня браў; бедныя плацілі яму па 1 рублі.

Памёр Ціт у 1916 г., маючы 78 год ад роду. Кажуць, што канаючы ён датуль не памёр, пакуль не разабралі столь у тэй хаце, у якой ён ляжаў.

У 70-х гадох мінулага стагодзьдзя ў вёсцы Шалгуны Вязьменскай вол. таго-ж самага павету памёр „шаптýн" Сапрон і, кажуць, што паміраючы Сапрон усе свае веды пера-

даў Ціту. У Вязьменскай вол. у пачатку дзейнасьці Ціта быў вядомы знахар Карнéй. Жыў ён надта заможна, але пасьля пажару зьбяднеў і стаў у якасьці большага пастухá („пáстара“ ці „паўкóўніка“) ганяць у поле жывёліну; пастухом быў каля 15 год; памёр каля 80 год ад роду. На выгляд ён быў суровы, але выдатным розумам не адзначаўся.

Некаторыя знахары спэцыялізаваліся ў галінах паасобных хвароб. Так, вядомы быў знахар „Баравíк“, які жыў у вёсцы Буянава Чэпельскай вол. таго-ж самага павету. Баравік лячыў выключна хваробы нутра. Асобы, якія даведваліся да яго, абавязкова павінны былі прыносіць з сабой гарэлку. Адзін селянін апавядаў, як лячыў яго Баравік: выліў ён прынесеную гарэлку ў міску і запаліў яе; узьняўся сіні агонь; вось Баравік паказвае гэты агонь і кажа: „Агонь сіній, відаць, што паддзéлана“. Пасьля пагасіў агонь, выпіў з міскі гарэлкі, даў некалькі сёрбаў хвораму піць „наташчáк“, а астатнюю гарэлку выліў сабе.

У сяле Крутым Вязьменскай вол. (Вяліск. п.) некалькі замоў і некалькі песень запісана мной са слоў Параскевы Іванавай-Кіраёнак, ці, як завуць яе на вёсцы, „бáбы Просі“; родам яна з вёскі Пярдуноў Бародзенскай в., Парэцкага п. Смаленскай губ. У 1919 годзе ёй было каля 90 год, яна мела ня толькі ўнукаў, але і праўнукаў.

Вышла замуж 19 год за хлапца маладзей сябе і перажыла яго; мела дзесяцера дзяцей, з якіх сем жывуць і да гэтага часу (4 сыны, 3 дачкі).

З рысаў яе характару трэба адзначыць вялікую рэлігійнасьць і страсьць да гарэлкі; верыла яна ў розныя забабоны і, як усе старыя людзі вёскі, з недавер‘ем адносілася да ўсяго, што ішло з гораду; была яна няпісьменна і, апрача Вяліжу, была і ў Смаленску (ад сяла Крутага Смаленск бліжэй, чым Віцебск, а таму сяляне с. Крутага з гандлёвымі мэтамі часта езьдзілі ў Смаленск). Кожная сьвята яна гатавала што-небудзь смачнае (бліны, яешню) і ішла да царквы, а пасьля абедні, усеўшыся з бабамі каля царквы, піла гарэлку. Варочалася дамоў ужо адвечаркам. „Баба Прося“ была вядома, як замоўніца, што „даець ваду“ ад усіх хвароб. Але галоўнай яе спэцыяльнасьцю зьяўляліся замовы „дóньніка“, (uterus) пры родах.

Муж „бабы Просі“, па прозьвішчы вясковым „Мазэнка“, таксама быў знахаром; асабліва, кажуць, ён добра лячыў жывёлу. Ён быў „у дружбé“ з Цітам, аб якім апавядалася раней і ад якога ён напэўна што-небудзь запазычыў. Спэцыяльнасьцю Мазэнкі, апрача лячэньня жывёлы, было выгнаньне „трáсцы“. Вось як ён яе выганяў: прышоў да яго селянін па прозьвішчы „Сказка“, Мазэнка завёў хворага ў

пуню, загадаў яму распрануцца і голаму бегчы ў суседні гай (а справа была халоднай восеньню „у зáмаразкі“); там ён павінен быў знайсьці дзьве асініны, якія расьлі з аднага кораня і пралезьці паміж імі. А дзед „Мазэнка“ ў гэты час нешта шаптаў.

Да 80-х гадоў мінулага стагодзьдзя адносіцца дзейнасьць у Вяліскім павеце такіх „калдуноў“, як „Артамон“—в. Бубуры Чэпельскай вол. і „Мурáшацка“—в. Лісяны Вязьменск. в.

У Віцебскім павеце быў вядом Ларывон Восіпаў (в. Шавелі Вяляшкаўскай вол.); аб ім гаварылі, што да яго сыходзілася так многа людзей, што ён не ўпраўляўся насіць ваду з калодзежу. Ваду для замоў насіў ён сам. За бутэльку замоўленай вады ён браў 20 кап. Адзін селянін жартуючы сказаў яму: „Дорага бярэш 20 кап. з бутэлькі; ці доўга табе прынесьці вады з калóдзіся?“—„Маўчы!“ адказаў знахар: „бацька й дзед мой рабілі гэта, а я за імі“. Гэтаму знахару ў яго працы значна дапамагала яго жонка. У „Ларывона“ былі асобныя дні для прыежджых, напрыклад, дзень Купалы.

У Віцебскім павеце ў в. Сабачонкі (каля м. Калышкі) быў шаптун „Іван Сідараў“, сучасьнік Ціта; ён лячыў так сама, як Ціт, „áта ўсяго“, прычым ня толькі прымаў у сваёй хаце, але і выяжджаў, куды клікалі. Раёнам яго быў Віцебскі павет і сумежныя часткі Смаленскай губэрні. За сваю працу ён браў плату грашыма і палатном. Апавядаюць такі выпадак: варочаючыся з практыкі, заехаў ён у карчму выпіць гарэлкі; а ў яго тут і ўкралі пакунак з рознымі рэчамі — „Ніхай узнаіць, хто ўкраў“. Тры разы гадаў ён на карты і гаварыў, пагражаючы невядомаму злодзею: „Сам прынясець, на сабакі прывязець“. Але злодзей рэчаў яму не зьвярнуў. Такі прыклад характэрны для сялян, якія пачынаюць сумлявацца ў моцы знахароў.

У Полацкім павеце ў пачатку XIX стагодзьдзя ў в. Мошкараца Вазьнясенскай вол. жыў знахар „Чэпялá“, які меў 70-80 год ад роду. Калі я быў дзіцём, у мяне на твары зьявіўся „вогнік“ (herpes); мае бацькі паклікалі Чапялу. Ён прыходзіў да мяне тры разы ў часе заходу сонца, садзіў мяне тварам к печы і, запаліўшы пучок лучыны, нешта шэпчучы, абносіў лучыну навакол маёй галавы. У пакоі, апроча нас, ніхто не павінен быў быць.

Трэба адзначыць і такую рыску знахароў: калі хто адважна, адкрыта выступіць проці іх, то такіх людзей яны баяцца і прымаюць іх за „калдуноў“, думаючы, што яны больш ведаюць, чым яны самі.

У 1917 г. ў дзьвёх вярстах ад г. Полацку быў такі выпадак. У селяніна балелі зубы. Замест таго каб паехаць у Полацак да доктара, ён паехаў да „знахаркі“. Тая, агледзеўшы яго, сказала, што замова ў даным выпадку не дапаможа, а што трэба пусьціць кроў. Крыві вышла шмат; ішла яна і праз нос і праз рот; вынасілі яе, як кажа відавочца, „міскамі“; крыві вышла так многа, што хворы ня толькі забыўся пра зубы, але ня мог крануць ніводным членам і нават чуць не памёр.

Ваду для замоў знахары павінны браць у сутоках, дзе рэчкі зьліваюцца; ваду трэба браць проці цячэньня (Крутое, 1919). У Полацкім павеце існуюць забабоны, што ў купальскую ноч памерлыя „калдуны“ ўстаюць і бягуць мыцца ў возера (Межаві, 1915). Замову можна перадаваць толькі малодшаму па ўзросьце, а калі перадаць яе старэйшаму, то замова ня будзе мець сілы (Крутое, 1918). Замову можна перадаваць мужчыне ці жанчыне, але толькі тым, якія радзіліся першымі ці апошнімі, „сярэднікам“ замоваў перадаваць нельга (Вяліж, 1919).

Каб не баяцца „уроцы“ якога-небудзь невялікага знахара, трэба выняць у мышаняці вочы, зашыць іх у торбачку і насіць на грудзёх (тс.).

Значную*) ролю ў жыцьці селяніна Віцебскага павету адыгрываюць т. званыя „чараўнікі“, „знахары“ і „калдуны“. Пад гэтымі назвамі звычайна разумеюць не асобныя катэгорыі людзей, не асобныя касты знахароў, чарадзеяў і калдуноў, якія розьняцца паміж сабою асобнаю таемнаю сілаю або асобнымі відамі чарадзейства, але адных і тых-жа асоб. Так, чараўніка называюць у той-жа час і знахарам і калдуном. Беларус іх надзяляе адналькаваю таемнаю сілаю, адналькаваю здольнасьцю рабіць уплыў на другіх асоб. А сіла гэта, як думае селянін, надта вялікая. Яны ўсё могуць. Яны могуць сапсаваць хлеб на корані, перашкодзіць усходам, напусьціць на збожжа гніль у скіртах і ў копах, патравіць мышамі збожжа, напусьціць ліхога чалавека, які абярэ да ніткі, папсуе яго скаціну, нашле на яе хваробу, адніме малако, а то і самую скаціну зьвядзе з двара. Але яшчэ мацней выяўляецца гэтая сіла чараўнікоў, знахароў і калдуноў на самых сялянах, з якімі яны могуць усё зрабіць. Напусьціць хваробу, трасцу, ламату ў касьцях, гніль, вочы папсаваць, наслаць кліп на дзяцей, падучку або нават і самую сьмерць. Пры гэтым чараўнікі надта злосны і мсьцівы народ—часта за невялікую крыўду яны насылаюць вельмі моц-

*) Наступныя даныя ўзяты з матар'ялаў, якія сабраны П. Угнявёнкам.

ную кару. А як тут селяніну не пакрыўдзіць чараўніка! Жыве ён у цясноце, у бядоце, зямлі мала. Тамака адзін закосіць, другі заарэ, а тамака сьвіньні город парыюць альбо куры патравяць. Але вось і капейка завялася—багатыром стаў, а бяда яго ўжо падсьцерагае—то пажар здарыцца, то папсуецца што-колечы, то хто захварэе. Скуль усё гэта ліха бярэцца, селянін і сам добра ня ведае. Можа ён пакрыўдзіў ліхога чалавека, мо' яму пазайздросьціў благі чалавек. Ды добра-б яшчэ, каб усе чараўнікі былі вядомы, а то ёсьць паміж іх таемныя—і асьцерагаешся, ды мімаволі і пакрыўдзіш, ня ведаючы, хто ён такі. Праўда, ходзяць пра іншых па вёсцы чуткі, паказваюць на іх пальцамі, як на чараўнікоў, але байкі—ня пэўныя весткі. Аднак, глядзіш—і ў якой-небудзь Марылі Клысіхі пасьля Купалы карова раптам пачне шмат малака даваць. І колькі гэткіх незразумелых падазроных зьявішч бачыць селянін! Але ўсё гэта толькі падазрэньні, а запраўды невядома, скуль бяда бярэцца. Але прыходзіць бяда, і ўся вёска дашукваецца прычын. Успомняць усе сваркі ды нелады, дашукаюцца, хто на каго злосны і пастановяць, што гэта напэўна які Сьцяпан Кіўбаса падстроіў. Ня іначай, як ён, бо яго за патраву сенажаці злаялі і ледзь не набілі. Дар'і ды Мар'і пацьвердзяць і пастановяць зьвярнуцца да чараўніка. Пры гэтым робіцца пастанова нікому нічога не казаць—ні фэльчару, ні „бацюшку"—і зьвяртацца толькі да знахара, бо іначай не „паможа". І вось селянін пачынае хадзіць па чараўнікох. Вядомых чараўнікоў звычайна ўсе ведаюць у цэлай акрузе. Пры гэтым амаль што ў кожнай вёсцы ёсьць чараўнік—ці вялікі, ці малы. Вельмі часта здараецца, што чараўнік з „малою сілаю" здалёк шануецца, як вельмі „моцны" і наадварот—чараўнік з „моцнаю чараўнічаю сілаю" іншы раз здалёк бывае зусім невядомы.

Калдуны, чараўнікі і знахары—гэта звычайна маўклівыя, паважныя людзі, з уладным поглядам, фізычна вельмі дужыя, з вялікай і моцнай сям'ёй, пераважна сынамі. Чараўнікі звычайна маюць шырокія сувязі з гэткімі-ж чараўнікамі ды знахарамі. Людзі яны вельмі небясьпечныя. Яны могуць сваёю таемнаю сілаю сапсуць і чалавека і яго гаспадарку; ці яны могуць набіць чалавека або ўкрасьці каня ці падпаліць будоўлю. У бойцы трэба ўступаць такому чалавеку і біцца з ім можна толькі ў крайняй патрэбе, памятаючы ў той-жа час, што калі ты і набіў яго, дык усё гэта можа на табе-ж адбіцца, бо чараўнік заўсёды можа чымнебудзь адплаціць. Не агледзішся, як каня няма—то ён здохне, то яго ўкрадуць. Усё гэта—помста злога чалавека, знахара.

Жывуць звычайна чараўнікі, калдуны і знахары багата, маюць моцную будоўлю, добры інвэнтар, добрых коняй. Усё

гэта большаю часткаю зьяўляецца вынікам заработку ад іх профэсіі. Вельмі рэдка трапляецца на Віцебшчыне тып знахара-бядака, які жыве ў хатцы на курыных ножках. Яны маюць дрэнную гаспадарку—але такіх чараўнікоў вельмі мала. На вёсцы шмат таемных чараўнікоў, яны нічым ня розьняцца ад людзей сваёй вёскі. Аднак усе ведаюць, што яны „маюць" надзвычайную сілу. „Як дрэўца", могуць яны зламіць чалавека.

Усе калдуны, знахары і чараўнікі ўладаюць дзьвюма здольнасьцямі: яны магуць і шкодзіць і ратаваць у бядзе селяніна. Гэтая якасьць ставіць іх у выключнае становішча сярод іншага насельніцтва вёскі. Ён нібы-та зьяўляецца таемным уладаром селяніна—можа караць і мілаваць яго. Ён зьяўляецца лекарам яго хвароб, вэтэрынарам. Гэтая вера ў здольнасьці чараўніка надта моцная. Вось, напрыклад, трэба каму-небудзь зьвярнуцца да знахара—хвароба здарылася ці іншае ліха натрапілася. Таемна досьвіткам звычайна выяжджае селянін у якую-небудзь суседнюю вёску (да свайго аднавяскавага знахара зьвяртаюцца рэдка). Прыехаўшы да знахара, селянін выкладае яму сваю бяду і просіць даць лекаў ад хваробы. Чараўнік выслухаўшы і агледзеўшы яго, варожыць і ўстанаўляе дыягноз. Варожыць ён звычайна на коўшыку з вадой, які ён раней абводзіць рукой наўкола, не датыкаючыся да самога каўша, мармыча пры гэтым заклінаньні, дуе на ваду і пільна ў яе ўглядаецца; пасьля гэтага ён прымушае глядзець у ваду свайго пацыента, які, зразумела, нічога там ня бачыць, хоць чараўнік яму і паказвае:— „глядзі, унь, унь, бачыш туман..." і г. д. Такім парадкам знахар знаходзіць хваробу і прычыны яе зьяўленьня. Прычыны выказваюцца звычайна агульнага парадку, а пацярпеўшы сам ужо лёгка знаходзіць у іх сваю віну. Знайшоўшы хваробу, калдун тут-жа вырашае, можа ці ня можа ён яе вылячыць, і ў першым выпадку прыступае да лячэньня. Прычынаю хваробы звычайна бывае чараўніцтва другога чараўніка, якое даны чараўнік альбо бярэцца зьнішчыць, альбо адмаўляецца; калі хвароба надта моцная, дык чараўнік вылечыць не бярэцца, але дае лекі на ўсялякі выпадак. Можа дапаможа, а можа і не. Лекамі чараўніка звычайна служыць замоўленая вада, радзей травы. Вада замаўляецца і даецца селяніну звычайна ў ліку некалькіх бутэлек. Пэрыод для вылячэньня вызначаецца вельмі доўгі. Хворы павінен некалькі разоў пабываць у чараўніка. Спосаб ужываньня лекаў абіраецца, звычайна, вельмі цяжкі проста немагчымы для селяніна і такім чынам, калі хвароба не праходзіць, дык селянін сам зьяўляецца ў гэтым вінаватым.

За варажбу і за лекі чараўнік вызначае плату, іншы раз досыць значную, звычайна бярэ ён ад 20 кап. да 1 руб. за бутэльку замоўленай вады; бярэ ён і натурай: маслам, яйкамі, палатном, льном і да т. п. Пры гэтым строга загадвае аб усім гэтым нікому не казаць нават і папу перад сьмерцю.

Наогул, нават відавочныя чараўнікі заўсёды маўчаць аб сваіх кліентах і аб чараўнічых способах вылячэньня. Хвораму ставіцца пэўная ўмова вылячэньня—каб ніхто нічога ня ведаў. Наогул у таямніцу чараўнічых замоў заглянуць вельмі цяжка. Усе ўмовы і абставіны чараўніцтва, варажбы, заклінаньняў—нікому не вядомы і перадаюцца чараўніком свайму заступніку толькі пры сьмерці. Пры жыцьці-ж гэтага перадаваць нельга, бо ёсьць пэўны погляд, што перадаўшы раней,—сам губляеш сілу чараўніцтва. Гэткі аргумэнт зусім задавальняе селяніна і таямніцу чараўніцтва ніхто ня імкнецца разгадваць. Хворы знаходзіць у асобе чараўніка свайго лекара, і калі праз некаторы час лекі не дапамагаюць, хворы, ня губляючы веры ў чараўніка, кажа, што гэты чараўнік не такі „моцны“ і ідзе шукаць „мацнейшага“. Нярэдка бывае, што хворы мучыцца 2-3 гады, аб'езьдзіць усю акругу па 30—40 вёрст і ўрэшце зьвяртаецца за дапамогаю да доктара, які знаходзіць, найчасьцей, у самай застарэлай хронічнай форме якую-небудзь цяжкую хваробу, што вылечыць альбо вельмі цяжка, альбо проста пры ўмовах жыцьця селяніна—немагчыма. Адсюль, зразумела, вынікае недавер'е да дактароў. Вядома, тут мае значэньне і агітацыя знахароў. Так прыблізна стаіць справа ў тых выпадках, калі хвароба бывае цяжкая. У выпадку-ж лёгкай хваробы, звычайна „дапамагаюць“ малыя замовы, якія вядомы амаль што кожнай добрай гаспадыні, як напрыклад ад парэзу, ад зглазу і г. д.

Але бываюць яшчэ выпадкі, праўда вельмі рэдкія, калі селянін зьвяртаецца да знахара, хочучы памсьціцца свайму заклятаму ворагу і праз гэта наклікаць на яго якую-небудзь бяду. Але такія выпадкі вельмі рэдкі і вось чаму:—на вёсцы ў чараўніцтве бачаць вялікі грэх, а ў выпадку помсты яшчэ большы, і такім чынам рэлігійныя погляды перашкаджалі абіраць гэткую помсту нават для сваіх ворагаў.

За апошнія часы імпэрыялістычнай вайны вера сярод сялянства ў чараўнікоў значна пахіснулася. Значная частка вясковага жыхарства была выцягнута з сваіх куткоў на вайну шмат з іх было ранена, лежачы ў шпіталях, пазнаёмілася крыху з мэдыцынаю. Вярнуўшыся дамоў, гэтая частка вёскі ўжо пачала крытычна адносіцца да чараўнікоў, што не магло не зрабіць агульнага ўплыву на веру сялянства ў чараўнікоў.

І вось неспадзявана ў апошнія часы чараўнікі і знахары выявілі свой запраўдны твар,—зрабіліся канакрадамі і злодзеямі. Чараўнікі і раней не карысталіся вялікаю прыхільнасьцю сярод жыхарства, але раней іх баяліся, калі-ж страху ня стала, сяляне пачалі ўчыняць нярэдка вельмі жорсткія расправы над сваімі ранейшымі прыгнятацелямі.

У заключэньне мы затрымаемся на адным выпадку варажбы, які вельмі часта спатыкаўся ў ранейшыя часы:—гэта заломы. Заломы—гэта асобны від замоў збожжа на палёх. Праходзячы тым ці іншым полем, вельмі часта зьвяртаеш увагу на гэткае зьявішча: недалёка ад дарогі, а іншы раз і пасярэдзіне шнуру, бачыш жменю каласоў, салома якіх прыблізна на сярэдзіне сваёй вышыні перакручана, завязана вузлом, каласы паскладаны ў розныя бакі і вельмі пераблытаны. Салома нярэдка бывае перавязана чырвонаю істужкаю, альбо ільнянаю ніткаю, павязанаю ў шмат вузельчыкаў і носіць назву „залому". Апошняга выгляду залом будзе відавочным, але ёсьць яшчэ няпрыметныя, зьлёгка толькі пакручаныя заломы.

Мэта гэтых заломаў—звычайна замова на тую асобу, на чыім шнуры яны зроблены. Пры гэтым залом відавочны робіць звычайна ўплыў на гаспадара шнуру, альбо на яго дзяцей, незалежна ад таго, хто яго сажне, а залом таемны спэцыяльна робіцца для таго, хто будзе жаць гэты шнур і з ім разам таемны залом.

Гэткія заломы вельмі часта спатыкаліся ў вёсцы Месаеды Міхалоўшчынскай вол. Віцебскага павету. Аднаго разу, калі я яшчэ быў малым хлапцом, мала знаёмым з жыцьцём, я сам быў прычынаю наступнага выпадку. Гуляючы па полі, я ўбачыў залом. Я ведаў ужо, што іх нельга чапаць ніякім чынам. Зацікаўлены, як гэта робіцца, я папрабаваў зьлёгка біць шапкай зьверху па аўсе і вельмі хутка я ўбачыў, што атрымалася нешта вельмі падобнае на залом. Я рашыў спрабаваць зрабіць залом самому на суседнім шнуры. Як сказана, так і зроблена. Вось іду я неяк у поле да мацеры, калі яна тамака жала, аж бачу грамаду людзей на суседнім шнуры. Падходжу бліжэй і бачу, што ўсе гуртуюцца каля майго жартаўлівага залому і ўсе клянуць Архіпа Калбана—селяніна нашай вёскі, вядомага чараўніка. Уся грамада наперабой спачувае суседцы, а тая плача, праз сьлёзы кляне Архіпа:—„каб яму ногі пераламала, каб ён сам зламаўся",—успамінае, што яна некалі аблаяла яго, і вось цяпер ён пэўна за гэткае глупства памсьціўся на яе... Я, зразумела, растлумачыў зараз-жа пахаджэньне залому і атрымаў не малую „падзяку" за гэта як ад мацеры, таксама і ад суседкі. Бабы, разыходзячыся, абсыпалі мяне гэткімі рэплікамі:—„Во, кажан, а яшчэ ву-

чыцца, уздумаў заломы заламваць!—Каб табе чорт галаву скруціў—кінуў-бы тады збожжа ламаць!"

Калі гэткая драбніца нагнала столькі пярэпалаху на сялянак, лёгка сабе ўявіць, якое ўражаньне робіць запраўдны залом, заламаны па ўсіх правілах з істужкаю, альбо ніткаю на полі таго чалавека, на каго моцна сярдзіты чараўнік. Такі залом прыносіць заўсёды страшэнны пярэпалах сярод яго семяйства. Доўга плачуць, доўга клянуць чараўніка, іншы раз ідуць да яго з павіннаю і з просьбаю зьняць зарок з залому, альбо з апошнім зьвяртаюцца да другога чараўніка. І бяда, калі ў час не агледзяцца, а возьмуць ды нарокам ці няўмысьля сажнуць залом. Замова гэта абавязкова адаб'ецца. Звычайна пасьля таго як сажнецца залом, чалавека пачынае ламаць, пры гэтым ламата трымаецца доўгі час пасьля жніва, іншы раз, нават некулькі гадоў.

Калі бліжэй прыгледзецца да жыцьця сялян, дык лёгка заўважыць, што сярод іх вельмі распаўсюджаны, разам з другімі хваробамі, асабліва рэўматычныя і падагрычныя прастуднага характару. Прычын для гэтага ў сялянскім жыцьці вельмі многа. Страшэнны холад у хатах, зямляная подлога, адсутнасьць падваліны, нашэньне лапцёў, пры якіх ногі большаю часткаю мокрыя, частыя выбяганьні з хаты на двор узімку босымі,—усё гэта стварае вельмі выгодныя ўмовы для прастудных хвароб. Усе гэтыя ламоты рук і ног, грудзей, колікі ў баку сяляне тлумачаць, як вынікі заломаў, вылячыць якія можа толькі знахар. Сутнасьць лячэньня ў тым, каб зьняць зарок з заломнай замовы, і тады ламота пройдзе.

Адна сялянка апавядала такі выпадак. Неяк у восень пачало ёй крыху ламаць у пальцах; чым далей, тым болей і ўрэшцэ перайшло на ўсе рукі, ногі, пачало балець усё цела. Думала яна, гадала, скуль гэта найшло, і ўспомніла, што 2 гады назад зжала яна на полі залом, які заламіла пэўне яе суседка, бо з-за курэй яны многа сварыліся. Сялянка рашыла зьвярнуцца да чараўніка, які жыў за пяць вёрст у суседняй вёсцы. Раніцай, узяўшы з сабой пявунка і 1 рубель грошай зьявілася яна да чараўніка. Той паваражыў на вадзе і сказаў ёй, што ў сваёй хваробе яна сама вінна, бо многа сварыцца з суседкамі, што ёй быў зроблен залом, і яна яго зжала, што залом моцны, але ён мае надзею яе вылечыць. На першы раз ён даў ёй тры бутэлькі замоўленай вады і парадзіў як яе ўжываць. Яна павінна была ўзяць тры бутэлькі пад правую паху і йсьці дамоў правым бокам дарогі, і каб ніхто яе з правага боку не перагнаў і каб ніхто не разьмінуўся з ёй, яна не павінна была за ўсю дарогу разгаварваць,—магла толькі мычаць. Дома яна павінна была штодня раніцой,

пакуль усе спяць, абмывацца, каб ніхто ня бачыў, гэтай вадой на печы. Аб усім гэтым ніхто не павінен быў ведаць— іначай дапамогі ад вады ня будзе.

Варочаючы назад, баба ўбачыла свайго аднавяскоўца, які ішоў ёй насустрэчу. Баючыся, каб ён не абмінуў яе з забароненага правага боку, баба зьвярнула на поле і пайшла ў бок ад дарогі. Селянін — яе аднавясковец—ішоў шукаць прапаўшага каня; пазнаўшы здаля знаёмую бабу, ён меўся запытацца, ці ня бачыла яна яго каня, і вельмі зьдзівіўся што баба моўчкі ўхіляецца ад спатканьня. Падумаўшы крыху, ён зьвярнуў за бабай. Яна шпарчэй і ён шпарчэй; так зрабіўшы вялікае кола, амаль што бегам, вярнуліся яны ў вёску. Бабе, праўда ўдалася ўцячы, але зьдзіўлены чалавек наказаў усім пра яе, і бабы пачалі плесьці розныя плёткі, нібы яна чараўніца. А з лячэньнем было яшчэ горай. У малай хатцы зьмяшчалася ўся сем'я і няпрыметна абцерціся вадою на печы было вельмі цяжка. Як ні хавалася баба, але ўрэшце ўсё адкрылася: убачылі яе на печы голую з бутэлькаю—муж вылаяў і набіў. Прышлося ўсё расказаць. Кінула бедная баба лячэньне. А хвароба памацняецца. Парашыла ўжо баба з мужам паезьдзіць па чараўнікох. І вось пачаліся яе мытарствы. Усе кажуць адно і тое, усе даюць альбо ваду замоўленую, альбо націраньні. Часта давалі націрацца настойкаю з мухамораў на сьпірытусе. Адбілася баба ад працы, і гаспадарка пачала марнавацца,—то курчанё, то парасё прападзе. Час ідзе, а хвароба не праходзіць. Нарэшце парадзілі зьвярнуцца да Вавілы, які жыў у Вайхомскай воласьці. Вавіла, кажуць усё ведае; ён адзін толькі можа дапамагчы. Узрадавалася баба,—сабралася ў дарогу. Доўга ехалі,—за цэлых 75 вёрст; два разы затрымліваліся на ноч у падарожных вёсках. Усім апавядалі пра сваю бяду, і ўсе хвалілі Вавілу і радзілі да яго ехаць.

Нарэшце прыехалі яны да Вавілы—вядомага знахара на вялікую акругу. Жыў ён здаля ад вёскі ў старой быўшай карчме. Мясцовасьць была вельмі прыгожая: хата на ўзгорку, на беразе возера, навокал дома старыя таполі і бярозы. Пад'ехаўшы да двара Вавілы, яны знайшлі браму зачыненай; на іх стук вышаў нейкі мужчына і павёў іх у хату. Двор быў паўнюткі вазамі, коньмі і людзьмі. Мужыкі, бабы з дзяцьмі і без дзяцей; таксама многа народу было і ў хаце. На стале стаяла гарэлка, а ў куце пад абразамі сядзеў сам Вавіла; высокі, тоўсты, увесь сівы чалавек з чырвоным тоўстым носам. Вавіла запрасіў нанова прыбылых да стала, пачаставаў іх гарэлкай. Варажыў ён то на дварэ, то ў хаце. Атрымаўшы замоўленую ваду, кліенты дзякавалі чараўніка грашыма, ці натураю і выяжджалі. Нашую сялянку з мужам Вавіла аста-

віў начаваць, сказаўшы, што дасьць ім ваду ў ночы, як запяюць пеўні.

Ноччу Вавіла вышаў з ёю на гарод. Месяц сьвяціў надта ярка. Вавіла зрабіў круг навакол бабы, узяў коўш з вадой і пачаў гаварыць заклінаньні, у якіх вельмі часта памінаў „дунай, сіняе мора"—тры разы дуў на ваду, пляваў у бок і выў павоўчаму. На гэтым варажба скончылася. Вавіла даў бабе замоўленай вады, але сказаў, што гэта залом, і вылячыць нельга.

Варажбе яго навучыў адзін салдат у часе турэцкага паходу на Дунаі (1877-78 г.). Раніцай баба з мужам выехала дамоў. Дома яна выпіла ўсю ваду, але хвароба не прайшла і, страціўшы канчаткова надзею, яна кінула лячыцца. Выпадкова потым ёй давялося быць у вайсковага доктара і той, агледзеўшы яе, знайшоў падагру. (Месаеды, 1922 г.).

III.

Тэксты замоў.

Замовы „дóньніка“ [1]) (uterus).

№ 1.

Да ні я-ж бабка—працистая матка...

Госпаді благаславі (3 разы), дóньніцик-залатніцок, станьжа на месьці, як сокал на гнезьді, як цібé татка сытвариў, як цібе матка раділа, принёмная бабка принімала і на места пысаділа і цьвецікам абсаділа, кыра(я)шок прыживіла, як цібе хрёсная матка пат хрёст насіла, хрёсный бацька ў хряшчоную веру ўвадзіў і на места пысадіў. Табе, доньніцку-зылатніцкý, ў рабе бóжжим (імя жанчыны) па беламу целу не хадзіць і белага цела ні сушиць і касьсéй ні ламіць і цьвецікым ні цьвіцéць! Дóньніцик-зылатніцок, прашу-ж я цібе, малю-ж я цібе, стань-жы на мéсьці, як сокыл на гнезьді сьвята ні нарушима!

Нівы [2]), 1920.

Карскій, Б. III, 1 67. *Романовъ*, Б. С., V, сс. 53—64, 160.

№ 2.

Дòньнік, дóньнік, доньніцóк—залатый залатніцок, стань лі пýпа—быць табе тýта. Рабу божию (імя жанчыны), не круши. Амін, амін.

Дзейкаўшчына, 1918.

Замова „ат залатнікà“ (uterus).

№ 3.

Залатнік, залатнік! ні хаді па (імя) цéлу, ні крушы, ні ламі яго косьці, ні круці, ні муці яго маладóсьці. Амін, амін, Амін.

Экімань, запіс Чэркасава, 1921.

---

[1]) Гл. замовы ад доньніка і залатніка ў *А. Ветухова;* Р. Ф. В. т. LVIII, с. 82—96.

[2]) У запісах з Вяліскага павету не адзначана дзеканьне з прычыны таго, што сычачы прыгук пры *д* зьяўляецца тут вельмі слабым.

Замова „ат крыві“.

№ 4.

Ішоў Спасіцяль на Ірда́н і Іван за йі́м ішоў; хрисьсі́ў Спасіцяль Івана, а Йван—Спасіцяля; як астанавілася вада ў Ірдані, так і астанавіся кроў у гэтай рані.

Крутое, 1918.

Шейнъ, М., II, с. 539 № 29.

„Крывяныі“ замовы „ат крыві“ і „ат парэзу“.

№ 5.

Вадзіца травіца па мору хадзіла, пясочык сеяла, пясочык не ўзайшоў—крыві не пусьціў. Камар укусіў—крыві ні пусьціў, муха укусіла—крыві не пусьціла.

Сураскі п., 1913.

№ 6.

Госпадзі, Божа благаславі, я спаць кладуся—богу малю ся, устану пірахрашчуся і благаслаўлю́ся; пайду я ва цы́стая по́ля, стану я на сырую зямлю, ва сіняя, ва змо́рья, стану я на сырую зямлю—пагляжу́ я пад вастоцную зарю̀; с-пыд вастòчнай зари лецяць три вараны—родныі браты; нясуць яны дванацаць клюцо́ў і дванацаць замкоў; і замыкалі яны, і запіралі яны во́ды і рєкі, і мо́ри, і руццы, і руднікі́; замкнулі яны, запёрлі яны рабі́ божьяга (імя); как сь сіняга неба дажжа́ ні ка̀ніць, так з раба божьяга (імя) крывì ні каніць.

Лубок, 1919.

Каб спыніць кроў, гэтую замову трэба пераказаць тры разы. Перавесьці дух можна толькі пасьля кожнага разу, як замова перакажацца цалкам.

№ 7.

Вецір веіць—
Пясок сеіць;
Пясок ня ўзойдзіць—
Кроў ня пойдзіць.

Каб спыніць кроў, трэба пераказаць яе 9 раз, не пераводзячы духу. Інакш замова ня будзе мець моцы. Гэтай замовай забаўляюцца дзеці. Запісана яна мной са слоў дзяўчынкі ў в. Арлова, Струнскай вол., Полацкага павету ў 1914 г.; такую самую замову я чуў ад дзяцей сяла Крутага, Вяліскага павету ў 1918 г.

№ 8.

Ішоў Хрыстос праз Ярда́нь—рака́ стала, і ты кроў стань.

Замову трэба пераказаць 3 разы, „ня дыхаўшы". Замова ўжываецца па ўсёй Віцебшчыне.

Полацак, 1921.

Шейнъ, М., II, с. 539 № 29. *Романовъ*, V, на с. 69 § 94.

Замова „ат ро́жы" (erisypelas).

№ 9.

Ішоў Хрыстос па по́лю, нёс тры розы: адна акамяне́ла, другая адярвяне́ла, трэцьця зьгіне́ла, зьгінь і ты боль, нячыстая ро́жа.

Замаўляць трэба раніцай, адвечаркам і раніцай у наступы дзень. Кожны раз замову чытаць трэба па тры разы. Ужываецца па ўсёй Віцебшчыне.

Полацак, 1921.

Романовъ, Б. С., V, на с. 94 § 224.

№ 10.

Ішоў сам гаспо́д бох па полю і нёс ружу ў падо́лі Божжа маць піраймала і рожу пагінала. Амін, амін, амін.

Замову трэба пераказаць 3 разы не пераводзячы дух над хворым месцам ці над вадой, якой яно абмываецца.

Экімань, запіс А. Чэркасава, 1921.

№ 11.

Рожа ты рожа, ты ні на каго ні пахожа і нікуды ты ня гожа; ёсь у нас тры сьвідзецялі: сам гаспо́дь бог і прысьвятая багародзіца. Толькі ўзяць цябе ды ў моры утапіць і нікуды ні пусьціць. Амін, амін, амін.

Ужываецца, як папярэдняя.

(там сама)

Замовы „ат укуса зьмяі".

№ 12.

Зьмія гад, вазьмі свой яд! а то я вазьму тры кіі зялезных, тры кіі мідзяных, тры кіі дзіравяных і выб'ю ўсё тваё царства і пакаленьня. Амін, амін, амін.

Пераказваецца 12 раз над хворым месцам ці над вадой, якая даецца для абмываньня.

Шейнъ, М., II, на с. 547 № 49.

(там сама)

№ 13.

А зьмія, зьмяйíца—скарлупíца! ат цаго ты, зьмія, зараділася: ці 'т лун, ці зьвéзд, ці яснага месяца, ці ат красную сóлнушкі? Зараділася я зьмія ня-т-лýн, ня—т—зьвéзд, ні ат яснага месяца, ні ат красную солнушкі—зараділась я зьмія с-пад ракітага куста, с-пад кацістага кáмня. Арéхаў куст вон—зь мяне дух вон.

Лубок, 1919.

Добровольскій, С. С., I, на с. 180 № 1, на с. 184 № 5 і далей.

Замовы „ат зубóў".

№ 14.

Стар месяц на небі, млад юнаш на зéмлі. У бога вубувалі—многа старикоў відáлі і ў іх пыталі: „Ці балéюць у мірцьвіцà зубы?"—„Не!"—Пусь і рабі божьяга (імя) зубам ні балéць, карэньням ні знудзèць. Амін, амін, амін!

(там сама)

Шейнъ, М.. II, на с. 541 № 35, *Романовъ,* Б. С., V, на с. 80 § 158; на с. 82 § 164, 165, 166; с. 164. *Добровольскій,* С. С., I, с. 195, 197.

№ 15.

Здрáствуйця вам, кóні—начхáньня, нафарсèньня, а зубам на добрая здароўя, як у вас коні кóпы ні баляць—так у раба божыя (імя) зубы і дýпла ні баляць. Амін.

Полацак, 1921.

№ 16.

А ты, месяц малады, табе вянок малады. Дай бох табе на пастаяньня, а майím зубам на добрая здароўя.

Межава, 1921.

Замова „ат грысі" (gostro-eutoritis acuta).

№ 17.

Госпаді божа благаславі! грись касьціная, мазгавая—я цябе загавариваю. Выході з ног і с касьцéй, і з суставаў, і з жил, і с пáжилак, і белага цела і буйный галавы, і хрэбéтней касьцí, ат младенца (імя) грись, я хацý цябе зьéсь. Я сягóньні ні абéдала і уцóра ня вяцóрила—я цябé зьéм, згавóрам ні загаваруý—зубамí закушу.

Лубок, 1919.

Замова „ат кругóў" (lichen).

№ 18.

Як гэтаму дрэву на крэні ні стаяць, сырога карэньню ў зéмлю не пушчáць, вéцьцям ні махаць, лістам ні шумèць, белагу сьвету ні відаць—так гэтаму кругý век—векам ні бы-

ваць. На цом усхапіўся ці на едяньні, ці на піцарні, ці на ра́дасьсі, ці на за́вісьсі—ўстрэтным, пупярэцным—аткаціся, атвалíся цíхо́нька, ляго́нька ат кагцéй, ат нагцей, ат жил, ат па́жил, ат буйнай галавы, ат белага лíца, ат ясных вачэй цíхо́нька, ляго̀нька—ці на маладíкý, ці на вятахý, ці на кроме месяца. Раба̀ божия (імя) не суши, не круши па мой прихо́д, па мой пригавор. Амíн, амін.

Дзейкаўшчына, 1918.

Замовы „ат скул“. (furunculus, carbunculus).

№ 19а.

Скула́ во́сыдная, скула во́клітная, скула ра́дасная, скула за́вісная! Я цябе ума́ліваю, цябе упрашиваю—аткаці́сь, атвяжись ат кагцéй, ат нагцéй, ат жил, ат па́жил, ат ясных вачéй, ат буйнай галавы, ат белых рук, ат быстрих ног; на чим усхапілась, на тым і паляж, раба̀ божия (імя) ні суши, ні круши. Амін, амін, амін.

(там сама)

№ 19б.

Сам гасподь Ісус Христос! Выганяю я ету скулу, на мхі, на балоты, на сухéй лес; там вам красаваньня, там вам лікаваньня. На чим жа ты схапілыся: ці на радасьсі, ці на піцяньні, ці на йідзяньні? На чим жа ты схапілыся на тым і пірастань. Дарагіі радзіцілкі, еслі ні ваш—ні сушиця: Даю вам пшаніцку на куцейку.

Пацыент у час замовы павінен сядзець на куце, замоўнік перш моліцца богу, а потым пад словы замовы тры разы абсыпае галаву аўсом, кожны раз здуваючы яго з галавы.

(там сама)

Замовы „ат лішаёў“ (lichen).

№ 20.

Лішà́ю, лішá́ю, я цябе рэшà́ю—
Я цябе рэшаю, як сьві́ньням мяшá́ю.

Кажучы гэтыя словы—трэба вадзіць мязінцам, якім узяць перад гэтым „пòту“ з вакна, па лішаю „про́ці сонца“, пры апошніх словах—на лішаю трэба зрабіць пальцам крыж. Пасьля чаго такім самым парадкам і з тымі-ж словамі гэта робіцца на сукý ў сьцяне. Так робіцца 3 разы пры ўсходзе і заходзе сонейка.

Віцебск, 1922.

Романовъ, Б. С., V, на с. 95 § 229.

№ 21.

Дзень дòбры, лішàю, я цябе нi знаю.

Ужыванье яго такое самае, якi i папярэдняй замовы. Адвечаркам гаворыцца: „Вèчар добры, лішаю!“ i т. д.

(там сама)

Замова „ат удара“ (contusia).

№ 22.

Ехаў сам гасподзь бог зь неба на зèмлю на вароным кані. Атнімí ушыб ат (імя).

Экімань, запіс Чэркасава, 1921.

Романовъ, Б. С., V, на с. 72 § 111.

Замова „ат вызіху“.

№ 23.

Уўвіх, уўвіх, ня буць ты лiх! Прачыста маць, пасоб уўвіх уняць. Бех конь выраный па полю, конь упаў i ўвіх прапаў.

Таўсьцюкі, запіс К. Канапельскі, 1923.

Шейнъ, М., II, на с. 538 № 26, 27.

Замова „ат вóгніка“ (herpes).

№ 24.

Вада з вадой, агонь з агнём, камінь з камням, вецір зь ветрам, а ты, вогнік, ідзí проч! Амін.

Замова пераказваецца тры разы, не пераводзючы дух. Далей бярэцца міска з вадой i тры пары вугалёў. Першай парай вугалёў абводзіцца хворае месца, прычым чытаецца замова, пасьля чаго вуглі кідаюцца ў міску з вадой. У такім парадку другая i трэцяя пара вугалёў. Калі вугалі выйдуць, то міска разам з імі выкідваецца вон.

Экімань, запіс Чэркасава, 1921.

Замова „проці йíкаўкі“ ці „ат ікòты“ (singultus).

№ 25.

Ехала ікóта (вар.: ехала йíкаўка) кылà балота на сівай кабылі; кабыла ўпала—ікота прапала

Вяліж, 1919; Полацк 1921.

Замова „ат упуду“.

№ 26.

Вадзіца чыстая зарыцка, як убмываяш вадзіцка, крутыі берашкі, жоўтыя пяскі, шэрыя карэньні, белыя каменьні—абмый раба божыя (імя).

Трэба з ракі наліваць у вядро ваду па 9 лыжак 3 разы. Потым, перахрысьціўшыся, чытаць над вадой (што ў вядрэ) замову. Чытаць трэба ў тры прыёмы, прычым кожны раз па тры разы (бязумоўна, не пераводзячы дух). Замоўленую ваду даваць піць і ёю абмываць твар і грудзі тры разы перад усходам і заходам сонейка.

Полацак, 1921.

Замова „проці зглазу".

№ 27.

Царыца вадзіца, красная дзявіца, марская крыница, божжа памачніца, і угодніца Ульяніца, і румяніца, рака вялікая. Коціcься ты, вадзіца, па дням, пы начам, а вячэрнім зарам, ідзеш з пад крутых гор, з пад красных зор, з пад жаркага сонца, з пад ясныга месяцу, з пад латыра камню тонкім жылам, марскім сілам. Падмывайіш ты крутыі бірагі, жоўтыі пяскі, калоды валяныі, траву шаўковую; вымывайіш сыроя карэньня, белая каменьня; абмувайіш камішкі дробныі, краменьня чорная і жалезьзя марскоя цяжкоя. Ачышчайіш цароў, каралёў і увесь народ хрысьціянській, абмыў і сцалі рабу гэту нядужную ад першага вока аднавокыга, і ад карага, і ат ярага, і ат белыга і ад шэрыга, ад стрэчныга, ад пупярэчныга, ад падзіўныга і пасьмéшныга, ат падумныга і паглядныга, ад прыгаворныга і набродныга, ат галосныга, і ат злосныга, ат завіснага, і ад радысныга, ад вадзянага, і сухавейныга, і скразіцельныга, і зкрозьплотныга, і сьветавога, і агнявога, і гаравога, і палявога; ці схода, ці маладзіка, ці пад поўная; ат часіны, ат хвіліны, і дзенныга, і ночныга, і раньніга, і вячэрніга, і паўночныга, і паўдзённыга, і радзімыга, і насыланыга, і падымнога, і сьвітавога, і калючыга, і балючыга, і ламучыга, і гаручыга; ці панскыга, ці цыганскыга, ці дзякоўскыга, ці жыдоўскыга, ці мужчынскыга пыд вянцом, ці жаноцкыга пыд чапцом, ці хлапецкыга пад шапычкай, ці дзявоцкыга пад завіткай, ці ўдовіна, ці ўдаўцова, ці дзядова, ці бабіна, ці бацькіна, ці маткіна, ці братава, ці сястрына, ці рыбячыга, ці сабачыга, ці дзядзькіна, ці цёткіна, ці ат старых старыкоў, ат старых старушак, ат ведзьмінскіх і чараўніцкіх і таго біззаконныга ўдовіна навараджэнца, які два разы маць сасéць; і на чым бы яны ні былі: на піцяньні, ці на ядзяньні, на гуляньні-красаваньні, ці на мякькім спачываньні.

Вадзіца царыца, зямная і нябесная! Зара вячэрняя, зара вутраньняя, сонца красная, месячык правядный, зорачкі частыя, панядзелачык сьвятый, сьвятачкі сьвятыя,

праздначкі гадавыя! Станьця гаспадухначкі на помач, сьвятыя анёлы на радась, памажыця мне зглаз—урокі загаварыць! І выхадзіця вы, зглаз—урокі, з раба гэтага нядужныга, з бўйнай гылавы, з жоўтага мора, з белага ліца, з ясных вачэй, з чорных бравей, з слухавых вушэй, з баявых наздрэй, з рацівага сэрца, з сільныга жывата, з чорнай печані, з белыга лёгкыга, з гарачай крыві, з пальчыкыў, з сустаўчыкыў, з русых кос, з трыдзевяць касьсей, з трыдзевяць жыл, з трыдзевяць пажылак, з ногцікаў, з локцікаў, з белых рук, з хрэбетнай косьці, з гаручых сьлёз. Ідзеця вы, зглаз—урокі, на імхі, на балоты, на топкіі аржаваньня, на ніцыі лозы, на гнілыі калоды, на сухіі лясы, на жоўтыі пяскі, на буйныі вятры, на неадчыняныі дзьверы, на ніхрашчоную зямлю, дзе сонца ня грэіць, дзе вятры ня веюць, дзе пеўні ні сьпяваюць, і гусі ні крычаць, і сабакі ня брэшуць, і птушкі ні пяюць, і зьвярро ня бегаіць, і людзі ня ходзюць. Там вам курганы—пагуляны, там на белым камні стыяць сталы цясовыі, што на тых стылах абрусы белыі, на тых белых абрусах кубкі вінныі, там стыяць ложкі цясовыі, на тых ложкых пярыны пуховыі; там у шэрых барох, у цёмных лясох ёсьць прыгожая сенажаць, сярот той распрыгожай сенажаці стаіць кустъ, ракітавый, пад кустом ракітавым сядзіць паненка—пірагі пякець і вас да сябе ў госьці клічыць, і піва наварыла і мёду насыціла.

Там вам гуляньня-красаваньня, там вам апачываньня, там вам гуляць, вінныя кубкі выпіваць, на цясовых ложкых атдыхаць, там вам быць, там вам жыць, там і раскашыванца. Тут жа вам ні хадзіць, касьсей ні ламаць, шчырага сэрца ні знабіць, цела ні пушыць, ні калоць, ні пароць, ні гарэць, ні балець. Чур табе!

Вазьмі ты, вецір ціхій, вятровая ліха; дзе ты гуляў, дзе ты буяў, дзе ты рабу гэту балезную сустракаў, што ты ей даў, каб узат атабраў.

Правялікій пан дамавый! Правялікій пан, лясавый—бязыменьшчык! Правялікій пан, баравый—Сьцяпан! Правялікій пан, палявый—Антон! Правялікій пан, лугавый—Хвядос! Правялікая паня маці, маланьня-бліскуха! Прасіця вы свайіх сыноў, дванацаць ціхіх вятроў, якій нам шкоду зробіў, атабраць вятровая ліха.

Чурайся, ліха, атракайся ат раба гэтыга і ідзі вятровая на вецір, зямноя на зямлю, вадзяноя ў ваду, агнявоя ў вагонь. Амін!

Забулдычына, 1914.

Замова, каб палюбіла дзяўчына.

№ 28.

Узяўшы ў руку яблык, ігрушу ці якую іншую садовіну і вышаўшы да сонейка раніцай ці адвечаркам у „маладзікову“ сераду, трэба гледзячы на садовіну казаць:

На востраве на Сакалоні стаіць дуб, а на тым дубу дванацаць кокатаў, а пат тым дубам дванацаць галубоў. —„Прашу я вас і упрашываю; на сінім моры ляжыць камінь, пат тым камянём ляжыць дашка, а пат тэй дашкой ляжыць мая таска. Вазьміця тэй камінь, падніміця гэту дашку і выньця аттуль маю таску і атдайця яе (Варутункі).

Нагавораную такім парадкам садовіну трэба перадаць дзяўчыне.

Забулдычына, 1914.

„Выпісі ўсякай жыўнасьці ат шáлу“ [1]) (Lyssa).

№ 29.

Ніжэй пададзенае трэба напісаць па адным слове на скарынцы хлеба (усяго 11 кавалкаў):

А
Аб
Абр
Абра
Абрак
Абрада
Абрадак
Абрадака
Абрадакаб
Абрадакабр
Абрадакабра

Кожны напісаны кавалак трэба разрэзаць на тры часткі, пасьля чаго, зьмяшаўшы іх паміж сабой, даваць асобе, якую пакусала шалёная сабака, па тры кавалкі тры разы ў дзень.

Нівы, запіс Карпава, 1919.

№ 30.

Іріон+Ліріон+Кіріон+Сталедон+Стрaктаре+Какаре+Ідота+Стрідота+Сім+Брім+Эт+Деус+Меус+++

Словы гэтыя пішуцца на паперы ці скарынцы хлеба алоўкам ці атрамантам. Папера ў хлебе даецца хвораму.

Себеж. п., запіс М. В. Мялешкі, 1919.

---

[1]) Гл. падобныя замовы ў *Шэйна*, М., II, на с. 551 № 58.

Перетцъ, Матеріалы къ исторіи апокрифа и легенды, II. Спб. 1901, с. 111. *А. Ветуховъ*, Рус. Филолог, В., т. LVIII, с. 118—120.

№ 31.

	c		o		m		o		p	
	o		p		e		h		o	
	m		e		н		e		m	
	o		h		e		p		o	
	p		o		m		o		c	

Скарынка хлеба з напісанай на ёй табліцай даецца асобе, ці жывёліне, якія пакусаны шалёным сабакай. Каб дапамагло, трэба даваць у працягу першых двух тыдняў з дня ўкушэньня, калі пазьней—то не дапаможа. Перш чым ужываць скарынку трэба прачытаць напісанае на ёй: раз зьверху ўніз і раз зьлева направа. Замова сьпісана ад беларусаў, але апошнім яна дасталася ад „стараверaў“ ці „маскалёў“, якія жывуць каля Вяліжу і якіх наогул шмат на Віцебшчыне.

Жукоўшчына, 1919.

№ 32.

Írion×Lirion×kirion×Cáreon,×Cafarón×Stralidón×Stractári×Ícactári×Ímbrum×Et×Deus×meus×××

Гэта цалкам пішацца (абавязкова атрамантам) на 9 даўгіх паперках-істужках. Потым кожная паперка падзяляецца на 3 лісткі і ўсе яны скатваюцца ў тры кулі; кожная куля спальваецца на ісподку і зьядаецца з хлебам. Даваць трэба 3 разы: 1-ы раз перад самым усходам сонейка, 2-і раз перад самым захадам і 3-і раз зноў перад усходам. Прыймаць іх ні ў якім разе нельга ў час „маладніка“. Надпіс гэты можна зрабіць на 9 скарынках хлеба, але тады ён ня паліцца, як папера.

Полацак, 1921.

Замова „ат ліхарадкі“ (malaria).

№ 33.



Замову гэтую напісаць (абавязкова атрамантам) на 9 лісткох паказанай формы і ў паказаным парадку. Усе 9 лісткоў з аднакімі надпісамі прыкалваюцца шарсьцянай „ня сучбнай“ ніткай і вешаюцца на шыю хвораму. Хворы сам павінен ад-

дзіраць па тры лісткі, спальваць і есьці з хлебам—раніцай перад усходам сонейка, вечарам перад заходам і зноў перад усходам. У апошні раз адначасна з паперкамі трэба зьесьці і нітку.

Полацак, 1921.

№ 34.

Закляцьце схаваным грошам.

Хто на жывой зьмяі прыедзіць—
Той гэты грошы возьміць.

Полацак, 1919.

КАЛЯДНЫЯ ПЕСЬНІ

КАЗАНСКАЯ ЕПАРХІЯ

I.

Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне калядных песень і звычаяў.

Калядныя песьні, якія маюцца ў друку (і песьні майго збору) разьмяркоўваюцца так:

Аршанскі п.: Мошкава—2 (Шейнъ, М., I, 1).

Віцебскі п.: Белая Дуброва—1 (Шлюбскі), Таўсьцюкі—1 (тс), Шчэрбінская воласьць—2 (Романовъ, Б. С., VIII).

Вяліскі п.: Будніца—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Вяліж—4 (Шлюбскі), Лубок—1 (тс).

Гарадоцкі п.: Уладзіміраўская вол.—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Хвошно—1 (тс).

Дзісьненскі п.; без азначэньня валасьцей і вёсак—7 (Дмитріевъ, С. П.)—1 (Шейн, Б. П.), Заулкі—22 (Романовъ, Б. С., VIII).

Лепельскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—6 (Шейнъ, Б. П.),—1 (Романов, Б. С., VIII). Апанаскавічы—1 (Шейнъ, Б. П.), Бабч—4 (Шейн, М., I. 1), Косаўшчына—3 (Шлюбскі), Несіна—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Цяпінская воласьць—3 (Шейнъ, Б. П.), Ушы—1 (Шейн, М., I, 1), Чашнікі—5 (Шейнъ, Б. П.).

Невельскі п.: г. Невель—14 (Шейнъ, Б. П.).

Парэцкі п.: Іньковa—7 (Добровольскій, С. С., IV). гл.: Святки въ Порѣчском уѣздѣ (Смоленскій Вѣстникъ, 1893, № 3), Васильевская коляда въ Порѣчскомъ уѣздѣ (тс., 1893 № 9).

Полацкі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Романовъ, Б. С., VIII). Махірова—5 (Шейнъ, М., I, 1), Арлоўка—1 (Шлюбскі), Гарбаценкі—1 (тс), Забулдычына—5 (тс).

Себескі п.: па паштовым шляху з Себежа ў Люцын—3 (Анимелле, Б. Б. К.).

Сеньнескі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—1 (Романовъ, Б. С., II), В.-Гарадзец—2 (тс), Плоскае—3 (Шлюбскі).

Некаторыя матар'ялы па апісаньні беларускіх калядных звычаяў запісаны ў такіх мясцовасьцях:

Віцебская губ. (Романовъ, Б. С., VIII).

Віцебскі п.: без азначэньня воласьці і вёскі (Романовъ, Б. С., VIII), Бабінічы (Шлюбскі), Веляшковічы (Шейн, Б. П.).

Гарадоцкі п.: без азначэньня воласьці і вёскі (Шлюбскі).

Дзісьненскі п.: без азначэньня воласьці і вёскі (Дмитриевъ, С. П.).

Дрысенскі п.: без азначэньня воласьці і вёсак (Шейнъ, Б. П.).

Лепельскі п.: без азначэньня воласьці і вёсак (Шлюбскі).

Полацкі п.: Амельчанкі (Шлюбскі), Забулдычына (тс), Межава (тс), Махірова (Шейнъ, М., I, 1).

Себескі п.: па паштовым шляху з Себежа ў Люцын (Анимелле, Б. Б. К.).

Сеньненскі п.: Плоскае (Шлюбскі).

Сураскі п.: Кашавічы (Шлюбскі).

Агульныя нарысы аб калядных звычаях Віцебшчыны мне вядомы такія: *А. П-ко* (Пщелко), Новый годъ въ деревнѣ (Витебскія губ. вед., 1903, № 1). *П. М-ичъ*, Рождество у бѣлоруссовъ католиковъ (тс, 1904, № 298).

Некаторыя матар'ялы аб калядных звычаях Віцебскага, Дрысенскага і Полацкага паветаў знаходзім у працы Нікіфароўскага: „Простонародныя примѣты и повѣрья"...

Беларуская каляда і калядныя звычаі падрабязгова разглядаюцца акад. Карскім у яго досьледзе „Бѣлорусы", III, 1, сс. 97—137 у разьдзеле:—„Колядскіе обряды и пѣсни".

II.

Калядныя звычаі.

„Першую каляду“ трэба праводзіць ня еўшы да „першай зоркі“, пакуль на небе ня зьявіцца зорка (Межава, 1913); на стол, на якім вячэраюць, пад абрус кладзецца сена, у знак таго, што Хрыстос радзіўся ў сене (Забулдычына, 1915); некаторыя сяляне для большай урачыстасьці, заместа лямпы ці лучыны, запальвалі на каляду сьвечкі ўласнага вырабу (Плоскае, 1915); у час вячэры запрашаецца мароз:—„хадзі, мароз, куцьцю̀ есьць цяпер, а ўлетку ні бывай“ (Бабінічы, запіс А. Клімянкова, 1915). Гарэлка, купленая для ўжываньня на каляду, павінна быць куплена за грошы альбо пазычына, але ні ў якім разе ня ўзята ў абмен на збожжа; калі гарэлку атрымаць за збожжа—то яно ня ўродзіцца (Амельчынкі, запіс В. Мухіна, 1920). Хто пасьля „куцьці“ нап‘ецца вады, „таго ў прыпарніцу дужа будзіць палíць“ (тс.). У першы дзень „Раштва“ гаспадар ловіць пузыры ў кіпятку і палівае імі авёс, які „досьвіта“ дае коням, каб яны былі такія-ж гладкія, як і пузыры, і каб так-жа сама шпарка бегалі. (Гарадок. п., запіс В. Кузьміной, 1921). Выпускаючы ў першы дзень „Раштвá“ сьвіней з хлева, а таксама на Новы Год і на „Кшчэньня“, трэба кідаць ім у вочы сьнег, каб яны ўлетку ня бачылі „шкоды“ (Амельчынкі, запіс Мухіна, 1920). Калі хто не нарыхтаваў к сьвяту дроў і прымушаны сячы іх у часе сьвятаў, то ён разьвядзе ў сваёй гаспадарцы столькі мышэй, колькі разоў махне сякераю (тс). Калі на першую каляду будзе шмат сьнегу, то год будзе ўраджайны (Межава, 1913). А дзяўчыны, каб узнаць жаніха на каляду замыкаюць калодзеж; той, хто прыдзе да дзяўчыны за ключом, і будзе яе жаніхом (Кашавічы, 1919).

Па ўсёй Віцебшчыне на першы дзень „Раштва“ хадзілі з батлейкай; апошнія батлеечныя прадстаўленьні даваліся ў канцы XIX ст. Апрача тэрміну „батлейка“ (Леп. п.) істнавалі сынонімы: „жлоб“ (Вяліскі і Віцебскі п. п.), „вяртеп“ (Пол. п.). Ня толькі „хадзіла батлейка“, „хадзіла зьвізда“ і „хадзілі рàжэньні“; апошнія са сьпяваньнем песень, скокамі, прадстаўленьнямі—іх частавалі, а таксама і плацілі ім. У Полацкім і Лепельскім паветах вядома і „жаніцьба Цярэшкі“.

На ўвесь Вяліскі павет былі дзьве батлейкі. Яны зьяўляліся ўласнасьцю цэркваў. З першага дня „Раштва“ з імхадзілі 2 тыдні; браць іх мог кожны жадаючы, але ўсе прыбыткі з прадстаўленьняў павінны былі ісьці ў царкву, уласьнасьцю якой зьяўлялася батлейка.

К новаму году дзень прыбаўляецца „на верабыны крок“ (Межава, 1919); добрая пагода на Новы Год сьведчыць аб добрым ураджаі льну; а пры „пераменнай“ пагодзе, калі сонца сьвеціць зраньня, то добры лён будзе раньні, а калі сонца сьвеціць на адвечарку, то добры лён будзе позьні (Амельчынкі, запіс Мухіна, 1920). Сьнег на храшчэньне сьведчыць аб добрым ураджаі на грыбы (тс).

У сучасны момант старадаўнія звычаі сьвяткаваньня Коляд не выпаўняюцца, а толькі ўспамінаюцца старымі. У Сураскім павеце Коляды, напрыклад, адбываюцца так: перад наступленьнем сьвятаў вясковыя музыкі наймаюць вялікую хату на два тыдні для „ігрышча“ і паведамляюць моладзь аб месцы ігрышча. Моладзь плоціць музыкам за ігру і скокі адбываюцца два тыдні, пачынаючыся кожны дзень з паўдня (гадзін 12), і канчаючыся позна ў ночы; зразумела, што адначасна са скокамі другая частка прысутных займаецца піцьцём гарэлкі (Кашавічы, 1922).

III.

Тэксты калядных песень.

№ 35.

Дзе-ш ты быў, мой чорный баран?
На мельніцы, на мельніцы, міласьлівый пан.
Што-ш ты там рабіў, мой чорный баран?
Муку малоў, муку малоў, міласьлівый пан.
Чым жа малоў ты, мой чорный баран?
Рошкамі, ношкамі, міласьлівый пан.
За што-ш цябе прагналі, мой чорный баран?
Камень пабіў, камень пабіў, міласьлівый пан.
Чым жа цябе білі мой, чорный баран?
Палкамі, палкамі, мой міласьлівый пан.
А як жа ты плакаў, мой чорный баран?
Ба-а-а-а! ба-а-а-а! міласьлівый пан.

Гарбацёнкі, запіс Гарбачэнкі, 1920.

№ 36.

Ехала Кыляда з По́лацку
Да на сівенькім коніцку,
Привізла рєшата бліноў
Пыставіла на стале,
А раштво́ пысадзіла на куце́;
Павешала га́лку за гра(я)дку:
— Вісі, вісі мая, галка, да новага году,
— На новый год будзім разьбіраць—
— Людзём кішкі раздаваць.

Лубок, 1919.

Шейнъ, М. I, 1, № 81. *А. Петропавловскій*, „Коляды“ и „Купало“ въ Бѣлоруссіи („Этнографич. Обозр“. 1908, № 1—2, с. 159).

№ 37.

Ой, калядачкі, бліны-ладачкі!
Мароз, не змарозь мяне!
Я-ж цябе, мароз, наравіць буду

Пашыю кажух і насіць буду,
А на ножанькі паўсапожанькі,
А на ручанькі рукавічанькі,
А на галовачку лісьсю шапачку.

Плоскае, 1913.

Романовъ, Б. С., II, на с. 379 № 120.

№ 38.

Ой, у заянькі ды тры тропынькі:
Першая трапа, што ў гарох пайшла,
Другая трапа, што ў ламок пайшла,
Трэцьця трапа, што к вадзе пайшла,
Што ў гарох пайшла, каб наéсьцісі,
Што ў ламок пайшла, каб выспацца
А на Дунай пайшла, кап напіціся

(там сама)

Романов, Б. С., II, на с. 468 № 144.

№ 39.

А маленькій хлопчык [1])
Сеў на істопчык,
У дудыньку йграю—
Пана бога зьвелічаю
Сéлі дзеці есьць,
А мне недзе сесьць;
Я за пірог,
А мяне за хахол
Дый за парог

Забулдычына, 1914.

Шейнъ, Б. П., № 121. Падобны тып вершаў „Рацый“ гл. у *Бяссонова* ў яго К. П., IV, с. 46—48.

№ 40.

Я маленькій жàчык [2])
Курунбáчык,
У школі вучыўся
Зь мехам валачыўся
Панове, знайця—
Мне мех накрапайця

(там сама)

1-2) Песьні, паводле слоў казальніцы, сьпяваліся ў часы вуніі.

№ 41.

Малéнькі дзеткі [1])
Шчыпалі кветкі,
Пішдрóцы стаялі
Пана Езуса віталі;
Пан Езус маленькій
Нарадзіўся з паненкі
А вы, панове-дунóшы,
Мне кулéнды прòшу.

(там сама)

№ 42.

Ішла кыляда ўпярот Раштвá,
Пыталася, дзе быгатый двор
Ды зялезный тын,
Вароцікі ўсе чусáвыі,
Пыдваротніца пулужоная.
Зышчáпычка рыб'я костачка;
Быгатый двор ды за сем жы вёрст
І с прывёрстычкай

Белая Дуброва, 1914.

Романовъ, Б. С., VIII, с. 115.

№ 43.

Рáцыя рàцыя!
Капуста гырачыя—
Селі дзеўкі éсь,
А мне недзі сесь.
Я цап пірог,
Ды за парог;
А мяне дыгналі
Ды й за хахол ныдралі

Вяліж, са слоў Я. Дадона, 1921.

Шейнъ, Б. П., № 121. Безсоновъ, Б. П., № 120.

№ 44.

Я маленькій хлопчык,
Ўскачыў на снопчык;
Зьняў кылпачок—
Пажалуйця[2]) пітачок.

(там сама)

Романовъ, Б. С., II. на с. 174 № 19. *Безсоновъ*, Б. П., № 120.

---

[1]) Песьня, паводле слоў казальніцы, сьпявалася ў часы вуніі.

[2]) У даным выпадку, як і ў некаторых іншых, хістаньне ў адбіцьці тэй ці іншай моўнай асаблівасьці не выпадковае; яно выклікана хістаньнем у самой мове сялян; залежна ад розных прычым (ад тэмпу і г. д.) сялянка побач з *пыжалуйця* можа сказаць *пажалуйця* і да т. п.

№ 45.

Ішла баба па йльдý—
Рассыпыла кыляду,
Выбіх зайка зь лѐсу—
Пачаў мяне лаіць.
Я села на ката—
Паехала да папá,
— Ох, ты, бацюшка-папок!
— Рассуді маю бяду:
— Йшла па ільду—
— Рассыпыла кыляду...
і г. д. Паўтараючы адно і тое, сьпяваецца колькі хто хоча.

Таўсьцюкі, запіс К. Канапелькі, 1923.

Czeczot, P. ш. N. D. 1846, № XIII; *Шейнъ, Б. П.*, № 89 і дадатак № 4 М, I, 1, № 52. *Дмитріевъ*, С. П., с. 238-239. *Носовичъ*, Б. П., на с. 75, № 14.

№ 46.

Дзе хадзілі, гулялі кылядоўшчычкі?
Ко́ляда, ко́ляда [1])
Пыталіся ды багатага двара,
Багатый двор жалезный тын булаўчыстый,
Вароцікі чусовыі,
Пыдваротніцка рыб'я костачка,
Зашчэпачкі залатыі;
Кыла таго тыну ўсё травушка-муравушка,
На той траўкі ўсё цьвяточкі,
На цьвяточках па пташачкі,
Ўсё пташачкі, ўсё дробныі
Пяюць песні ўсё ро́зныі,
Пяюць песні угало́сныі раштоўскіі;
Яны пяюць, пашчабётываюць
Маладога (імя гаспадара), пабужываюць:
— Ты сьпіш, ляжыш (імя)
— З мыладой жаной, с сваімі дзеткамі;
— Калі сьпіш, ляжыш—сьпі здароў,
— Ня сьпіш, ні ляжыш—моў са мной;
— Атчыні вакно, паглядзі ў вакно́,
— Што на тваім дворы дзеіцца;
— На тваім дварэ (sic!) сам бог ходзіць,
— Сам бог ходзіць, цірамы строіць;
— Адзін цяро̀м—красный верх на ём,

[1]) Паўтараецца пасьля кожнага радка, запявала пяе верш (радок), а дудар на дудзе з прысутнымі падхопліваюць: „коляда, коляда", у выпаўненьні гэтай песьні прыймаюць удзел выключна мужчыны.

— Другій цяром—сіній верх на ём,
— Трэцьцій цяром—жоўтый верх на ём;
— Ў адным ціраме—ясён месяц, красно сонца,
— У другім ціраме—буйны ветры,
— Буйны вéтры, ясны зóры,
— У трэцьцім ціраме—дробны зьвезды.
— Ясён месяц—сам хазяін (імя),
— Красна сонца—жана яго,
— Бýйны ветры—сынкі яго,
— Дробны зьвезды—дачушкі яго,
— Ясная зóра—нявестачкі,
— А цёмна ночка—сям'я яго.
— Ці сьпіш, ляжыш сам хазяін (імя)?
— Калі сьпіш, ляжыш—сьпі здароў.
Атклікнулася мылада жана:
— (імя гаспадара) дома нéтуці,
— Ён паехаў у сталён горад,
— Сталён горад суды судзіць;
— За суд бярэць па сто рублей,
— За пірасýд—па дзьве тысячы;
— Яго там цар пажалаваў,
— Залóт персьцень падáраваў,
— Залот персьцень на правую ручку
— Не мéзіный паліц;
— Жанé яго—кýньню шубу,
— Куньня шуба па пятушкі,
— А баброў каўнер па плечушкі;—
— Сынкам яго—па коніку
— Па коніку па вароным,
— Па сядзельцу, па залóціньким;
— Нявестачкам—па чэпчыку
— Па шаўкову,
— Дучушкам—па венчыку
— Па пярловаму.
— Задумаў ён дамоў ехаць,
— Узьехаў ён на сінё мора—
— Яго конік утýпіўся,
— Утýпіўся, упýдзіўся;
— А ён махнуў правóй рукой
— Правóй рукой, шаўковай хустой,
— Ды звалíўся золат пéрсьцінь
— З правай ручкі,
— З мéзінага пальца,
— Утануў жа ў сінё мора.
— Яго жана вумная была,
— Завідзела з высока—церамà;

— Наніймала трох мòлайцаў:
— Вы, молайцы, мыладыі
— Вашы невады шыўкавы,
— Ды пыймайці залот персьцінь.
— Ні пыймалі залот персьцінь.
— Ды пыймалі тры рыбынькі,
— Тры рыбынькі, тры акунёчкі,
— Адзін акунь—па сто рублей,
— Другій акунь—па тысячы,
— Трэцьціму акуню цаны нéтуці;
— Яго цана ва (Йванюткі)
— Ва (Йванюткі) на століку,
— На століку на чусóвым,
— На скацерці, на бялёвай,
— На тарэлачкі, на блюдачкі.
А ты, барзьдзéй, ні баў гасьсей!
Твае дары ні вялікіі;
У дзьверы ня лезуць,
А ў вакно—як шыюць.
Ат яго кóні, бочка солі,
А кароўкі—чвёртка палоўкі,
Ат авечкі—чвёртка грэцкі,
Ат яго кошкі—гарох у лукóшкі,
Ат яго сьвінкі—пуд саланінкі,
Ат сабакі—нюх табакі;
Пычынàльнічку—чарку гарэлкі
І кыўбаса на тарэлкі,
Пыдхвáтнічку—чыцьвярык аўса
І на верх кыўбасá,
Механóшу—капý грошы,
Дудару—чырвон злотый.

(там сама)

Шейнъ, Б. П., № 90, 91. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 115. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 175 № 18 абв.

№ 47.

У лéсі на вéрэсі
Ляжыць брýсься чысаная, пазлочаная,
Па тэй брусі па чысанай
Шла пайшла панна (імя дзяўчыны);
За ёй ззаду пагóн гонюць:
— Пастой, пастой, панна (імя)!
— Загáдыньку зыгадаю.
— Адгадаіш мая будзіш,
— Ні ‘тгадаіш—ня будзіш.

— На сьвятога Раштва ро́жа цьвіла?
— Ніпраўда сьлі́чный, паніч,
— Я там была, вянкі віла,
— Стаіць рожа сухў́сінька".
Як па ве́расу пы зялёнаму
Ляжыць брусься чысаная,
Па тэй брусі, па чысанай
Ішоў, пайшоў пан (імя хлопца)
За ім ззаду пагон гонюць,
Пагон гонюць (Марылічку):
— Пастой пастой, пан (імя)!
— Загадыньку зыгадаю,
— Калі 'тгадаіш дык мой будзіш
— Ні 'тгадаіш—дык ня будзіш:
— На сьвятога Пітра Дунай замерз?
„Ніпраўда (Марылька) я там быў,
„Каня паіў.
„Стаіць Дунай ціхў́сінька,
„Вадзіцка цяплў́сінька.

(там сама)

Шейнъ, Б. П., дадатак № 12. *Безсоновъ*, Б. П., № 29. *Гильтебрандтъ*, С. П., *ССС. Радченко*, Г. П., на с. 114 № 9. *Zieńkiewicz*, P. G., с. 130. *Дембовецкій*, О. М. Г., I, на с. 535 № 9, на с. 562, № 141.

№ 48.

Ко́ляда, ко́ляда! було́ у бабы тры дачкі:
Адна дычка шоўкам хустачкі нашывала,
Другая дычка кросенкі ткала,
А трэцьця дычка штаны шыла,
Хадзіла баба пыглядала:
— Вось і ета харашо і ета хырашо.
— І усё ета табе, дачушка, большы.
— Мамухна, мыя родная!
— Мы так ня хочым.
— Я табе, дачушка, плаціць буду
— Вам будзіць біза бі́ды,
— Табе, дачушка, жаўтушычка,
— Табе—бялушычка,
— А табе—чарнушычка.

Арлоўка, 1915.

№ 49.

Ой, роза, роза, чаго адна ва гародзі?
— Чаго-ш я адна:—са мной красачкі,
— Са мной красачкі сіні васількі.

— Аднаго нету баровага цьвету.
— Ой, дзе-ш ён будзіць—ка мне прыбудзіць,
— Ка мне прыбудзіць са мной цьвісьці будзіць.
(імя) чаго адна ў тынок пайшла?
— Чаго-ш я ‘дна:—са мной дзевачкі,
— Са мной дзевачкі ўсё падружачкі.
— Аднаго нету—мой сужанькій.
— Ой, дзе-ш ён будзіць ка мне прыбудзіць,
— Ка мне прыбудзіць—са мной жыць будзіць.

Плоскае, 1913.

Шейнъ, М. I, 1, № 156. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 24 № 21. *Дембовецкій*, О. М. Г., I, на с. 525 № 7.

Цярэшка [1]).

№ 50.

Цярэшка, цярэжычка!
Праз двор дарожычка
Бітая, таптáная,
Я у мамкі каханая,
Цярэшкі біда стала—
Сь кім яго жана спала.
Пад дубам зіляне́нькім
С казачком маладзенькім.
Хуць я ў бяду упаду́—
Сібе дзяду́льку злаўлю
С красным каўнерчыкам,
Каб звалі жаўнерчыкам.

Косаўшчына, 1914.

Шейнъ, Б. П., № 102. *Киркоръ*, Э. в. В., с. 168—169. *Шейнъ*, М. I, I, № 101, 107, 112. *Романовъ*, Б. С., с. 124.

№ 51.

Ай ту-ту-ту́! пастаўлю красёнкі ў куту,
Свайму́ дзядульку кашульку вытку
І с красным рукаўчыкам,
Каб звалі красаўчыкам.

(там сама)

Дмитріевъ, С. П., с. 247. *Киркоръ*, Э. в. В., с. 169.

№ 52.

Паіў я коніка ў вядрэ,
Знайшоў я рыбыньку у вадзе;
Смяшная рыбка карась—
Пацалуй, дзецька, хуць раз,

(там сама)

Романовъ, Б. С., с. 124.

[1]) Песні, якія носяць назву „Цярэшкі“, ужываюцца калядными сьвятамі, калі адбываецца „свадзьба Цярэшкі“.

ЗАПУСНЫЯ ПЕСЬНІ

I.

Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне запусных песень і звычаяў.

Песьні гэтага аддзелу па месцам запісаў разьмяркоўваюцца так:

Віцебскі п.: Васкавічы—1 (Шейнъ, Б. П.).

Вяліскі п.: Будніца—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Гарадзец—2 (Шлюбскі), Ўзкае—3 (Романовъ, Б. С., VIII), Усьвяты—2 (Шейнъ, Б. П.).

Лепельскі п.: Смалянецкая воласьць—1 (Шейнъ, Б. П.), Чашнікі—11 (тс).

Сеньнескі п. без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Романовъ, Б. С., II), Бабоўка—1 (тс), Ігрушцацкая воласьць—2 (Шейнъ, М., I, 1), Плоскае—4 (Шлюбскі), Ульяновічы—1 (Дембовецкій, О. М. Г., I), Чарэя—1 (Шейнъ, М., I, 1).

Некаторыя звычаі на масьленку адзначаны ў такіх мясцох:

Віцебская губ. (Шейнъ, М., I, 1).

Вяліскі п.: Гарадзец (Шлюбскі), Крутое (тс), Шаршні (тс).

Полацкі п.: Арлоўка (Шлюбскі), Іванова (тс).

Сеньненскі п.: Ігрушацкая вол. (Шейнъ; М., I, 1).

Сураскі п.: Кашавічы (Шлюбскі).

Агульна беларускія запусныя песьні і звычаі разгледжаны акад. Карскім у яго досьледзе „Бѣлорусы“, III, 1, сс. 137—141 укл. у разьдзеле;—„Масьленіца“.

II.

Звычаі.

Апошні тыдзень перад Масьленкай завецца „рабой нядзеляй“; па народным тлумачэньні завецца ён так таму, што ў гэты тыдзень дазваляецца есьці малако і мяса, ня пільнуючы пастоў—серады і пятніцы; на масьляніку-ж ва ўсе дні ядуць толькі малочнае ня ўжываючы мяснога (Крутое, 1919). Апошні тыдзень „месаеда ці свáдзябніц“ перад масьлянай у Сураскім павеце завуць „масьлянымі зáгвянамі“. У гэты дзень трэба кожнаму есьці, як-мага болей мяса і сала. (Кашавічы, 1920).

Вечары на масьленым тыдні завуцца „сьвятымі вечарамі“. У дзень працаваць у гэты тыдзень дазваляецца, а ў вечары—нельга. Гульні робяцца галоўным чынам дзяўчатамі і хлопцамі. Яны „іграюць песьні, хараводы водзюць“... Жанатыя мужчыны і замужныя жанчыны ўдзелу ў гульнях ня прыймаюць ніякага; яны сьпяць, гавораць, ядуць... Больш рухавыя заняткі ім не дазваляюцца. Прычым есьці можна толькі страву малочную і бліны.

Першы дзень паста завецца „кривэй панядзелак“. У гэты дзень пост, але гульні хлопцаў і дзяўчат не забараняюцца; яны толькі прыймаюць некалькі іншы характар; моладзь у гэты дзень з песьнямі ходзіць па суседніх вёсках. (Гарадзец, 1919).

У пятніцу на Масьленай гаспадары езьдзяць на кірмаш у суседні горад ці мястэчка для закупкі розных гаспадарчых прыладаў. У апошні дзень Масьленіцы—нядзелю—трэба есьці сем разоў, па ліку тыдняў у Вялікім посту, а адвечарам сям‘я ў поўным складзе павінна загаўляцца. Пасьля вячэры са стала нічога ня ўбіраецца, а ўсё пакінутае на стале перш закрываецца абрусом, а потым хутрай з вывернутай уверх воўнаю; так робіцца для таго, каб увесь год у сям‘і ня было сварак. Кожны прыкмячае пакінутую на стале сваю лыжку, а на другі дзень глядзяць—чыя лыжка перавернецца, той у гэтым годзе павінен памерці. (Кашавічы, 1920).

Моладзь ходзіць на ігрышчы, зьбіраецца на вуліцы, дзе гуляе ў розныя гульні, сьпявае песьні і езьдзіць на санках з гары; прычым санкі абавязкова трэба ўкрасьці ў

якога-небудзь суседа; дзеці езьдзяць з гор на „маразянках“, якія робяцца такім парадкам: старое рэшата пераблутваецца ўнізе вяроўкай, накладваецца ў яго розных ануч, атрэп'я ат ільну, кароўяга гною і сьнегу, потым некалькі разоў рэшата паліваецца вадою і „маразянка“ гатова (тс). У некаторых месцах час праводзіцца за загадваньнем загадак, напрыклад такіх: „яшная пасьцеля, залезный ток, сьвіньней піраскок“ (блін, скаварода, подмазка). (Арлоўка, 1914).

У некаторых месцах на масьленым тыдні моладзь спальвае ахапак саломы, але гэты звычай выходзіць з ужываньня.

Песьні, якія сьпяваюцца на Масьленым тыдні ў Сеньненскім і Вяліскім паветах завецца „Màсьленка“.

У Полацкім павеце ў чацьвер на Масьленым тыдні замужнія жанчыны і дзяўчыны „спраўлялі Ўласа“. У сані, ўбраныя папяровымі кветкамі, садзіцца гаспадыня якога-небудзь двара; санкі абкружаюцца жанчынамі і пасаджаную з песьнямі вядзуць па вёсцы. Конь і збруя таксама ўбіраюцца папяровымі кветкамі; іншы раз санкі цягне ня конь, а жанчыны і ўсіх мужчын, якіх яны сустракаюць на сваім шляху, жанчыны паднімаюць на „ура́“, за што тыя павінны плаціць грошы. Сканчваецца сьвята п'янствам. Улас іншы раз бывае перад Масьленай, а іншы раз пасьля. (Іванова, 1913). Сяляне Вяліскага павету так кажуць аб гэтым сьвяце: „бабскій Ўлас, бабы гарэлку п'юць, п'юць, скацуць ды крицаць ўсю ноц“. (Шаршні, 1915).

III.

Тэксты запустных песень.

№ 53.

Мы ма́сьлінку дажидалі,
Сырам гару набівалі
І маслым палівалі;
А ат сыру гара́ кру́та,
Ат масла гара́ ясна;
Нас Масьлінка спыдманіла:
На больший пост пысадзіла,
На кіслую на капусту,
На салодкую сыладу́ху,
На горькую рэдьку.

Гарадзец, 1919.

Шейнъ, Б. П., № 123, 125, 126. *Семевскій, М.* Торопецъ уѣздный городъ Псковской губ. Спб. 1864, на с. 79 № 78, на с. 63 № 29. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 140. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 79 № 19.

№ 54.

Шчибячи, шчибячи, ластаўка, ластаўка,
Як дзеванька плакыла, плакыла!
Ма́сьляная шчасьлівая, рысьцяліся да Вялікадня!
А хто сыру не даеў—таго́ сыр пагніэць.
Масьляная шчасьлівая, рысьцяліся да Вялікадня!
А спасіба (імя жанчыны) за сыр, за ма̀сьліца
Масьліная шчасьлівая, рысьцяліся да Вялікадня!

(там сама)

Шейнъ, М. I, 1, № 122. *Радченко*, Г. П., на с. 215 № 194. *Романовъ*, Б. С. VIII, с. 137, 138.

№ 55.

На гарэ бабы сядзелі
Кулаком зямлю прабілі,
Аб нявестак судзілі:
— Нігодзя, нявестка, нігодзя,
— Бел кужаль прала—драмала,

— Кросінцы ткала—ірвала,
— Па ваду пайшла—аблілася,
— А ў клець пайшла—клець зжыгла;
— А ў маей клеці сьвет—дабра:
— Камарова сьцягно мяса было́,
— Шасток анучык плацьця было́,
— І арэхава чашка масла было́,
— Саломіна дудка мёду было́

Плоскае, 1913.

Шейнъ, Б. П., № 172, *Романовъ*, Б. С., II, на с. 218 № 86; VIIIс. 139. *Добровольскій С. С.*, IV, на с. 135 № 101 а-д.

№ 56.

На вуліцы дзеўкі гуляюць,
Мяне маладзеньку гукаюць;
У мяне маладзенькі—муж ліхій—
Ай, хоць пусьціць позненька
Усе дзевачкі—розьненька.
Выйду на вулку запяю
Усіх дзевачках сабяру.
А будзім мы гуляць да сьвету,
Да позьняга абеду.
А дамоў іці́ баюся,
Бо́льшаму дзеверку пакланюся:
— А, дзевярочка, бо́льшый брат!
— Завядзі-ш мяне да дому,
— Пашыю кашульку да до́лу,
— Дам табе хусту шаўкову.
— Насі, дзяверatка, здаровый

(там сама)

Шейнъ, М. I, 1, № 121. *Романовъ*, Б. С. VIII, с. 138.

№ 57.

На гарэ елка сьцеліцца;
Дзевачкі зайку злавілі
І ў крупеньцы зварылі,
Дзевачкі за сталом мяса ядуць,
А хлопчыкі пад сталом ко́сьсі грызуць;
Дзевачкі за сталом сьмяюцца—
Хлопчыкі пад сталом грызуцца.

(там сама)

Романовъ, Б. С., VIII, с. 138.

ВЕСНАВЫЯ ПЕСЬНІ

ВЕСНАВВІЯ ЦЕСРНІ

I.

Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне зьбіраньня веснавых песень і звычаяў.

Веснавыя песьні, сабраныя папярэднімі этнографамі і мной, па месцах запісаў разьмяркоўваюцца так:

Аршанскі п.: Ганчары—1 (Романовъ, Б. С., II).

Віцебскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Шейнъ, Б. П.), Бабінічы—1 (Шлюбскі), Бабініцкая воласьць.—7 (Романовъ, Б. С., VIII), Васкавічы—2 (Шейнъ, Б. П), Віцебск—4 (жс.), Веляшкоўская воласьць (Шейнъ, М., I, 1), Воранава—1 (тс), Вымна—3 (Шейнъ, Б. П.), Маделіна—3 (Шейнъ, М., I, 1), Гарбачэва—3 (Шлюбскі), Нікрапольле—1 (тс), Ужляціна—1 (тс), Шчэрбінская воласьць—1 (Романовъ, П. С., VIII), Янавічы—1 (Шлюбскі).

Вяліскі п.: Дзейкаўшчына—2 (Шлюбскі), Казакова—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Крутое—2 (Шлюбскі), Крыжы (с. Кресты)—1 (тс.), Маклок—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Узкое—4 (тс.), Шаршні—2 (Шлюбскі).

Гарадоцкі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (тс.). Болецк—9 (Романовъ, Б. С., VIII), Горкаўская воласьць—1 (тс.), Мішневічы—7 (тс.).

Дісьненскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—3 (Крачковскій, Б. С.) Завулкі—53 (Романовъ, Б. С., VIII), Дісна—1 (Дмитріевъ, С. П.).

Дрысенскі п.: Валейкава—6 (Романовъ, Б. С., VIII), Гырдюкі—4 (тс.), Шлыкі—3 (тс.).

Лепельскі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шейнъ, М., I, 1),—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Апанаскавічы—1 (Шейнъ, Б. П.), Ветрына—2 (Шейнъ, М., I, 1), Зазерыца—2 (тс.), Каменская воласьць—1 (Шейнъ, Б. П.), Капціевічы—5 (тс.), Косаўшчына—1 (Шлюбскі), Цяпінская воласьць—1 (Шейнъ, Б. П.), Смолянецкая вол.—1 (тс.), Чашнікі—9 (тс.).

Невельскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Шейнъ, Б. П.).

Нова-аляксандраўскі п.: Браслаў—6 (Романовъ, Б. С., VIII).

Парэцкі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Романовъ, Б. С. VIII). Бародзенская воласьць—3 (Шлюбскі), Інькава—17 (Добровольскій, С. С., IV).

Полацкі п.: Арлоўка—2 (Шлюбскі), Забулдычына—1 (тс.).

Себескі п.: 3 песьні і некаторыя звычаі па паштовым шляху з Себежа ў Люцын (Анимелле, Б. Б. К.), Кісялі—1 (Шейнъ, Б. П.).

Сеньненскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Романовъ, Б. С., II), Аляксенічы—2 (тс.), Аўсішча—1 (тс)., Боркі—1 (тс.), В.-Гарадзец—2 (тс), Гарывец—1 (тс.), Латыгава—2 (тс.), Цюцькі—1 (тс.), Плоскае—16 (Шлюбскі), Ульянавічы—1 (Романовъ, Б. С., II), Ходцы—1 (Шейнъ, М., I, 1), Чарэя—1 (тс.)—2 (Дембовецкій, О. М. Г., I).

Сураскі п.: Кашавічы—14 (Шлюбскі).

У Шейна (М., I, 1) знаходзіцца 3 песьні, азначаныя Віцэбскай губэрняй.

Некаторыя веснавыя абрады і звычаі запісаны ў наступных мясцовасьцях: Аршанскі п. (Шейнъ, М., I, 1), Мошкава (тс.). Віцебскі п.: Белая-Дуброва (Шлюбскі), Веляшковічы (Шейнъ, Б. П.), Вымна (тс). Вяліскі п., (Рамановъ, Б. С. VIII) Вяліж (Шлюбскі), Крутое (тс.). Гарадоцкі п.: Вярэцкі, Зайкаўскі і Ціастоўскі прыходы (тс.). Лепельскі п.: Каменская воласьць (Шейнъ, Б. П). Нова-Аляксандраўскі п.: Дукты (Шейнъ, М., I, 1). Полацкі п.: Амельчынкі (Шлюбскі), Забулдычына (тс.), Межава (тс.). Сеньненскі п.: Плоскае (Шлюбскі), Ульянавічы (Дембовецкій, О. М. Г., I).

Апісаньні веснавых звычаяў знаходзім у такіх працах: Добровольскій, В. Егорьевъ день в Смоленской губ. (Живая Старина, 1908, II); ёсьць матар'ял па Парэцкім павеце. Ивашинъ, Пасхальные обряды и обычаи въ деревнѣ (Витебскія губ. Вѣд., 1905, № 87). Шпилевскій, Волочобники въ Витебской губерніи (Русскій Дневникъ, 1859, № 101). Празднованіе Пасхи у бѣлоруссовъ католиковъ (Новоалександровскаго у.) „Виленскій Вѣстникъ", 1891, № 93; „Ковенскія губ. Вѣд.," 1891, № 29.

Веснавыя песьні і звычаі разгледжаны акад. Е. Карскім у яго досьледзе: „Бѣлорусы", т. III, вып. 1 стар. 141—167 укл.

II.

Веснавыя звычаі.

Першым веснавым сьвятам зьяўляюцца „Аўдакéі“ (1 сакавіка с. с.); з гэтага дня дазваляецца сьпяваць „Вясноўскія“ песьні; у гэты дзень не дазваляецца рабіць якую-небудзь вялікую працу, як, напр., сячы дровы, а можна толькі „та́к сабе калыпацца кала хаты—трасянку трэсь“... (Забулдычына, 1915). З гэтага дня пачынаецца „пыклiка́ньня“ вясны жанчынамі. Вось адна „пыклікальныя“ песьня:

Аў, аў! ці я ў бацькі ні дычка.
Ці, я ні дачушка?
Руса кыса пы пыяс,
Шаўковыя ўсту́шка.

Гарадок. п., запіс В. Кузьміной, 1921.

Другім веснавым сьвятам зьяўляюцца „Саракí“ (9 сакавіка с. с.); саракі сьвяткуюцца жанчынамі і мужчынамі, ніякія працы і заняткі ў гэтае сьвята не дазваляюцца; вясковыя дзяці яшчэ да ўсходу сонца павінны ўкрасьці ў суседа па 40 „шчэпін“, тады ўлетку, ганяючы жывёліну ў поле, кожны, хто ўкраў 40 трэсак, знойдзе па 40 птушыных гнёзд. (Забулдычына, 1915).

Далей ідзе цэльны шэраг розных сьвяткаў, з якімі зьвязваюцца розныя звычаі і павер‘і.

Зьвярнуўшыся з царквы з вярбой у Вербную нядзелю, Вяліскія мяшчане сякуць ёю па тры разы сваіх дзяцей і прыгаварваюць:—„Верба хрёс! сякí да сьлёз; ні я сяку—верба бьець; трєцій раз на здароўя!“ (Вяліж, 1920).

У „цистый“ чацьвер у лазьні мыцца трэба да ўсходу сонца; у пасудзіну, з якой мыюцца, кідаецца серабро, каб быць чыстым увесь год і не хварэць. (Вяліскі і Сеньненскі п. п.).

У гэты самы чацьвер з „па́чэсак“ на „кылаўроці“ прадзецца нітка, прычым прасьці нітку абавязкова павінна старая жанчына, а кола „кылаўрота“ павінна круціцца ў адваротны бок, справа ўлева. Ніткай гэтай зьвязваюць рукі і ногі пры „рысьцяжэньні жил“ (Крутое, 1920).

Валачобнікі на Віцебшчыне ўжо пачынаюць зыходзіць са сцэны, яны ўжо ходзяць рэдка. З Вялікаднем цяпер зьвязваецца мала старадаўніх звычаяў. Паміж іншым, на Вялікдзень на магілкі нябожчыкаў кладзецца па яйцу і часткі вялікоднага пячэньня. Калі яйцо кладзецца, дык той, хто кладзе, тры разы хрыстосуецца з нябожчыкам. Пакладзенае на магілкі забіраюць сабе жабракі. (Крутое, 1920). У Сеньненскім павеце яйцы на Вялікдзень закопваюць нябожчыкам у магілкі. (Плоскае, 1915). Шкарупа ад першага зьедзенага на Вялікдзень яйца, асьвечанага ў царкве, і нямыты абрус з-пад вялікоднага стала захоўваюцца на ўсё лета. Імі абносяць будынкі ў час навальніцы, і гэтым ратуюць іх ад пажару (Крутое, 1918). Косткі ад асьвечанага вялікоднага мяса, закопаныя ў жыта, асьцерагаюць жыта ад граду; закопаныя „на столі“ яны асьцерагаюць ад пажару (Межава, 1919). У першы дзень Вялікадня трэба есьці адно толькі „сьвянцонае“, інакш улетку ўкусіць зьмяя (Амельчынкі, запіс Мухіна, 1920). Калі на Вялікадня ясная, хаця і халодная пагода, то сады будуць у наступнае лета з пладамі (тс.).

Сьвята Юр'я (23—IV с. с.) у іншых месцах называецца „расу́ таптаць“. Старыя замужнія жанчыны ў гэты дзень, набраўшы з сабой ежы і гарэлкі, ідуць у поле ці ў лес.

Ідучы на Юр'я ў царкву, сяляне становяць па палях вярбу асьвечаную ў Вербны тыдзень, каб збожжа расло такім тоўстым і вялікім, як вярбіна (Плоскае, 1915); там п'юць, ядуць, скачуць і сьпяваюць песьні (Крутое, 1919).

У Барысаў дзень (3—V с. с.) нельга працаваць на конях, „бо такій устано́ў дзяды зьдзелалі; у сягодняшній дзень ніхто ва ўсім царстві ні работаіць на коніх“ (Белая Дуброва, 1915).

„Ра́дуніцу“ вёска таксама сьвяткуе; ходзяць у царкву і на могілкі; зьвярнуўшыся з царквы, абавязкова трэба схадзіць памыцца ў лазьню. Пасьля лазьні іграюць у карты, качаюць яйкі; працаваць нельга (Забулдычына, 1915).

Адным з апошніх веснавых сьвятаў зьяўляецца Мікольшчына (9—V с. с.). Сьвята адбываецца каля абраза Міколы; у каго ў хаце ёсьць гэты абраз—тая сямья ў дзень Міколы павінна е́сьці чатыры разы, а ў каго няма яго (да таго прыносяць абраз з царквы), тая сям'я павінна есьці пяць разоў. Сьвята цягнецца цэлы тыдзень, на працягу якога сяляне езьдзяць адзін да другога ў госьці „хадзюць па радне́“; язда гэта называлася „цига́ніць“, а называлася так таму, што езьдзілі прыбраўшыся цыганамі ці якімі-небудзь зьвярмі.

У дзень Міколы абраз Міколы насіўся ў „шинок“; „Цєлава́льнік“ працягнуўшы руку перад абразом, гаворыць: — „Атсохні мыя рука, калі буду шєльмаваць“—і цалуе абраз. Не-

каторыя бачаць у гэтым звычаі ўзьнікнавеньне тэрміну „цєлавальнік“ (Крутое, 1918).

Веснавыя песьні маюць некалькі назваў, далучаных да таго ці іншага сьвята: „вясноўскія“ (Сенненскі, Сураскі, Вяліскі паветы), „сьвятошныя“ (Сурас. п.), „валачобныя“ (уся Віцебшчына), „вялікодныя“ (Сенненскі п.), „хрысьтоўськія“ (Вяліск. п.), „мікольскія“, „песьні на Міхайлу“ альбо проста „Мікола“, напр., „сьпяваць Міколу“ (Сураскі п.), „Ягорскія“ (Вяліск. п.).

III.

Тэксты веснавых песень.

№ 58.

Ці ня тошна табе, рэцка,
З сінім лёдам рыставацца,
Па берашкох разьлівацца,
Усё па кру́тых беражоцкых,
Па жоўціньких пясоцкых?
Хуць і тошна—рыстаюся
І широка рызальюся.
Ці ня тошна табе, дзеўка,
З малойцикам рыставацца?
Хуць і тошна—дык рыстанусь,
Я й рыстанусь—рыспрышчаюсь.

Кашавічы, 1922.

№ 59.

Што за й месяц,
Што за й ясный,
Ноццу сьвеціць, а днём не;
Што за й мілый—друг любезный?
Зімой любіць—ўлетку не;
Як засыплюць маё цела
Сырым, жоўціньким пяском,
Як ускоцюць на магілку
Белый камень...
На тым-жа на камушку
Сыма сяду пысяджу,
Піцаль, гора рыскажу,
На карцінку ўсё сьпішу,
Ўсім падрушкам рызашлю.
— Вы, падрушкі, мае ду́шкі,
— Ні любіця нікаго,
— Априц мілага свайго.
— Што і сь ней-жа са любові
— Приклюцаіцца балесь,
— Са і тэй-жа су балесьці
— Пулыцила скора сьмерць.

(там сама).

Романовъ, Б. С., I, на с. 155 № 128.

№ 60.

Як у зялёным садоцку
Рысьпівалі сылаўі,
Як у зялёным садоцку
Рысьцьвіталі ўсі цьвяты;
Калі роза рысьцьвітала—
Ўсяк стыраіцца сырваць,
Калі роза апыдала—
Ўсяк стыраіцца стыптаць.
Приукрасную дзяўцанацку
Ўсяк стыраецца любіць—
Нішчасную дзяўцонацку
Ўсяк стыраецца забыць. (там сама).

№ 61.

Кыла берышку я хажывыла,
Цырнабыльніцык зыламывыла,
Гусей лібядзей зыманівыла.
Ці вы, гусі, не ныплакаўшысь,
А я мыладая ні ныплакылась.
Я ныплакыўшысь дамованькі прыйшла,
Ёй на ўстрэцу ахвіцэр маладэй,
Ахвіцэрынька малодзінькій,
Не жынатый, халосьцінькій.
„Не бяры за маё белае ліцо—
„Маё ліцо ды й рызгарыстае,
„Мыя мамінька дыгадлівыя:
„А цом ліцо разгырайіцца—
„Я й на сонейка не хажывала,
„Проці ветру з мальцым я ні стаівыла.

Янавічы, 1920

№ 62.

Кыла беражоцка пыхаживаю
Ўсіх лебядзей сыманіваю.
Ах! вы, гусі, гусі-лебядзі, маі!
Ці вы, гусі, не ныплавыліся?
А я мылада ўжо ныплавылыся
І зыплакыўшы дамоў пайшла.
Насустрєцу мыладэй ахвіцєрик.
„Ахвіцєрик мой мыладэй
„Не бяри мяне за белае ліцо,
„Маё ліцака разгаристае,
„Мая матушка дагадлівая,
„І яна скора дыгадаіцца
„Пацаму ліцо рызгырайіцца—

„Па марозу я не хаживыла,
„Проці ветра я ні ста́івыла
„І пад сонцым я ня сіживыла.

Кашавічы, 1922.

№ 63.

Па крутаму беражоцку
Ка (Наста́сіну) дваро́цку.
Ішла Зорацка ракой—
Яе ўдарила валной.
(Наста́сянька) выхадзіла,
Стакан мёду, стакан піва вынасіла.
Із рибятым гыварила:
— Не дзівіця, рєбяты,
— І не дзівіця, мыладыі,
— Што я к вам неўборная,
— Што ня ў белянькай рубахі,
— Што ня ў новенькай паневе.

(там сама).

Шейнъ, М. I, 1, № 562.

№ 64.

А ў гумне, за гумном
Дзеўкі хмель садзілі,
Содзюци хмялёцик, яны гыварилі:
Расьсі хмялёцик
С карєньням глубокім,
Лісьційкам широкім,
Шишкымі бальшимі.
Лю̀лішкі-люлі́, шишкымі бальшымі!
Казаў хмялёнак свайму півава́ру:
— Калі-ш вы мяне ня ўва́рицця
— Вы мяне ня ўтрима́іцця
— Ні ў дубовых боцках,
— Ні ў зялезных абруцах.
Люлішкі-люлі, ні ў зялезных абруцах!
— Пы сянёх пыкацуся,
— На ганыцку рызабьюся,
— Пы двару ризальлюся.
Люлішкі-люлі, ризальлюся.
Казаў (Іванька) свайму бацькі роднаму:
— Жані́, жані́, мяне, роднінькій,
— Калі мяне ня-жєніш
— Дык мяне ня ўтримаіш
— Ні ў белым былахоні,
— Ні на вароным коні.

Люлішкі-люлі, ні на вароным коні.
— Паеду я на риныцик,
— Куплю сабе мішцанацку,
— Куплю сабе мішцанацку;
— Сельскую дзіравеньськую
— Душиньку (Марýтушку).
Люлішкі-люлі, душиньку (імя).

(там сама).

№ 65.

Што за зоркі, што за ясныі
Ноччу сьвецюць, а днём не.
Што за мілая распраклятая,
Ўлетку любіць—ўзімку не.
А я пыдаў-бы сто рублей
Піраехаць жиць к мілой.
Я пастроіў-бы цяром,
Рыссадзіў-бы зелін сад,
Напускаў-бы сылаўёў.
Да вылітай, мой саловушка,
Зь зялёнага саду—
Да выхадзі, мая мілая,
Зь зялёнага саду.

Бародзеншчына, 1919.

Романовъ, Б. С., I, на с. 103 № 13. *Радченко*, Г. П., на с. 127 № 8.

№ 66.

Ох, што, што за трава
Ў маім саду парасла,
Жаўтым цьветам зацьвіла;
Ох, і што, што за дружок,
Што далёка ат мяне,
Што ня ведаіць аба мне.
Напісала-б я лісток—
Я й пісаць ня ўмею;
Паслала-б пасланца
Ды й паслаць ня сьмею.
Паслала-б я роўнага,
Раўнэй праўды ні скажыць;
Паслала-б я малога—
Малый таго ні знаіць;
Паслала-б я старога—
Старый туды ня дойдзець,
Ў паўдарожанькі прападзець.
Запражыця мне каня—

Паеду я сама,
Проці мілага двара
Там высокая гара,
Там крынічная вада;
Я й коніка напасу,
Я й зь мілінькім пасяджу,
Я й коніка напаю,
Я й зь мілінькім пастаю.

Плоскае, 1913.

Романовъ, Б. С., II, на с. 419 № 161. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 383 № 56. *Малевичъ*, Б. П., на с. 71 № 38. *Романовъ*, М., II, на с. 213 № 278, на с. 254 № 355. *Карскій*, Б. П., XIII, на с. 281 № 54.

№ 67.

Баляць, баляць маі ножинькі
Ат дальняй дарожинькі;
Знабіць, знабіць рэціво—сэрца
Не па татку, не па маці,
А па мілым (імя).
А каго мне наняці,
Ды за мілінькім пыслаці?
А мне малога наняці?
Ды за мілінькім пыслаці;
Малый дойдзіць
Да ні зразумеіць, што скызаць;
А мне старога наняці
Ды за міленькім пыслаці,
Старый знаіць, што скызаці
Ды ня дойдзіць да яго;
А мне роўнага наняці
Ды за мілінькім пыслаці;
Ён і дойдзіць да яго,
Ён і сядзіць ля яго,
Ён і знаіць, што скызаці.

Гл. № 66.

Бародзеншчына. 1919.

№ 68.

Мне ня люба, мне ня міла чужая старонка
Толькі люба мне широкая дарошка.
Ай, па тэй-жа па дарошкі
Я сь мілым хадзіла...
І па тэй-жа па дарошкі
Друшка правадзіла.
Усё, пра ўсё мы гаварилі,
Усё мы расказалі.

А пра днó славецка
Сказаць і призабыла...
Я сказыць призабыла,
Сказыць ні пасьмела,
Громкім голасам кричала—
Мой мілый не слыхаў,
Шаўковай хусткый мыхала—
Мой мілый ні глянуў,
Зылатым пярсьтнём кацíла,
Дружкá правадзіла...

(там сама).

Шейнъ, Б. П., дадатак № 65.

№ 69.

Кыла саду, саду зялёнага
Туды ішла дарошка,
Па тэй па дарошкі
Ішлі три дзяўчынкі
У васількí гуляя, песеньку сьпявая:
Ах, ты, травушка-муравушка
Ня кошаная, сушаная!
Што бяз дожжику трава вырасла,
Што бяз сонейка трава высахла,
Што бяз мілага сэрца вы́ныла.
Выйду выйду за вароцікі
Стану, гляну на магíлыцкі
Узьніміцясь, бýйныі ветри,
Ўздýйці жаўтавы пяскі,
Узьніміця грабавую дашку.
Я сь мілінькім павідаюсь,
На пыдаркі разьміняюсь:
Бяри свай зылаты пярсьцёнык—
Падавай свой шаўковы платок.
Зылаты пярсьцёнык злымаіцца
Шаўковы платок змараіцца—
Уся любоў зь мілым канчаіцца.

Кашавічы, 1922.

№ 70.

Кыла таго садзіка—
Садзіка зялёнага,
Кыла тага церама—
Церама высокага,
Пралегла дарожанька
Дарожанька шырокая,

Па тэй дарожанькі
Йшлі три молайцы
У гу́сьлійкі іграюци,
Песянькі сьпіваюци.
Пачула дзяўчина
З высокага цераму.
Пыталася ў матушкі:
І ў роднага бацюшкі:
Дазволь мне, татынька,
На вуліцу гуляці,
Гу́сіляк паслухаці.
— Дурак, дурак,
— Дурак ніразумны!
— Тыя цябе гусількі
— Сьвядуць с ума́-ра́зуму
— Тыя цябе песянькі
— Сыстариюць мыладу.
„ Ніпраўду, мой татынька,
„ Ніпраўду гавориш.
„ Сьвядзець с ума̀-рòзуму
„ Бальшая заботынька,
„ Сыстариюць мыладу
„ Ўсё дробныі дзетунькі.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 191; М. I, 1, № 60. *Романовъ*, Б. С., II, на с. 384 № 132, *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 76 № 11, на с. 250 № 34, на с. 291 № 46, на с. 335 № 57.

№ 71.

Зырадзілась (Дунюша)
Йна ростым ні вяліка,
З парням гуляла,
З малойцикам мыладымі.
Маці сына пыбраніла,
Сыну рєци гыварила:
— Ах, ты, сыня, мой сынок!
— Любіць дзевык пірастань,
— Ты ат дзевушик атстань.
„Ах, ты, маці, мыя маць!
„Цяпе́р мне ні ўняць,
„Калі пайшоў я гуляць—
„Красных дзевык выбіраць".

(там сама).

Шейнъ, М., I, 1, № 545.

№ 72.

Як на мори, на ‘зярє
На студзёный, ны вадзе́,
Гусі-лебядзі сідзяць—

Клюцаву ваду муцяць.
Пыйшла дзеўка зы вадой,
Зы студзёный клюцавой,
Рызмахнула-пыцарпнула
І на плеци узіла́,
І на крутý гару ўзыйшла,
Зь ведзір вылілысь вада—
Зыгарєлысь лібіда.
А што гэта за пажар
Ні ярка гариць?
А што гэта за мілый
Ўзімку любіць—ўлетку не?

(там сама)

Гл. № 65.

№ 73.

Вясёлая бяседа, дзе мой мілый п'ець,
Ён п'ець, ядзе́ць за мной мыладой шлець.
А я мылада—мыладзёхынька замешкылыся,
На пташицку, на жыравацку загледзілыся,
А пташинька жыравыцка па берашку йшла,
Зялёную йна травушку сашчипывыла,
Клюцавую вадзіцу прихлёбывыла...
Па тым баку, за рєцушкый слабодушка жывець,
Ў тэй слабодушкі цатыри двари,
А ў тых дворикых цатыри ўдавы.
А кумышкі-галубышкі, падрушкі мае!
Куміціся, любіціся—любіця й мяне,
Вы пойдзіця і ў зялёный сад гуляць—вазьміця й мяне,
Вы сарвіцё пы цьвятоцку—сарвіця і мне,
Вы саўйіцё пы вяноцку—і зьвіцьця і мне,
Вы пойдзіця на Дунай раку—вазьміця й мяне,
Вы пусьсіця сваі вянкі—пусьсіця й мой,
Ваши вянкі—узьвéрх вады, а мой зытануў
Ваши друшкі з Масквы прийшлі, а майго нéтуці—
Ён сам ня йдзець, пісём ня шлець, бяз вéсьсі прапаў.

(там сама).

Романовъ, Б. С., I, на с. 115 № 37. *Добровольскій*, С. С., IV на с. 206 № 49.

№ 74.

Каму воля, каму волюшка гуляць?
Дзеўкам воля, дзеўкам волюшка гуляць.
Маладушкам мужыкі ні віляць,
Маладушкі тры прыводушкі:

Першая прыводушка—
Сьвёкар бацюшка журліў быў,
Другая прыводушка—
Сьвякроў матушка—разлучніца,
Трэцьця прыводушка—
Мужык п'яніца ніўдаліца
Набіў мяне бяз прычынушкі,
Што ня выдула лучынушкі;—
Я-ж малада спаць ні клалася,
Свайго шэльмы дажыдалася.

Плоскае, 1913.

Романовъ, Б. С., II, на с. 267 № 18.

№ 75.

Ты ідзеш гарбю, а я далінбю.
Людзі кажуць, што мы любімся з табою,
Людзі дзівіліся, як мы любіліся.
Ні дай, божа, растаціся—
Будуць людзі сьмеяціся.
Ёсьць у полі сілца—
Відна праз вакенца;
Як сойдзімся ды парадзімся,
Парадзімся, маё мілае сэрца.

(там сама).

№ 76.

Трбвушка, марбвушка зялёный лужок
Я-ж па табе, трбвушка, ні нахбжуся.
Каго верна люблю—ні нагляджуся;
Пайду я малада у яго стаянку,
Ў яго стаянцы няма коніка—
Няма коніка, нету воранца, нету й молайца:
Як пайду я малада ў яго камору,
Яго каморушка ключом замкнёна,
Яго пасьцелюшка пылам запала,
Яго падушачкі, як лёд сьцідзёны.
Пайду я молада у вішнёвый сат.
Ажна мой мілінькій шчыпліць вінаграт.
„Шчыплі, шчыплі, мілінькій, і мне і сабе.
—Атступ, атступ, міла, ня люба ты мне.
„Ці ведаіш, мілінькій, ці ўпрыцям табе,
„Як сізы галубы саліталіся—
„Тагды мы з тобой, мілінькій, распазналісі—
„Як сізы галубы разьліталіся—
„Тагды мы з табой, мілінькій, разлучалісі.

(там сама).

Булгаковскій, П. на с. 69 № 7.

№ 77.

„Травушка муравушка, зялёный лужок!
„Куды-щ ты паедзіш, мой мілый дружок?
—Паеду, паеду ў крайній уварок.
—У крайнім уварку дзеўка хараша,
—(Ганнýсячка) душачка, атчыні вароты!
„(Ванячка) дружок, ня ўрэмя маё!
„Ня ўрэмя маё-нішчасьця тваё.
„Па дваруў хаджу, касынку чашу, лентачку пляту,
—(Ганнусячка) душачка, хто табе ленту купіў?
„Першую лентачку бацюшка купіў,
„Другую лентачку мілый друг падарыў,
„Трэцьцю лентачку сама нажылá.

(там сама).

Романовъ, Б. С., I, на с. 150 № 117.

№ 78.

Ні літай, салавей, па зялёнаму саду,
Ні аббівай, салавей, маей раньняй расы,
Ні будзі, салавей, майго мілага дружка.
Я й сама пахаджу па й зялёнаму саду,
Я й сама абаб'ю сваю раньнію расу,
Я й сама пабужу свайго мілага дружка.

(там сама).

№ 79.

Па лужку хаджу па зялёнаму,
Там гуляіць бравóй малойчык,
Бравòй малойчык, мой сярдэчный друг,
А ў маім дружку—тры прыметушкі:
Першая прымета—бровы чорныі,
Другая прымета—русы кудзеркі,
Трэцьція прымета—мой бумажный плат,
Ні жаль мне платка—платок носіцца,
Ай, жаль мне дружка—дружок жэніцца,
Як ажэніцца, піраменіцца,
А мне маладзе робіць нечага
І любіць некага.

(там сама).

Щейнъ, Б. П., № 405. *Романовъ*, Б. С., II, на с. 424 № 167.

№ 80.

На гарэ сонейка—у даліні туман,
На маім сэрдыньку ўся жаль-расьпечаль.
Якая печалюшка?
Мілый проч пайшоў.
Запрагу каляску—еду ўсьлед за табой.
—Вярнісь, вярнісь, мілінькій,

—Будзім жыць с табой,
—А калі ня зьвернісься—чорт с табой.
(там сама).

№ 81.

Ні жаніўся-ж я—красата мая,
А жаніўся-ж я—сухата мая.
Уж і ўзяў жану ні па звычаю;
Ні па звычаю, ні па розуму.
Ох, ні біць жану, ні караць жаны,
Стаўшы біць жану—будзіць жа́ліцца,
А караць жану—будзіць скардзіцца.
А мне малайцу будзіць жаласна.
Ох, пайду молад я ў Керсон горад,
Ох, куплю молад малю́ван караб,
А ўсаджу жану ў малюван караб,
Ох, пушчу жану на быстру раку,
Ох, і сам пайду я па берашку,
Я й па берашку, я й па сухінькім;
Буду глядзець, як караб плывець,
Караб плывець, як сакол ляціць,
А жана сядзіць, як і барышня,
А мне-ж малайцу стала жалосна.
— Ой, вярнісь, вярнісь, малюван чало́н!
— А уж мне ў чаўне ні варочыцца
— З табой, мілінькій, жыць ня хочыцца.
(там сама).

Шейнъ, М. I, 1, № 492—497 укл. *Романовъ*, Б. С., I, на с. 21 № 39; II, на с. 401 № 163; VIII, с. 186. *Гильтебрандтъ*, С. П., XXXVII, CCXIV. *Сербовъ*, Б. С., с. 158. *Радченко*, Г. II., на с. 155 № 69. *Розенфельдъ*, Б. П., с. 50. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 319 № 26а-з. *Дембовецкій*, О. М. Г., I, на с. 584, № 13. *Д.-Запольскій*, П. П., на с. 130 № 556; гл. адменьнікі на с. 183. *Zienkiewicz*, P. G., с. 282. *Крачковскій*, Б. С., с. 14.

№ 82.

У майго татулькі ня люба дачка́,
Аддаў мяне татулька далёка замуж,
Прыказаў мне татулька ў госьсі ні хадзіць,
Ні была гадок, ні была другій,
На трэцьці гадок мусіла пайсьці.
Абярнуся малада шэрай зязюляй,
Палячу малада у вішнёвый сад,
Сяду малада ды й на вішанцы,
Аж мая мамулічка па двору ходзіць,
Па двору ходзіць, нявестушак-ластавак пабужаіць;
—Нявестушкі-ластаўкі, пара уставаць,
—Пара скацінушку у поля выпраўляць!
—Што на садочку за прыявачка?

—Шэрая зязюлічка ня вішні сядзіць,
—Аткуль йіна жаласныя прышты бярэць?
Ажна мой татушка па двару ходзіць,
Ў правай ручыцы стрэльбачку носіць,
„Дазволь, дазволь, маманька, гэту пташку забіць.
—Ні дазволю, дзіцятка—можа брат, сістра.
—Калі маё дзіцятка—хадзі ка мне ў двор;
—Калі шэрая зязюлька—ляці ў шчырый бор.
Паляцеўшы ў бары—бары ссушáю,
Паляцеўшы ў рэкі—рэкі утапляю,
Прыду да мамульцы—сьлёзкам увальлю.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 416, 419; М., I, 1, № 479—485 укл., с. 579. *Чубинскій*, Т., V, с. 747—751. *Шейнъ*, Русскія народныя пѣсни, с. 339. *Дмитріевъ*, С. П., с. 63-64. *Романовъ*, Б. С., I, на с. 51 № 101; II, с. 398. *Гильтебрандтъ*, С. П., № XIV, с XII—XIII, CLXXXI. *Радченко*, Г. П., на с. 185 № 133; на с. 179 № 118; на с. 205 № 175. *Розенфельдъ*, Б. П., на с. 15 № 20, на с. 49 № 67, на с. 66 № 17, на с. 68 № 19. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 338 № 66абв. *Булгаковскій*, П., на с. 121 № 18. *Косичъ* Л. Б., с. 72. *Zieńkiewicz* P G., на с. 186 № 3. *Малевичъ*, Б. П., на с. 112 № 12, на с. 136 № 45. *Романовъ*, М., II., на с. 109 № 96. *Карскій*, Б. П., XXI, № 83. *Киркоръ*, Э. в. В. на с. 219 № 35. *Носовичъ*, Б. П., на с. 265 № 6. *Czeczot, P. ш. N D.*, № XCIV. *Руберовскій*, „Виленскій Вѣстникъ“ 1867 г., № 75 (п. № 3), № 77 (п. № 18). Дембовецкій, О. М. Г., I, на с. 593 № 56 канец песьні параўн. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 345 № 81. *Д.-Запольскій*, П. П., на с. 96 № 473, на с, 92 № 461; не беларускія адменьнікі гл. ibideim на с. 177.

№ 83.

Зялёная лужа, ні шумі ты дужа!
У чужым краі ні задавай жалі.
Ніхто мяне ні шануіць—ні ацец, ні маць,
Ні родныі брацьця.
А мой мілый кролю, пусьці мяне к роду,
Я к свайму роду хуць пашыю роду[1]),
Адзелаю труну—ня ведаю каму.
Схавала-б я сьвёкра, сьвёкар ні ўміраіць;
Схавала-б я сьвякроў, зямля ні прымаіць;
Схавала-б я мужа, да жаль-жа дужа;
Схавалася-б сама, сама маладая,
Сама маладая—сьвету невідáя,
Яшчэ пабываю—сьвету павідаю.

(там сама).

№ 84.

Ай, ня сьпіцца, ні ляжыцца,
Ні сон мяне ні бярэць.
Пашоў-бы я ды дзяўчонкі,
Папрасіў-бы я таварыша,

[1]) Незразумелы выраз.

Ніхай мяне завядзець.
Таварыш—красівеня.
Ўбачыла дружка ва сне́,
Ачнулася, ўздыхнула,
Ачнулася, ўздыхнула,
Закіпела кроў ва мне.
Калі мяне любіш—
Сашлі ў сваю старонку,
Калі ня любіш—
Прастрэль белу грудзь маю.
Напішы-ж ты ўсё
Лісточык на табліцы на маёй,
А хто будзіць іці́,
Ехаць ўсякі па мне ўздыхнець,
А то бедна сірацінка
На чужой старане.

(там сама).

№ 85.

А на Старай Русі прыява стала,
Якая прыявушка? Красная дзяўчына дзіця радзіла,
Радзіўшы дзіцятухна на Дунай пусьціла,
Аж там рыбалоўнічкі рыбу лавілі;
Налавілі рыбушкі—ўлавілі дзіця.
Малога дзіцятушку на руках нясуць--
Красную дзяўчыну ў жалезах вядуць,
Малога дзіцятушка хаваць нясуць—
Красную дзяўчыну кнутава́ць вядуць.

(там сама).

Шейнъ, М., I, 1, № 423. *Розенфельдъ*, Б. П., № 1. *Добровольскій*; С. С., IV, на с. 510 № 27-абв. *Романовъ*, М. I, с. 144-145; II, с. 82, на с. 190 № 241. *Zieńkiewicz, P. G.*, с. 286. *Д.-Запольскій*, П. П. на с. 106 № 498 гл. адменьнікі ibidem на с. 178—180 укл.

№ 86.

На гарэ гарушкі тры палкі стаіць;
У першым палку коні зарзалі,
У другім палку шаблі брэжжалі,
У трэцьцім палку прыява стала.
Якая прыява, што брат брата забіў,
Забіўшы братца, сеў лісты пісаць,
Сеў лісты пісаць да матушкі слаць.
— Прыедзь, прыедзь, матушка, прыедзь да мяне
— Скажу табе, матушка, ўсю праўду сваю;
— Любіў, матушка, адну барышню,
— Насілі мы, матушка, адну хормушку,
— Ехалі мы, матушка, чыраз яе двор,
— Звалілася, матушка, шапачка далоў,

— Вялеў яму, матушка, шапачку падняць,
— А ён-жы мне, матушка, шапкі ні падаў,
— Я-ж яму, матушка, с плеч галоўку зьняў.
Пышуць, пышуць конікі цела візучы,
Кукуюць, кукуюць зязюлькі над йім літучы,
Плачуць, плачуць сястрыцы, за йім ідучы.
Ні пышыця, конікі, цела візучы,
Ні кукуйця, зязюлькі, над йім літучы,
Толькі сьпівайця, сястрыцы, за йім ідучы.

(там сама).

Шейнъ, М., I, 1, № 600—603 укл. *Романовъ*, Б. С., I, на с. 46 № 89, II, на с. 376 № 114; М., II, на 198 № 253. *Гильтебрандтъ*, С. П., XLIV. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 354 № 102.

№ 87.

Як у чыстым полі крутая гара.
На тэй-жа горушкі стаіць тры палка.
У вадным-жа паўку коні зарзалі,
А ў другім-жа паўку саблі брэжжалі,
А ў трэцьцім-жа паўку брат брата убіў.
Брат брата убіў—галоўку зрубіў.
Сам сеў на пасьсе́ль—стаў лісты пісаць,
Стаў лісты пісаць—маменькі атсылаць.
—Прыедзь, мамінка, сына хуваць.
Прыехала мамінька і стала ў яго пытаць:
„Як-жа ты, мой сынок, як-жа ты яго ўбіў?
—Ехалі мы, маменька, па нову масту,
—Скапыціўся воран конь на праву нагу,
—Звалілася, мамінька, шапка пухова́,
—„Падай мне, брацелка, шапку пухову!“
—А ён мне, мамінька, шапку ні даваць,
—А я яму, мамінька, галаву́ зьнімаць.
Заржалі конікі, цела візучы,
Плачыць мамінька, зза́ду ідучы.

Бабінічы, 1913.

Гл. № 86.

№ 88.

Ой, пайшла (Параска) на Дунай па ваду
Ох, лю-лі! Ох, лю-лі! [1])
Ой, (Якушка) папоў ён дагадлівый быў,—
Напярот забягаў, на бірашку́ прастаяў.
Узяў (Параску) пупярок жывата,
Ох, і кінуў (Параску) аб сырую зямлю.
Ох, пайшла (Параска) біз вадзіцы дамоў,

[1]) Паўтараецца пасьля кожнага радка.

Растрапаныя косы і падбітыя вочы.
Са вячора (Параска) расхварэлася,
Са паўночы (Параска) разнягожылася,
І пад белый сьвет перэставілася.
А ў нядзельку раненька і папы і дзякі
І ў акаломку зьвеняць,
Маладую (Парасачку) хаваці вязуць.
Во й (Якушка) папоў, ён дагадлівый быў,
Ён дагадлівый быў—напярот забягаў,
Напярот забягаў, на пàперэ прастаяў.
Ох, узяў (Параску) цалаваць, мілаваць:
— Прашчай, прашчай (Парасачка), прашчай, сэрца маё!
— А я-ж хацеў пашуціць—ні да сьмерці забіць,
— А ніхай-жа ні мне і нікаму, ні брахнейку майму.

Плоскае, 1913.

Дмитріевъ, С. П., с. 25-26; перадрук у *Шэйна,* М. I, 1, № 529. *Романовъ,* Б. С., I, на с. 107 № 21; VIII, с. 144.

№ 89.

У бяседзі два брацілкі сідяць.
Гаварылі пра жаніцьбу сваю:
—Ці ўдалася, брацішка, твая жаніціпка?
„Ні удалася мой, брацілка,
„Ні удалася мая жаніціпка.

Гарбачэва, 1913.

Романовъ, Б. С. II, на с. 401 № 163.

№ 90.

На горкі на гарушычкі
Стаіць горэнка новая, высокая.
А ў тэй горэнкі ўдовушка жывець,
А ў тэй удовушкі тры сыны-сакалы.
— Сыночкі маі, катораму ў салдаты йціць?
— У большага і жана і дзеці ёсь,
— У сярэдняга маладая жана ёсь,
— Ну, мой, сынок! Іціць сыну малому.
Пайшоў мой сынок, на чужую старонушку,
Служыў, мой сынок, цару-гасудару—
Служба маламу ціжала была.
— Ах, мая, мамка—радзіцілка!
— Спагубіла ты мяне малога
— Бяз сілішкі і бяз розуму.

(там сама).

Шэйнъ, М., I, 1, № 574. *Доброзольскій,* С. С., IV, на с. 542 № 7.

№ 91.

Ішла лотачка ракой,
А ў тэй лотачкі—тры малойчыкі
Тры малойчыкі—радныі брацішкі,
А вударыла валной—
Патапіліся усі тры брацішкі,
Стала плакаць маць радная.

(там сама).

№ 92.

Як вясной белый моладзец ходзіць,
Ён ходзіць, ложычык мосьціць...
Як зайшоў-жа ў аўраг кыла ракі,
Наступаіць цёмная ночынька—
Сумная молайцу ночынька.
Вось і лёд пыд нагамі—ложыка нетуці.
І ўзяўся ён хуць з лёдыньку масьціць:
Крыватынька зь лёду,
Падушычка з летащняга лісту,
Бел моладзец спаць кладзецца
І думаіць, што трэба богу пымаліцца.
Як узьняліся сы паўночы
Моцныя вятры, буйныя дажжы,
Як сырвалі са дуба макаўку
І убілі молайца ў падушку.
Як пачулі дзьве сястры і маці—
Абярнуліся на зязюлькі
І ляцелі ноч і дзень да белага молайца,
Па мхам ляцелі—імхі затапілі сьлёзкамі,
Па барам ляцелі—бары аглушылі гóласам,
Як прыляцелі—селі к беламу молайцу
Маці села на буйную галоўку
Сістра села на шпаркіі ношкі,
А другая на белыі ручкі—
А глянуць:
Жанка сядзіць на рацівом сэрцы—
Ні пачулі яны, як йіна прыляцела.

Арлоўка, 1915.

Гильтебрандтъ, С. П., CLXXV. *Шейнъ*, М., I, 1, № 378, *Романовъ*, Б. С. I, нас. 29 № 53; канец вершу параўн. з № 16 на с. 267 ibid., II. VIII, с. 149-150 *Шейнъ*, М., III, на с. 159 № 3. *Радчечко*, Г. П., на с. 39 № 9. *Мешлинскій*, Южнорусск. пѣсни. Кіевъ, 1854, с. 307. Канец параўн. з песьняй *Дабравольскага*, С. С. IV. на с. 122, № 81 а-г. на с. 364 № 111. *Zieńkiewicz*, P. G., с. 274. *Киркоръ*, Э. в. В., на с. 220 № 37. *Носовичъ* Б. П., на с. 258 № 44. *Czeczot*, P. w. N, Д., № XCVI. *Д.-Запольскій*, П. П., § 378-379 на с 168. *Янчукъ* П. М., № 64 ў на с. 112 гл. адменьнікі.

№ 93.

Вялíканьня ідзець — І тая цяшка.
Нечага надзець. — Адзін нысавок
Адна сярмяшка — І тот каротык.

Нікрапольле, запіс І. Маркава, 1914.

№ 94.

Як пайду я, дзе здаўно гуляла,
Ці ні найду—каго я кыхала
Хуць ні яго—хуць яго тыварыша.

Арлоўка, 1915.

Шейнъ, Б. П., № 393; М., I, 1, № 339. М., III, на с. 172 № 2. *Радченко*, Г. П., на с. 181 № 122. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 185. Замѣтки о западной части Гродненской губерніи („Этнографическій Сборникъ“, III, Спб. 1858, на с. 95 № 9). *Д.-Запольскій*, П. П., на с. 54 № 343.

Вялікодная песьня.

№ 95.

Кумà кýма ў гóсьсі ждала
у зялёный сад вішневый! [1])
Ў панядзелак муку сеяла,
У ваўторак ваду грэла,
У серадý пірагі ўчыняла,
А ў чэцьвір пірагі ўбівала
А ў пятніцу пірагі мясіла,
А ў суботу пірагі садзіла,
А ў нядзелю пірагі вымáла,
Прыехаў-жа кум на двор,
Кум-жа на двор да пірог на стол,
Стаў-жа кум да пірох крóіць.
— Ня дзівіся, мой кумочак,
— Лучыначка пагасілася—
— Целят з хвастом умясілася.

Плоскае, 1913.

Валачобныя песьні [2]).

№ 96.

Ліцéла пáва ды пéр'я рыняла.
Хрыстос васкрос на ўвесь сьвет! [3])
А сьлíчная панна (імя) пер'я пыдбірала
Ды ў рукавок клала,
З рукаўка бірá—вяночык плілá,
Сьплёўшы вяночык—пышла ў таночык;

[1]) Паўтараецца пасьля кожнага радка.
[2]) Гл. валачобныя песьні ў *Бяссонава*, К. П., VI, с. 37–39 укл.
[3]) Прыпеў паўтараецца пасьля кожнага радка.

Адкуль узяліся шу́ры ды бу́ры—буйны ветры,
Сырвалі вяночык—зьнясьлі у сіняе мора.
Ішла і пытаіць:
— Ці ня відзіў хто мой вяночык?
Адзін гаворыць:—я знаю,
А другій гаворыць:—я відзіў,
А трэцьцій гаворыць:—я ў руках трымаў,
— Аднаму дам шоўкаву хустку,
— А другому дам зылатой персьцінь,
— А трэцьціму дам правую ручку,
— А за правай ручанькай пайду
— І вяночык знайду.

Ужляціна, 1920.

Шейнъ, Б. П., № 160, 161, 163, 164; М. I, 1, № 152, *Романовъ*, Б. С., II, на с. 450 № 2; с. 456 № 11. VII, на с. 24 № 4. VIII, с. 119; 164—165, 170, 172, 176. *Радченко*, Г. П., на с. 118 № 22; на с. 89 № 82. *Безсоновъ*, Б. П., № 17, 18, 25—27, 115, 116. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 181 № 22-аб. *Косичъ*, Л. Б, с. 95. *Zicńkiewicz, P. G*, на с. 12 № 5. *Карскій*, Б. П., XII, на с. 134 № 18. *Дембовецкій*, О. М. Г., с. 504. *Д.-Запольскій*, П. П., на с. 41 № 309; на с. 45 № 317 гл. адменьнікі ibidem на с. 163, 164. *Мезерницкій*, Н. Т. П., I, на с. 84 № 9.

№ 97.

Валацэбніцкі, люді добриі,
Христос васкрос, сын божи![1])
Вылацыліся, абмацыліся.
Із го̀ду ў гот рас прибываюць,
Рас прибываюць, Христа ўзвеліцаюць.
Сьвятый Ягорья адеты быў,
Я ў полі быў, живацінку пас,
Я пас, запасаў, дамоў приганяў,
Дамоў приганяў—у хлеў зыгыняў,
У хлеў зыгыняў—зыкла́дыцкі зыклыдаў,
Зыкладыцка—рыбья шчёцка,
Пыдваротня—рыбья костка;
Зыкладыцкі зыклыдаў—хызяюшкі приказаў;
Хызяюшка—наша матушка!
Ідзі́-ка ў хлеў—пысматри-ка ты—
Сорык кароў цялілася,
Сорык быцкоў ныраділыся;
Сорык кабыл жэрабілыся,
Сорык жэрабцоў нараділыся,
Хызяюшка наша матушка!
Дари, ты нас, ні тамі ты нас!
Наши дары ні вялікі;

[1]) Пасьля кожнага радка паўтараецца.

Запевалы кусок сал,
Скамароху ришато гароху,
Спасіба таму, што ў етым даму́.

Крутае, 1920.

Шейнъ, Б. П., № 145. *Романовъ*, Б. С. VIII, с. 166. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 173 № 16. *Tyszkicwicz, W.*, с, 329—330.

№ 98.

Ня шум шуміць, ня гром гриміць,
Христос воскрос, сын бо́жи! [1])
Шумяць, гримяць валацобніцкі,
Валацобніцкі люді добриі, ні даку́тныі,
З года ў год рас прибываюць,
Христа ўзьвеліца́юць.
Хызяюшка, наша матушка,
Хызяін, наш бацюшка!
Ні дзяржи ты нас,
А дари ты нас,
Наши дари ні вялікіі:
Нацинальніцку пы дзісятацку,
Хто за йім пяець—таму пяць яец,
Хымяно́жи—кусок сала,
Хымяножи—горкая доля,
Хто ня хош дариць—
Хадзі з нам хадзіць.
Сьвятэй Ягорья па полю ходзіць,
Па полю ходзіць—кароў пасець,
Сьвятэй Мікола каней пасець,
Сьвятэй Ільля па межам ходзіць,
Па межам ходзіць—жита родзіць,
Што раз ризьнець—сноп нажнець,
Сноп ат снопа—паўтара ступня,
Ба́пка ат бапкі—паўтари шапкі,
Карагод ат карагоду—паўтари пераходы.

Дзейкаўшчына, 1919.

Шейнъ, Б. П, № 138, 141, 151. *Романовъ*, Б. С., II, с. 448 і далей.

№ 99.

А ці сьпіш ты ня малод, хазяін!
Зялёная елка кудрава! [2])
Устань раненька, вымыйся бяленька,
Вытрыся сухінька,
Вазьмі ліхтарок—схадзі у хлявок,

[1]) Паўтараецца пасьля кожнага радка.
[2]) Паўтараецца пасьля кожнага вершу; у слове „елка“ трэба чытаць „е“, а ня „ё“.

А ў тваім хляўку прыявачка ёсь,
Прыявачка прыявілася,
Сорак каровак ацялілася—
У кожным куточку па бычаночку,
А пасярэдзіны ўсё цялушачкі.

Косаўшчына, 1914.

Шейнъ, М. I, 1, № 147. *Безсоновъ*, Б. П., № 6, 7.
Гл. № 97.

№ 100.

Хрыстос,
Сын божый воскрос! [1])
Дзе хадзілі,
Дзе гулялі
Валачобнікі—
Сьвятая пасха
С красным яечкам,
С белым сырам
Прыздраўляіць.
Чалóм здароў, сам хазяін,
З малым сынам (імя)
На двор выхадзіў,
Гарэлку вынасіў.
І на закусачку
Сыр на талеркі.
Радаўніцка—ўсяму сьвету памашчніцка,
Бліны пякёць—куцьцю варыць
І дзядоў памінаіць.
Сьвятый Юрый кароў запасаіць,
У поля выганяіць,
Ягнят марозіць,
Сьвятый Барыс ляды паліць,
Ячмень пашыць,
Мікола па межах ходзіць,
Межы аглядаіць,
Жыта раўнуіць,
Вазьнясеньня колас выпушчаіць,
Тройца жыта красуіць,
Дзівятнік—наліваіць.
Іван траву пысьвящчаіць,
Пятро жыта сьпяліць,
А Ільля—зажынаіць
І ў копы шчытаіць.
Сьвятый Ільлюшка
Прынёс хлеба чыстую краюшку,

[1]) Паўтараецца пасьля кожнага радка.

А Йспас жыта пысьвяшчаіць.
Прачыстая ў зе́млю кідаіць,
Ян піраплоты кладзець.
Ме́ньшая ірыну́ зьбіраіць,
Узьдві́жаньня бульбу капаіць,
Буракі цігаіць.
Сьвятый Пакроў
У гу́мны прыбраў.

Забулдычына, 1914.

Шейнъ, Б. П, № 146. *Шпилевскій*, П., Волочебники, „Пантеонъ“, 1856, кн. III; песьня гэтая перадрукована ў *Шэйна*, М. I, 1, № 137. Гл. ibid. № 148, 150. *Безсоновъ*, Б. П., № 1—4 ўкл. *Tyszkiewicz*, O. P. B., с. 389. *Сербовъ*, Б. С., с. 137. *Носовичъ*, Б. П., с. 82—85 *Крачковскій*, Б. С., с. 108—110, *Бѣлановичъ*, с. 231.

Ягорскія песьні.

№ 101.

А на дварє дош ідець,
А мой мілый проц ідець,
А я музы́каў найму
Буду гуляць да сьвету
Ды да позьняга да ‘бе́ду.

Шаршні, 1915.

№ 102.

А што вісна́ принясла?
З кыриба́ жита вытрисла,
З пуні сена выніс[л]а;
Як пайду я к кувалю,
Як скую я сякі́ру,
Як высіку лядіну—
Запашу я пшаніцу;
А я ко́ня успушчу,
А я ко́ня сыймаю
Ды аброцьцю зыбратаю.

(там сама).

Шейнъ, М. I, 1, № 123. *Дмитріевъ*, С. П., с. 118. *Добровольскій*, С. С., IV, на с 95 № 35, 36-б. *Романовъ*, М., I, с. 118. *Носовичъ*, Б. П. на с. 80 № 2. *Бычко-Машко*, С. Н. П., № 10.

Мікольскія песьні.

№ 103.

Ку́мушкі пьюць і галубушкі пьюць,
Ой, люлі́-люлі́, галубушкі пьюць!
А мяне мыладу з сабой ні бяруць.
Ой, люлі́-люлі́, з сабой ні бяруць!
А я гару́ша адна баюся
Ой, люлі́-люлі́, адна баюся!

Шєрых ваўкоў і чорных валоў,
Ой, люлі́-люлі́, чорных валоў!
Шєрыі ваўкі зьядуць, а чорныі валы зыбадуць,
Ой, люлі́-люлі́, зыбадуць,

Дзейкаўшчына, 1919.

№ 104.

Ні ў піру была, ні ў пірушичкі,
Я ня мёд піла, а гарєлачку,
Я ні з ча́рачкі, а з вядзёрачкі;
Я па лесу йшла—ні быялыся,
Я па полю йшла—ні шиталыся,
Я дамоў прийшла—пышацілыся,
За ерєюшку зыхвацілыся,
Ерєя мыя ты тачоныя,
Ты тачоныя—зылачоныя...
. . . . . .

Крыжы, 1919.

№ 105.

Хадзіў (імя) пу парошкі,
Ён сьняжоцкі зьбіраць у камоцкі,
Ён кідаць, ён брысаць
У заднію сьсенку (імя дзяўчыны) на пасьсе́льку.
А (імя) ні ўтрывала,
Выйшла на крылецка,
Выйшла на крылецка
Атъявіла славецка:
— Ні парою (імя) ходзіш,
— Ня ўрэмім гуляіш.
— Прыдзі (імя) ўсё парою
— Віцэрняй зарою,
— Калі людзі ўсьпяцца.
— Майго бацькі бацюшка ў дарогі,
— А мой бацька ў дарогі,
— Матка ў бясе́дзі,
— А нявестка хуць і дома
— Я іе́ ні баюся—
— Ніска пыкланюся.

Кашавічы, 19 22.

Добровольскій, С. С., IV, на с. 366 № 115. *Малевичъ*, Б. П., на с. 66 № 32. *Никифоровскій*, Б. П., № 534, 658.

№ 106.

Як кыла выпадала белыя парошына
Па тэй парошыне ішоў (імя хлопца),
Харошый белый сьнег заграбаюцы,
У камоцкі сьціскаюцы,
Ў се́нкі мыхаюцы,

А ў зàньнюю сéнку (імя дзяуч.) ны пасьцельку.
— Выйдзі, (імя), на крылецка і скажы славецка.
Выйшла (імя) на крылецка—атказала славецка:
— Ні парою (імя) ходзіш,
— Ні ўрэмюшка гуляці,
— Прыдзі (імя) парою вяцэрнію зарою,
— Як людзі усьпяцца, сабакі уці́шацца;
— Майго бацькі дома нетуці,
— А матушка ў бясéдзі,
— А нявестка хуць і дома
— Я ні баюся—ніска пыкланюся. (там сама).

Гл. № 105.

№ 107.

Луцына, луцына бярозывая!
А што-ш ты, луцынушка, ні ярка гарыш,
Ні ярка гарыш, ня ўспыхіваіш?
А ці ты, луцынушка, у пецы ня была?
— Я была ў пецы,
— У пецы роўна тры нацы—
— Ліхая сьвякровушка вадой сушыла,
— Вадой сушыла мяне нявесту журыла.
(там сама).

РУСАЛЬНЫЯ ПЕСЬНІ

I.

Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне русальных песень і звычаяў.

Русальныя песьні запісаны ў такіх мясцовасьцях:

Парэцкі п.: без азначэньня воласьці і вёскі — 5 (Шейнъ, М., I, 1).

Полацкі п.: Забулдычына—1 (Шлюбскі).

Сураскі п.: Кашавічы—1 (Шлюбскі).

Звычаі і вераваньні адзначаны ў такіх мясцовасьцях:

Вяліскі п.: Вяліж (Шлюбскі). Дісьненскі п. (Дмитріевъ, С. П.). Лепельскі п., (Шейнъ, Б. П.) Парэцкі п., гл. нарыс: Русальная недѣля въ Порѣчскомъ уѣздѣ (Смоленскій Вѣстникъ, 1893, № 58),

Беларускія русальныя песьні і паданьні разглядаюцца акад. Карскім у яго досьледзе: „Бѣлорусы", III, 1, сс. 167—177 укл. ў разьдзеле:—„Русальная или зеленая недѣля. Сёмуха—Троицынъ день". І ў артыкуле Ал. Шлюбскага: „Русальніца". („Маладняк", Менск, 1926, № 9, стар. 88—102 ўкл.).

II.

Русальныя песьні.

Народ захаваў вельмі мала „Русальных“ песень і паданьняў, злучаных з „Русальнай нядзеляй“. Вяліскія мяшчане „Русальную нядзелю“ прыстасоўваюць да першага тыдню „Пятроўскага посту“. У гэты тыдзень, кожны дзень у поўдзень нібы русалка выходзіць з вады, каб схапіць і ўнесьці ў ваду дзіця, якое ці купаецца ў вадзе, ці знаходзіцца паблізу вады. Русалка гэта — прыгожая жанчына з русымі валасамі да зямлі, што праклята сваёй маткай і дзеля гэтага пасялілася ў вадзе. (Вяліж, 1919).

Ёсьць успаміны ў некаторых месцах аб вядомым звычаі завіваньня вянкоў у Русальны тыдзень. Але ў часе войн 1914-17 г.г. і першых гадоў рэволюцыі гэты звычай ня выконваўся.

№ 108.

Ў полі на папары кусты густы,
Лазарывый цьвет;
Пасьсе́ць дзеўка табун коняй
Та й заснула.
Яна й дум-паду́м:
Куды йсьці́ коняй шукаці?
Ісьці́ сьцежкай ці дарошкай?
Пайду мылада дарогай,
Дарогай шырокай.
На сустрэчу ей—тры двыраніны,
Тры двыраніны ўсё й мыладыі.
„Ці ня чулі, ці ня бачылі
„Маіх коняй варонінькіх?
— Атгыдай, дзеўка, што мы зыгадаім:
— Што бягіць бяз повыда?
— А што расьсе́ць бяз корыня?
— А што гарыць бяз полымя?
А дзеўка атказала:
— Расьсець камінь бяз корыня,
— Бягіць выда бяз повыда,

— Сажа гарыць бяз полымя,
„ Вумна, дзеўка, атгыдала,
„ А цяпер дзеўка пра коняй скажым:
„ Тваі коні на дуброві
„ Ядуць траўку ядомую
„ І п'юць ваду клюцавую.

Кашавічы, 1922.

Шейнъ, М. I, 1, № 177. *Романовъ*, Б. С., II, на с. 420 № 163; VIII, с. 169, 173, 522; М., I, с. 219. *Радченко*, Г. П., на с. 44 № 17. *Балакиревъ*, Сборн русск. нар. пѣс. № 33. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 153 № 137.-а—ж на с. 172 № 14. *Романовъ*, М., II, на с. 320 № 482. *Карскій*, Б. П., XXI, № 70. *Tyszkiewicz*, W., с. 328. *Д.-Запольскій*, П. П., на с. 40 № 306; не беларускія адменьнікі гл. ibidem на с. 163. *Мезерницкій*, Н. Т. П., I, на с. 87 № 13. *Радимичъ*, (Романовъ Е.). Кара въ сто лѣтъ. Витебскъ, 1894; сс. 10—12.

№ 109.

Як на берашку на круцінькім
Стаіць хатынька навюсінька,
А ў тэй хатынькі дубовый стол,
За тым сталом мыладый пісар.
Прыйшла дзеўка, прыйшла красна:
— Бог помач! мыладый пісар!
Бог помач дала ды й за парох пыйшла,
— Пастой, дзеўка, пастой красная
— Зыгадаю тры загадынькі.
— Загадаю разгадаю.
— А што расьсець бяз кораня?
— Што бяжыць бяз повада?
— Што ляціць бяз сізых крыл?
„ Расьсець камянь бяз кораня,
„ Бяжыць вада бяз повада
„ Ляціць вецір бяз сізых крыл.

Забулдычына, 1914.

Гл. № 108

КУПАЛЬСКІЯ ПЕСЬНІ

КУВАЛЬСКІЙ ПЕСЬБІ

I.

Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне купальскіх песень і звычаяў.

Купальскія песьні запісаны ў такіх мясцовасьцях:

Віцебскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—3 (Шейнъ, Б. П.), Бабінічы—3 (Шлюбскі), Барсукі—5 (тс), Бабініцкая воласьць—10 (Романовъ, Б. С., VIII), Белая Дуброва—4 (Шлюбскі), Васкавічы—1 (Шейнъ, Б. П.), Дервягі—3 (Романовъ, Б. С., VIII), Нікрапольле—4 (Шлюбскі), Пышнікі—1 (тс.), Сініцы—5 (Романовъ, Б. С., VIII), Шчэрбінская воласьць—1 (тс.), Ужляціна—1 (Шлюбскі), Хаершчына—1 (тс.).

У Бязсонава (Б. П.) 1 песьня азначана Віцебскай губэрняй.

Вяліскі п.: Будніца—6 (Романовъ, Б. С., VIII), Казакова—2 (тс.), Крутое—16 (Шлюбскі), Нівы—2 (тс), Сінякі—3 (тс.), Марацова—3 (тс.), Шаршні—8 (тс.), Узкае—3 (Романовъ, Б. С., VIII), Усьвяты—2 (Шейнъ, Б. П.).

Гарадоцкі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шейнъ, Б. П.), Мішневічы—5 (Романовъ, Б. С., VIII), Хвошно—4 (тс.).

Дзісьненскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Шейнъ, Б. П.)—7 (Крачковскій, Б. С.), Заулкі—4 (Романовъ, Б. С., VIII), Леанпольская воласьць—6 (Добровольскій, С. С., IV).

Лепельскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—4 (Czeczot, 1846),—13 (Шейнъ, Б. П.),—4 (Романовъ, Б. С.,VIII), Апанаскавічы—4 (Шейнъ, Б. П.), Бабч—1 (Шейнъ, М., I, 1), Дуброўкі—4+5 (Шейнъ, Б. П., М., I, 1). Косаўшчына—3 (Шлюбскі), Маделіна—4 (Шейнъ, М., I, 1), Сьвяды—1 (тс.), Скачых—3 (Шлюбскі), „Ушачскій округъ"—4 (Шейнъ, Б. П.), Чашнікі—11 (тс.).

Нова-аляксандраўскі п.: Браслаў—8 (Романовъ, Б. С., VIII).

Парэцкі п.: Барадзенская воласьць—3 (Шлюбскі), Інькава—2 (Добровольскій, С. С., IV).

Полацкі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1(Шейнъ, Б. П.) Арлоўка—9 (Шлюбскі), Забулдычына—2 (тс.), Іванова—1 (тс.), Гарбаценкі—3 (тс.), Пазьнякова—3 (тс.), Трахімёнкі—1 (тс.).

Себескі п.: па шляху з Себежа ў Люцын—5 (Анимелле, Б. Б. К.), без азначэньня валасьцей і вёсак—4 (Романовъ, Б. С., VIII), Далосцы—1 (тс.), Ільно—6 (тс.).

Сеньненскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—4 (Романовъ, Б. С., II), Зенькава—1 (тс.), Сьлідцы—2 (тс.), Плоскае—3 (Шлюбскі), Расна—1 (Романовъ, Б. С., I).

Сураскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Шейнъ, Б. П.), Казловічы—5 (тс.), Кашавічы—4 (Шлюбскі).

Апісаньні купальскіх звычаяў зроблены ў такіх мясцовасьцях: Аршанскі п. (Дембовецкій, О. М. Г.. I); Віцебскі п. і губ. (Романовъ, Б. С., VIII); Вяліскі п. (тс.), Крутое (Шлюбскі). Гарадоцкі п., Хвошна(Романовъ, VIII); Дзісьненскі п. (Крачковскій, Б. С.); Лепельскі п. (Шейнъ, Б. П.), Чашнікі (тс.), Бабч (Шейнъ, М., I, 1); Полацкі п.; Іванова (Шлюбскі), Межава (тс.); Себескі п.—па паштовым шляху з Себежа ў Люцын (Анимелле, Б. Б. К.); Сеньненскі п. (Романовъ, Б. С., VIII), Чудзькі (тс.); Сураскі п.: Кашавічы (Шлюбскі), Сураж (Шейнъ, Б. П.); Нова-аляксандраўскі п. (И. К. Этнографическіе очерки „Ковенскія губ. Вѣд.“ 1890, № 31—45.).

З агульных нарысаў па Віцебшчыне—мне вядомы нарыс Пшчолкі: „Что такое зёлки“? (Очерки изъ жизни бѣлорусской деревни, Витебскъ, 1899). Апісаньне купальскіх звычаяў і 1 песьню знаходзім у нарысе Баршчэўскага: „Szkic północnej Białejrusi“ (Szlachcic Zawalnia czyli Białoruś w fantastycznych apowiadaniach, Petersburg, 1844—1846). Памянёная праца Баршчэўскага мае і другія матар‘ялы, цікавыя для этнографа, якія будуць паказаны ў адпаведных аддзелах кнігі. Ня маючы на ўвазе сурова этнографічных мэт, аўтар не азначае месцаў запісу, але па некаторых жыцьцяпісных даных можна думаць, што этнографічныя нагляданьні Баршчэўскага адносяцца да заходняй часткі Віцебшчыны, да паветаў Полацкага, Невельскага, Гарадоцкага, Дрысенскага і Себескага; такую думку падмацоўвае тое, што аўтар родом з Мурагоў (Гарэцкі, Гісторыя беларускае літаратуры, Вільня, 1921, с. 64; Карскій, Бѣлорусы, III, 3, с. 46), якія ляжаць на рубяжы Полацкага, Невельскага і Себескага паветаў, і ў якіх ён праводзіў шмат часу, апрача гэтага, у працах Баршчэўскага ёсьць сасланьні на Дрысенскі павет (т. II, с. 6), на Полацкі павет (т. IV, с. 5), на Сітна (Гарадоцк. п.), тс., с. 5; аб знаёмстве аўтара з памянёнымі паветамі сьведчыць верш (у апавяданьні Rada, т. IV, с. 15) з памінаньнем такіх вазёр: Sitna, Hłubokaje, Skobryja, Szewina, Jazna, Nieszczydra, Niawiedra, Niewiel.

Агульна беларускае сьвяткаваньне Купалы і купальскія песьні разгледжаны акад. Е. Карскім у яго досьледзе: „Бѣлорусы“, III, в. I, стар. 177—196 ўкл.

II.

Купальскія звычаі.

Сьвята Купалы сьвяткавалася і сьвяткуецца вясковымі беларусамі да самых апошніх дзён, з тэй толькі розьніцай, што ў некаторых месцах паліліся кастры, а ў некаторых—украдзены ў яўрэя бачынак ці кола, прывязаныя да высокай жэрдзіны. Агульным звычаем для ўсіх разглядаяемых паветаў (б. паветы: Парэцкі, Полацкі, Віцебскі, Сеньненскі, Вяліскі) зьяўляецца зьбіраньне зёлак і кветак, а таксама і паленьне кастроў на пярэдадні Купалы.

У Сураскім павеце Купалу сустракалі так: дзяўчыны з песьнямі адпраўляюцца запальваць касьцёр, месца для кастра звычайна абіраецца на ростані; запальваецца касьцёр на зямлі разам і высака ў паветры кола, потым пад гукі гармонікі пачынаюцца скокі; пасьля ідуць апавяданьні пра калдуноў, ведзьмаў і наогул пра розныя страшэнныя зьявішчы, у якіх прыймала ўдзел нячыстая сіла; у момант, калі ўсе захоплены страшнымі апавяданьнямі, хто-небудзь пужае, што йдзе ведзьма,—агульная мітусьня. Праз некаторы час моладзь з песьнямі разыходзіцца па сваіх хатах. (Кашавічы, 1919).

У Вяліскім і Полацкім паветах Купалу сустракаюць некалькі інакш. Напярэдадні Купалы моладзь паліць лён. Адвечаркам паляць кастры, якія гараць да самай раніцы; кожны з прысутных павінен укінуць у вагонь што-небудзь сваё. А старыя на вёсцы раскладаюць маленькія кастры каля сваіх хат і пільнуюць да самай раніцы ведзьму і чараўнікоў, каб яны, абярнуўшыся ў жабу, ката ці каго-небудзь іншага, не папсавалі жывёліны. (Крутое, 1919; Межава, 1914).

У Вяліскім павеце гаспадыні павінны даваць дзяўчатам, якія варочаюцца раніцай ад кастра, „кулáгу"; кулага просіцца песьняй, якая сьпяваецца пад вакном дзяўчатамі:

Ласкава хазяйка, ці дасі кулагі?
Ў тваей кулагі пцолушкі бруялі;
Ласкава, хазяйка, дай нам яецка,
Ні дасі яецка—здохніць авецка...

калі гаспадыня кулагі не дае, то дзяўчаты дадаюць:

А ў тваей кулагі
Жабы квакталі.

Кулага тут-жа каля хаты зьядалася, а яйкі захоўваліся да Пятровага дня,—імі дзяўчаты плацілі на ігрышчы музыкам. (Крутое; 1919). У іншых-жа мясцох кастры не паліліся, а моладзь з запаленымі „каткámі“ і песьнямі абходзіла навакол жыта, і пакуль усё абойдуць—пачынаецца дзень. У час такіх абходаў характэрна песьня: „Выйдзі, ведзьма з жита“. (Гарадзец, 1919).

У „Йванаўскую“ ноч адначасна з „пáпарацьцю“ а 12 гадзіне ў ночы цьвіце „арэхава дрэва“. Калі арэхавую кветку адарваць і ісьці туды, куды яна будзе нахіляцца, то можна знайсьці клад. (Іванова, 1914). Калі гразь „у Пятроўку“, то „ўлетку“ будзе добры ўраджай. (Сінякі, 1919).

Песьні гэтага цыклю разам з усімі звычаямі завуцца: „купáлінка“ (Крутое), „я Купалку сьпяю“ (Лепельск. п.); працяг купальскіх песень „Пятровіца“, песьні, якія сьпяваюцца ў „Пятроўку“. (Вяліск. п., 1919).

III.

Тэксты купальскіх песень.

№ 110.

Іван, Мар'я! Іван, Мар'я!
Трєцьція купальня Іван, Мар'я!
Іван Мар'ю зваў на купальню,
Іван, Мар'я!
Хаді, Мар'я! хаді, Мар'я!
Са мной на купальню,
хаді Мар'я.
Купалінка, купалінка!
Ноцка малінька, купалінка!
Купалінка, купалінка!
Цёмная ноцка, купалінка!
Цёмная ноцка, цёмная ноцка!
А де твая доцка, цёмная ноцка?

Крутае, запіс Г. Даўгялы, 1919.

Czeczot, P. w N. D. 1846, № III; *Шейнъ,* М. I, 1, № 227—229. *Романовъ,* Б. С., VIII, с. 214; М., I, с. 139. *Добровольскій,* С. С., IV, на с. 217 № 5, *Носовичъ* Б. П., на с. 91 № 5. *Крачозскій,* Б. С., с. 132—133,

№ 111

Купалінька, ноц малінька ня высьпіься.
Мар'я Йвана гуляць звала:
Ступай Іван на вуліцу гуляць
Будім глядець, куды ведьма пойдіць,
— Ня йді, ведьма, ў наша жита,
— У нашим жиці сам бог ходіць,
— Ходіць, ходіць, жита родіць
— Кыласом кыласістае,
— А зярном зярністае.

Барадзеншчына, 1919.

Розенфельдъ, Б. П., на с. 90 № 67. *Дембовецкій,* О. М. Г., I, на с. 538 № 1.

№ 112.

Купалінка, купалінка, цёмная ноцка,
Цёмная ноцка, де твыя доцка?
Мыя доцка у садоцку—красыцкі рвець,
Красыцкі рвець—вяноцкі ўець,
Вяноцкі уець—ны галоўку кладець,
Зьвіўши вяноцик—пыйшла ў садоцик.
А ў садок ідя хвалілыся,
У садоцку выхвылялыся.
А мой вяноцик пярловінькій,
Ветрим ні схапіць—дожжим ні змациць.
Аткуль узяліся буйныя ветри,
Буйныя ветри—цастыі дожжикі
Схапілі вянок з буйный гылавы,
Унясьлі вянок у циста поля на сіня мора.
Пыйшла дяўцонка зыплакыўши.
Стрєла дяўцонка трох молыйцыў,
— А вы, молыйцы-мыладыі!
— Ці ня цувалі, ці ня відалі
— Пра мой вяноцік пярловінькій?
Адін кажиць: „мы ня цулі“,
Другі кажиць: „ня відалі“,
Трэцьці кажиць: „а што будіць?“
— Мы пыкажым твой вяноцик;
— У цистым полі, на сінім мори.
„ Аннаму дару(ю) русую касу,
„ Другому дару(ю) шаўковый платок,
„ Трєцьцяму дару(ю) зылато кальцо.
Адін скациў—па поіс змациўся—
Вінка ні схапіў.
Другій скациў—пы калена змациўся—
Вінка ні схапіў.
Трєцьцій скациў—ступня ні змациў—
Вяноцик схапіў.
— Етаму-ш дару русую касу,
— За русый касой я й сыма пайду.

Сінякі, 1919.

Гл. № 96.

№ 113.

На гарэ купарос рос,
А пад гарой чорт мальцаў
За хахол трос.
Трос, трос, тармасіў

Ды й па полю разнасіў,
У іх праўды дахадзіў.
Дахадзіў, дахадзіў—да й ні знайшоў,
Заплакаў ды й пайшоў.

Габраценкі, запіс Г. Гарбачэнка, 1920.

Шейнъ, Б. П., № 132; М, I, 1 № 242. *Рамановъ*, Б.. С, II, на с. 195 № 42, VIII, с. 220.

№ 114.

Іван, Іван да Мар'я,
А на гарэ купàльня,
А пад гарой купарос рос,
А чорт мальцаў за хахол трос,
— А, чэрці, мальцаў трасіця, трасіця
— Ды ў балота нясіця!

Гл. № 113. Іванова, 1914.

№ 115.

Як пайду я кыла жита,
Выйді, ведьма, з нашага жита,
Іді, ведьма, у (Альгоўскае).
А то мы цябе агнём сьпякём,
Агнём сьпякём, ружжом прабьём.

Сінякі, 1919.

Шейнъ, Б. П., с. 142, 268. *Крачковскій*, Б. С., с. 132.

№ 116.

Купальная ночка!
Вырві мальцу вочкі,
Каб ня тыі дзеўкі—
Вырвала-б я зрэнкі,
Каб ня тыі бабы—
Вырвала-б абадвы.

Гарбацёнкі, запіс Г. Гарбачэнка, 1921.

№ 117.

Купалінька, купалінька! ноч малінька,
Купалінька!
Купальныі ночы, вырві мальцам вочы,
Купалінька!
Купальныі рэчы, скульля мальцам ў плéчы,
Купалінька.

Ужляціна, 1920.

Безсоновъ, Б. П., № 57. *Zieńkiewicz P. G.*, на с. 180 № 2. *Быковскій*, К., с. 79. Гл. № 115.

№ 118.

А ў майго татýлькі тры сады зялёных,
Чацьвёртый вішнёвый.
У вадным садочку зязюлька кукуіць,
У другім садочку сылавей шчыбечыць,
У трэцьцім садочку канёчык гагочыць,
У чацьвёртым садочку (Мылáнычка) плачыць.
Зязюля кукувала—ў шчыр бòр пыляцела,
Сылавей шчыбітаў—ў лазу пыліцеў,
Канёчык гыгытаў—ны вайну паехуў,
(Мыланычка) плакала—ат таткі ўзялі,
Галоўку зьвізалі.

Барсукі, запіс П. Стэфкіна, 1921.

№ 119.

А на Купалу—
А на Купалу,
Рана сонца йграла—
Рана сонца йграла,
На добрыі годы—
На добрыі годы,
На цёплыі росы—
На цёплыі росы,
На хлéбы ўрыжаі—
На хлебы ўрыжаі.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 268.

№ 120.

А Іван-Купала!
Што ў цябе прыпала?
Штонікі прыпалі,
Дзевычкі укралі.
Мальчыкі дыгналі—
Штонікі атыбралі,

(там сама).

Никифоровскій, Б. П., № 714.

№ 121.

А чый-жа лён пыд балóтым,
Зарошшы ён ўвесь травою,
Увесь травою-лібядою,
Макрыцыю, пывіліцыю.
(Сямёнкін) лён пыд балотым,
Пыд балотым, ні палотый,
Зарошшы ён увесь травою,
Травою лібядою,
Макрыцыю, пывіліцыю.

(там сама).

№ 122.

Пірад Пятром пятым днем,
Разгуляўся сівый Юр'йіў конь,
Разьбіў камінь капытом.
У камяні ядра нетуці,
У мальчыкаў праўды нетуці;
Пірад Пятром пятым днём,
Разгуляўся сівый Юр'йіў конь,
Разьбіў арэх капытом.
У варэхі ядро ёсьць,
У дзевачык праўда ёсьць.

Скачыхі, 1921.

Czeczot, P. w. N. G. 1846. № III, VI. *Безсоновъ*, Б. П., № 35. *Романовъ* Б. С., VIII, с. 182, 193, 216. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 237 № 1. *Котылевъ*, на с. 58 № 5. *Носовичъ*, Б. П., с. 80—81 *Крачковскій*, Б. С. с. 131—132.

№ 123.

Пірад Пятром пятым днём
Разгуляўся Юр'йіў конь.
Разгуляўся Юр'йіў конь,
Разьбіў камінь капытом.
А ў камні ядра нет,
А ў мальчыкаў праўды нет.
Такая праўда, як у зімку сонца
Хуць яно ясна, алі яно халодна.
Пірад Пятром пятым днём
Разгуляўся Юр'йіў конь.
Разгуляўся Юр'йіў конь,
Разьбіу арэх капытом.
У варэхі ядро ёсьць—
У дзевачак праўда ёсьць.
Такая праўдынька, як ўлетку сонейка,
Хуць яно цёмнінька, але яно цёплінька.

Косаўшчына, 1914.

Гл. № 122.

№ 124.

На сьвятога Йвана
Дзеўкі зёлкі зьбіралі
Ды цáру атаслалі,
А цар зёлык ні пазнаў—
Ўзяў царыцы атаслаў.
Царыца пазнала,

Ца́ра дурням назвала:
Ета зёлкі купа́лкі—
Дзявоцкая красата.

Скачыхі, 1921.

Шейнъ, Б. П., № 227, *Безсоновъ*, Б. П., № 79, *Карскій*, Б. П. XII, на ст. 128 № 5.

№ 125.

А на гарэ карыта
Поўна вадой наліта,
Дзеўкі ношкі памылі,
А мальчыкі выпілі —
Яны думалі, што сыці́ца.
На гарэ карыта
Поўна медам наліта.
Пчолкі ношкі памылі,
А дзевачкі выпілі.

(там сама).

Дмитріевъ, С. П., с. 136—137. *Романовъ*, Б. С., VIII с. 188, 567. *Никифоровскій*, Б. П., № 474.

№ 126.

На гарэ, на красе стыяла карыта,
Там стыяла карыта—поўна вадой наліта,
Там дзевачкі хадзілі, ручкі-ношкі памылі,
Там мальчыкі хадзілі, тую ваду папілі.

Гл. № 125

Арлоўка, 1914.

№ 127.

„Арол, божжа птушка!
„Высока літаіш, далёка буваіш,
„Дзе што чуў, дзе што бачыў?
— Я чуў, я бачыў:
— Бог піва варыць,
— Ільля гарэлку курыць,
— Бог сына жэніць,
— Ільля дацку аддаець.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 230; М. I, 1, № 254. *Дмитріевъ*, С. П., с. 230. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 191—192, 253, 368, 405, 226. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 198 № 296, на с. 206 № 47. *Дембовецкій*, О. М. Г.. I, на с. 537 № 23.

№ 128.

Арол божжа пташка.
Арол божжа пташка
Высока літаіць.
Высока літаіць,

У бога буваіць.
У бога буваіць,
Усё ён знаіць.
Усё ён знаіць,
Што бог парабляіць.
Што бог парабляіць —
Сам бог піва варыць.
Сам бог піва варыць —
Сам бог сына жэніць,
Сам бог сына жэніць,
Ільля дачку аддаець.
Ільля дачку аддаець —
Сам бог у радасьсі,
Сам бог у радасьсі,
А Ільля са смутасьсю,
А Ільля са смутасьсю.

Гл. № 127. Гарбацёнкі, запіс Г. Гарбачэнка, 1921.

№ 129.

Арол бож'я пташка
Літаў пыд нябёс,
Бачыў дзівóса:
Сам бог сына жэніць,
Ільля дачку аддаець,
Сам бог піва варыць,
Ільля пірагі пякець.

Гл. № 127, 128. Забулдычына, 1914.

№ 130.

Сягодні Купала, заўтра Іван;
Будзіць, мальцы, ліха вам:
Пагонюць кошык у поля;
Кошкі на елку скакалі,
А мальцы на дзевак брахалі.

Белая Дуброва, 1914.

Безсоновъ, Б. П., № 45, 59. *Сербовъ*, Б. С., на с. 143 № IV. *Романовъ*, VIII, с. 216, 221, 224. *Federowski, L. B.*, I, № 1775 § 1. *Малевичъ*, Б. П., на с. 163 № 36.

№ 131.

Сягодні Купала, заўтра Йван;
Будзіць ліха, мальцы, вам:
Пагоніця кошык у поля;
А кошкі гізуваць,
А мальчыкі даганяць,

А кошкі на лясок,
Адна кошка падласа —
Мальцоўская пакраса,
Другая шэрка —
Мальцоўская пабелка.

Гл. № 130. Арлоўка, 1914.

№ 132.

А на гарє рос, рос купарос,
А наших мальциў чорт патрос.
Ён і трос, трос, кылаціў
На бок морду звыраціў.
Сягоньні Купала, а заўтра Іван;
Будіць, мальцы, худа вам:
Пагоніця кошик у поля;
Кошкі на ёлку скыкаць,
Мальцы на кошик брихаць.
— Лéсься, кошкі, з ёлкі далоў,
— Пагонім кошик вас дамоў.
— Будім кошик даіць
— Ды деўкам кашу вариць,
— Еш-ша, деўкі, ня плюйця,
— Ліжиця лыжкі ды ня блюйця.

Гл. №№ 130, 131. Шаршні, 1915.

№ 133.

— Купала, Купала, дзе прубувала?
— У (Кузьме) на дварочку.
Усі дзеўкі ў таночку —
Аднэй рожы нет
І ні рожынай маці,
Рожа дачку чэшыць,
Чэшыць, навучаіць:
— Ражутка дачушка,
— Ня стой (Кузьма) блізка—
— (Кузьма) цябе зрáдзіць
— І на ношку ступаіць,
— За ручку хватаіць.
Йіна вочкам міргаіць.

Белая Дуброва, 1914.

Шейнъ, М., I. 1, № 232, 233, 408, 409; Б. П. № 130; 129; III, с. 158—159. *Дмитріевъ*, С. П., с. 112—113. *Романовъ*, Б. С., П, на с. 418 № 160; VIII, с. 193, 220—221.

№ 134.

(Іван) маладой!
Ня стой над вадой,
Ні махай рукой

Ня быць за табой,
А быць за (Кузьмой).
(Кузьма) на дварочку,
Ўсім дзеўкам браточку,
Толькі рожы нет,
І рожынай дачкі нет.
— Ня стой с (Кузьмой) у попліч,
— (Кузьма) цябе страціць,
— На ножаньку станіць,
— За ручку пацісьніць.

Арлоўка, 1914.

Гл. № 133.

№ 135.

Купалінька, цёмная ноцка,
Де твая доцка?
Мыя доцка ўець вяноцкі,
Мыя доцка пыйшла у садоцку,
А за ёй мамка у сьлядоцку,
Рожу мамка біла,
На ўлку ні пусьціла.
— Ня йді, шэльма, на ўлку—
— Любоўнік спыдманіць;
Сястрицы—ражўткі,
Гэта твой (Кузёмка)
На ножку ступаіць,
За руцку хвытаіць.

Шаршні, 1915.

Гл. №№ 133, 134.

№ 136.

У (Кузьмы) на дварочку
Ўсё дзеўкі ў радочку,
Аднэй рожы нет.
Аднэй рожы нет
І рожанай маці,
Маці рожу чэшыць,
Чэшыць, навучаіць:
— Ражутка—дачушка!
— Ня стой з (Кузьмой) ў поплеч!
— Кузьма цябе зманіць,
— На ножаньку станіць.
Кузьма дагадаўся,
Пайшоў ды прыбраўся

У жаноцкае плацьця,
У дзявоцкіі йстужкі;
Тады рожа ні спазнала,
С (Кузьмом) поплеч стала,
(Кузьма) рожу зманіў—
На ножаньку ступіў,
За ручаньку сьціснуў,
За мéдзеный пальчык;
Ня ждзí маці дачку,
Ня ждзі ў вяночку—
А ждзі у платочку;
Ня ждзі з белым сырам,
А ждзі з малым сынам.

Пазьнякова, запіс Г. Гарбачэнка, 1920.

Гл. № 133-135.

№ 137.

А на Івана сонца йграла,
На Іванўўскім калóдзізі
Дзеўка ваду брала ды ўтанула.
Злоты, срэбры пытапіла
Ходзіць, сочыць яе мачыха:
— Жаль-жы мне злота, срэбра,
— А ні жаль-жы мне пáчэркі сваей:
— Пачэрка мне яшчо будзіць,
— А злóта, срэбра ні спадзяéцца.
А на Івана сонца йграла,
А на Іванўўскім калодзізі
Дзеўка ваду брала.
Ваду брала ды ўтанула,
Злота, срэбра пытапіла,
А сочыць, сочыць мамынька яе:
— Ні жаль-жа мне злота, срэбра,
— А жаль-жа мне дачкі сваей.
— Злота, срэбра яшчэ будзіць,
— А дачкі яшчо ня будзіць.

Белая Дуброва, 1914.

Шейнъ, М. I, 1, № 234, 235. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 218, 219. *Косичъ*, Б. Л., с. 58. *Zieńkiewicz*, P. *G.*, на с. 194 № 6.

№ 138.

І на Йвана сонца йграла,
А дзеўка мáла—ваду брала,
І браўшы ваду—патанула,
Утануўшы, спанырнула.
А пашлі весьці да мачыхі—

Мачыха атказала:
—Ні жаль-жа мне дачулічкі,
—А жаль-жа мне кашулінькі;
—Дачулінька ні гадувана,
—А кашулінька вышывана.

Гл. № 137. Хаершчына, 1913.

№ 139.

Купальненькая ноч малінька!
А я ночку ні спала—вышывала;
Каб я знала, што старому—
Вышыла-б я крапівай,
Выстрачила-б я жыгучкай,
Купальская ночка маленька!
Каб я знала, што маладому вышывала—
Вышыла-б я чорным шоўкам,
А выстрачыла-б жоўтым цьветам.

Пазьнякова, 1920.

№ 140.

Купалінька ноч малінька!
Хуць малінька ды ўдалінька,
Я ўсю ночку ні спала —
Шарыначку вышывала.
Штоб я знала, што старому—
Вышыла-б я крапіўкай і жыгліўкай.
Купалінька ноч малінька
Хуць малінька ды ўдалінька.
Я ўсю ночку ні спала —
Шарыначку вышывала.
Што-б я знала, што мыладому,
Вышыла-б я чорным шоўкам,
Мала шоўку—прыкупіла-б.

Белая Дуброва, 1914.

Шейнъ, М. I, 1, № 204. Гл. № 139.

№ 141.

Кругом майго полю
Кругом ягад многа.
Я туды ранюсінька хадзіла,
Ягадкі зьбірала,
Сьпелыі ў жменьку,
Зялёнушкі ў пыдалок;
Сьпелыі мамкі,
Зялёнушкі сьвякроўкі.

Арлоўка, 1914.

Шейнъ, Б. П., № 258, 259. *Безсоновъ*, Б. П., № 44. *Шейнъ*, М., I, 2, на с. 66 № 115. *Романовъ*, М., I, с. 118.

№ 142.

— Купала, Купала, дзе ты прубываў?
„У новым гарадочку таргі таргаваў;
„Сьвякроў прадавая—мамку выкупляя,
„Сьвякроў за тры грошы,
„Мамку за сто рублей.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 261. *Дмитріевъ,* С. П., с. 231. *Радченко,* Г. П., на с. 27 № 73; на с. 28 № 76. *Добровольскій,* С. С., IV, на с. 242 № 10. *Романовъ,* М., I, с. 139.

№ 143.

Як у летку на Купалу
Ішлі дзеўкі табуном,
Пілі́ мядок стаўбуном;
Ішлі мальцы мяжой,
Пілі дзёгаць дзяжой.

(там сама).

№ 144.

Як на гарэ, на красе
Стаяла царкоўка,
На царкоўкі ма́каўка,
А на ма́каўкі вяночык,
А на вяночку цьвяточык,
А на цьвяточку красачка,
А на красачкі пташачка.
Сядзіць йіна высока—
Чуіць, бачыць далёка.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 247. *Романовъ,* Б. С., VII, на с. 28 № 11. *Добровольскій,* С. С., IV, на с. 124 № 82-абв. *Мезерницкій,* Н. Т. П., I, на с. 82 № 5.

№ 145.

Мар'я Івана ў жыта гуляць звала:
— Хадзі, Ванька, ў жыта гуляць,
— Чыё жыта лапушыстае, караністае?
Ванька казаў:—маё жыта.
— Ня трэба таптаць маё жыта.

(там сама).

№ 146.

Чарвоная рожа!
Ня стой при дарозі.
Хто йдець—тэй лымаіць:
Бабы йдуць—лымаюць,

Дяды йдуць—лымаюць,
І мальцы йдуць—лымаюць,
І дзеўкі йдуць—лымаюць.
Бабам на прутоцкі,
Дедам на кіёцкі,
А мальцам на брилёцкі,
А дзеўкам на вяноцкі.

Шаршні, 1915.

Романовъ, Б. С., VIII, с. 192, 217, 225.

№ 147.

Пайду ў поля, пугуляю,
Приду к рєцки кы Дунаю,
Падумаю, пыгадаю,
А мой татка, сылавейка,
Цамў ка мне ў госьсі ня ходіш?
А як-жы мне ў госьсі хадіць,
Зімой діця за сьнігамі,
А ў летку за выдамі,
Зімой діця у вазоцку
Ды ў новінькім кузыроцкў,
А ў летку у цалонацку
Ды ў белінькім нысавоцку.

(там сама).

Добровольскій, С. С., IV, на с. 102 № 43-бв. *Киркоръ,* Э. в В., на с. 211 № 19. *Носозичъ,* Б. П., на с. 230 № 173. *Czeczot,* P. w. N. Д., № XLIX.

№ 148.

Плулі, плулі гаголушкі галовушкі супроціў вады,
Цяжка плыці, цяжка плыці супроціў вады;
Худа жиці з худым мужиком,—
Нетуці ні рады, ні пара́ды, ні гаворушик.
Плулі, плулі гаголушкі уніз пы вады.
Лёгка плыці, лёгка плыці уніз пы вады;
Добра жиці з добрим мужуком,—
Ёсь і рада і парада, і гаворушкі *).

(там сама).

№ 149.

Ты каліна, я маліна,
Ня стой-ка ты над ракой,
Ні раўняйсь-ка ты са мной,
Як я была у девушках,

---

[1]) Песьня „ўмéсная": купальная і абжынская.

Ды ў роднага у та́тушкі—
Бялей была твайго цьвету,
Пригажэй была тваіх ягыт.
Дысталася ку́раві сыну—
Ссушиў мяне, як былінку,
Сызнабіў мяне, як ліпінку.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 293. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 160. *Радченко*, Г. П. на с. 99. № 127.

№ 150.

Як пу бару па ве́расу
Там бег, прабег, вароный конь,
Ўздагон кыня (Аста́шка),
А на сустрэцу (Даруня).
— Душа мая, (Дарутушка),
— Сымай кыня выранога.
„Ай-пан-жи мой, (Асташинька),
„Я-ж бы й рада кыня сыймаць,
„Ды баюся роднага таты,
„І ныраўлюся родный мамы,
— Душа мая, (Дарутушка),
— Ты ня бойся роднага таткі,
— Ні ныравісь родный мамкі,
— Толькі і бойся госпада бога,
— Госпада бога—мяне мыладога,
— Кнута римянога.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 281, дадатак № 62. *Романовъ*, Б. С., II. на с. 341. № 13, на с. 357 № 87; VIII, с. 178, 223, 225. *Добровольскій*, С. С., II, № 631. *Анимелле*, Б. Б. К., IX, с. 108. *Мезерницкій*, Н. Т. П., 1910, I, на с. 90 № 2.

№ 151.

Я молада ня ведала,
Калі лета прагуляла.
Маць на вулку ні пускала
І ў каморы запірала.
А ў каморы вакошычка,
Аш мой мілый у танок ідзець,
С сабой карагод дзевак вядзець,
А мне моладзе жалка стала,
Я молада клясьці стала—
Кап ты ў танку́ ні хадзіў
І вяночка ні знасіў.

Плоскае, 1915.

Шейнъ, Б. П., № 239. *Радченко*, Г. П., на с. 2 № 5. *Чубинскій*, Т. III, на с. 134 № 33. *Янчукъ*, П. М., № 58. *Безсоновъ*, Б. П., на с. 56 № 99, на с. 157 № 170.

№ 152.

Зялёная лібіда!
А дзе цябе садзіці?
Ці ў гародзі на мяжэ?
Ці ў капуснай баразьне?
— Дзе хочыця садзіця
— Толькі мяне палійця,
Маладая дзяўчонка!
А дзе цябе садзіці?
Ці ў татухны на куце?
Ці ў мальчышкі на руцэ?
— Дзе хочыця садзіця,
— Толькі цьвяты ня трыця.

Пазьнякова, 1920.

Романовъ, Б. С., VIII, с. 224, 225.

№ 153.

Купалінка, цёмна ноцка!
А й дзе твыя большыя дочка?
— Мыя дочка у садочку,
— У садочку рожу поліць, ручкі коліць,
— Цьвяточкі ірвець, вяночкі ўець.
— Большым дзеўкам пы вяночку,
— А малінькім пы цьвяточку,
— К сьвятому дню, ўсе к Пятру,
— А ў цэркаўку—богу маліцца.

Барсукі, запіс П. Стэфкіна, 1921.

Шейнъ, Б. П., № 225, 226; М. I, № 236. *Безсоновъ*, Б. П., № 51, 65 67. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 218, 221, 223. *Розенфельдъ*, Б. П., с. 51. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 218 № 10. *Анимелле*, Б. Б. К., т, IX, с, 107. *Носовичъ*, Б. П., на с. 91 № 6, *Czeczot*, P. w. N. D., № III, *Киркоръ*, С. Я., с. 264.

№ 154.

— Купалінка, ноц малінька,
— А дзе твыя дыцка?
„Мыя дыцка у гародзі
„Лéхі поліць—рукі коліць.

Гл. № 153. Кашавічы, 1922.

№ 155.

— Купалінька, цёмная ноцка!
— Цёмная ноцка, а дзе твыя доцка?
„У гароді гряды пóліць,
„Гряды поліць—рукі коліць,
„Красацкі ірвець—вяноцкі пляцець;

Зьвіўшы вянок, пыйшла у садок,
Ў тым садку день гуляла—
Вянок пыціра́ла.

Гл. № 153, 154. Крутае, 1920.

№ 156.

—Купалінка, цёмная ноцка!
—А де твыя доцка?
„Мыя доцка ў садоцку
„Гряды поліць,
„Кветкі рвець,
„Вяноцкі ўець.
„Што кветку атарвець—
„Вянок саўець,
„Што кветку атарвець—
„Другій саўець.
„Першый вянок (Марютунькі),
„Другій вянок (Іванунькі).

Гл. № 153—155. Нівы, 1920.

№ 157.

Купалачка, дзе мая дачка?
— У гародзі на пагодзі лянок по́ліць,
— Йіна поліць, ручкі коліць,
— Вянкі віла з пувяліцамі,
— Чапцы шыла з макрыцамі.

Гл. № 153—156. Арлоўка, 1915.

№ 158.

Цуру́ ведьма, цуру́ ведьма!
Ў маім жиці, цуру́ ведьма!
Маё жита, маё жита,
Пысьвяшчона маё жита;
Ў маім жиці, ў маім жиці
Сам бог сядіць, сам бог сядіць.
Сам бог сядіць, сам бог сядіць,
Жита родіць, жита родіць,
Саломінка, саломінка,
Как тросцыцка—саломінка;
Кыласоцык, кыласоцык,
Как брусоцык, как брусоцык;
Зяронушка, зяронушка зь вядёрушка
Зяронушка!

Крутае, запіс Г. Даўгялы. 1919.

Шейнъ, М. 1, 1; № 252.

№ 159.

Васіля мой баровінькій!
Калі ты рос, калі вырас?
У чэцьвяр цябе я сеяла,
У пятніцу палівала,
А ў суботу сашчипывала,
А ў няделю вянок віла,
Віўшы вянок, пыйшла ў тынок,
На мне вянок вяніць, вяніць,
Мілага сэрца ныіць, ныіць,
На мне вянок зілянеіць—
Мілага сэрца вісялеіць.

Барадзеншчына, 1919.

Шейнъ, Б. П., № 234.

№ 160.

Праз садок зялёнінькій
Прабег коня варонінькій,
На коніцку сядёлушка,
А на сядельцу стрямёнушка.
На сядельцы друг маладец (імя),
Ў пагонь бяжиць красна деўка:
— Ай, стой, пастой, друг-мыладец,
— Скажу табе ўсю праўдыньку, ўсю верную:
— У нас у Пятроў пост Дунай замёрз,
— А ў Піліпаў пост рожа цьвіла,
— Рожа цьвіла—рєка ні цікла.
„Не праўдынька, красна деўка!
„Я й сам там быў, каня паіў,
„Мой конь піў—капытом лёд біў
„Разьбіў камянь бялёшинькій,
„А ў тым камні агня нетуці
„У краснай деўкі праўды нетуці.

(там сама).

Романовъ, Б. П,, VIII, с. 223. *Быковскій*, С. О. с. 75.
Гл. русальныя песьні №№ 108, 109.

№ 161.

Ні матка гэта—тытарка,—
Пыслала дацку скрозь ноц,
Прывыжатыга ні дала,
Ярый сьвецы ні зажгла.

Кашавічы, 1922,

№ 162.

Купалінка, ноц малінька,
Праснулась—коней нетуці.

(там сама).

№ 163.

Купала, Купала!
Сем девак прапала.
А сем мальцыў прибыло
І тых надуло.

Крутае, 1919.

Романовъ, Б. С., VIII, с. 221.

№ 164.

Было ў Купалачкі да тры дачкі:
Адна была бела-румяна,
А другая была тонка-высока,
Трэцьця была раба-гырбата.
Бела-румяна—за паповіча,
Тонка-высока—за дзяковіча,
Раба-гырбата—за кралевіча.
Бела-румяна йіна змыіцца,
Тонка-высока піраломіцца,
Раба-гырбата жывець багата.

Плоскае, 1913.

Шейнъ, Б. П., № 219, 220. *Метлинскій*, Сборникъ народныхъ южнорусскихъ пѣсенъ, с. 311. *Романовъ*, Б. С., II, на с. 276 № 2; VIII, с. 214. *Розенфельдъ*, Б. П., с. 33. *Бѣлановичъ*, с. 225.

№ 165.

Загарєўся на гарє паньській двор,
Ідіця, мальцы, гасіця,
Ў рєшатах ваду насіця.
Як у рєшаці вады нétуці—
Так у наших мальцыў праўды нетуці.
Загарєўся на гарэ паньській двор,
Ідіця, деўкі, гасіця,
У вёдрах ваду насіця.
Як у вёдрах вада ёсь —
Так у наших деўках праўда ёсь.

Сінякі, 1919.

Шейнъ, Б. П., № 256; М. 1, 1, № 244. *Безсоновъ*, Б. П., № 85. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 148, 188, 228. *Добровольскій*, С. С., IV на с. 215 № 2аб. *Federowski, L. B.*, I, № 1775 § 3. *Романовъ*, М., I, с. 137, 141. *Малевичъ*, Б. П., на с. 29 № 3. *Носовичъ*, Б. П., на с. 89 № 3.

№ 166.

Іван, Іван, бра́ціт мой!
Загарэўся порым твой.
Пайшлі мальчыкі гасіць—
Рышатом ваду насіць,

Ў рэшаці вады нетуці,
У мальчыкаў праўды нетуці.
Іван, Іван браціт мой!
Загарэўся порым твой.
Пайшлі дзевачкі гасіць—
Вядром ваду насіць.
У вядрэ вада ёсьць,
У дзевачак праўда ёсьць.

Гл. № 165. Косаўшчына, 1914.

№ 167.

Пушчу каня ва ‘гарот,
Сама сяду длі варот.
Ня есь кося травіцу,
Ня есь кося красачкі —
Сінінькія васількі.

(там сама).

Пятроўкі.

№ 168.

А я дзеўка добрая (імя) [1])
Бацькі багатага,
Мой бацька—ясный месяц,
Мая маці—красная сонейка,
Маі браты—ў саду салавейкі,
Маі сёстры—ў жыці пірапёлкі;
Ясный месяц ўсю ноч сьвеціць,
Красная сонейка ўвесь дзень грэіць,
Ў саду салавейка ўсей дзень сьпяваіць,
Ў жыці пірапёлкі—жыта падбіраюць.

Бабінічы, 1913.

№ 169.

А хто ў нас стралец—баец?
(імя) [2]) ў нас стралец—баец.
Забіў сароку сярот току,
Забіў другую пыд крылую,
Забіў трэцьцю пыт клецьцю.
Ныдраў лою з-пыт крылою,
Хай гэты лой да маей свадзібкі,
Да маей свадзібкі дарагім гысьсям,
Дарагім гысьсям—цёшчы з цёсьцям.

(там сама).

Романовъ, Б. С., VIII, с. 220.

[1]) Імя дзяўчыны, якая выходзіць замуж.
[2]) Імя хлопца, які жэніцца.

№ 170.

А хто ў нас мыладэй стралец?
(імя) мыладэй стралец!
Забіў сароку сярот току,
Выдраў лою пыт крилою,
Ныдраў сала аткуль ссáла,
Пусь éтый лой к маей свадьбі,
Кашу масьліць лю́бым гасьсём—
Цешши са 'ццóм.

Гл. № 169. Нівы, 1920.

№ 171.

Гром гриміць, дош сіканýў,
Змацыў дзеўку раскрасаўку.
Старый дзет шацёр расьпёр,
Ён зваў у шацёр красну дзеўку:
—Ў маім шатрэ сусéшынька, бялёшынька!
„Ні пайду я ў твой шацёр —
Красна дзеўка атказала.

Кашавічы, 1922.

Романовъ, Б. С., VIII, с. 194. *Добровольскій*, С. С., IV на с, 117 № 76.

№ 172.

Гром грамануў,
Дож сіканўў,
Змациў деўку цирнаброўку,
Цорную галоўку.
Расьпёр шацёр (Іванінька),
Зваў у шацёр дзяўцинуцку;
— Хадзі, дзеўка, ка мне ў шацёр,
— У маім шатрє дожжу нетуці.
„Мокрай мне быці—
„Ў шацёр ня йціць,
„Бог мяне змоциць—
„Бог мяне й высушиць.

Гл. № 171. Крутае, 1918

№ 173.

Гром грамануў,
Дож сіканўў
Змациў деўку чирнабриўку
— Хаді, деўка, пыд мой шацёр,
— А мой шацёр далёк знацон.

Гл. № 171, 172. Шаршні, 1915.

№ 174.

Ўзыйшла туча грымавая,
Грымавая дажджавая.
Гром грымануў—дош сіканўў,
Змачыў дзеўку чырнаброўку,
Чырнаброўку-чорную галоўку.
У дарозі хлопіц коняй пасьціў.
Міма йшла ды прыйшла
Красна дзевушка;
— Зайдзі, заідзі, красна дзевушка!
— Ў мой шацёр.
— У маім шатру многа госьсяй,
— Госьсі маі—усё родныі.

Гл. № 171-173. Бабінічы, 1913.

№ 175.

За гарою, за крутою
Праржаў конік варонінькій,
Ён ні праржаў—праўду казаў.
Астаўся конь ні хызяіну,
Ні хызяіну—тытарину.
Ў ягò стойла ня мецяна,
Ў яго грива ня цосана,
Ў яго капыты ня цисціны.
За гарою, за крутою
Іржаў конік варонінькій,
Ён іржаў і праўду кызаў.
Астаўся конь хызяіну (імя і па бацькі),
Ў яго стойла вымяціна,
Ў яго грива пацосана,
У яго капыты пацисціны.

Крутае, 1919.

Шейнъ, М., I, 2, на с. 501 № 24.

№ 176.

Кыла маё поля, кыла зіляного
Ў тым полі ягыт многа.
Пышла мыладая у ягыды,
У ягыды, у зілянушкі.
Ўзыйду мылада на гару,
Плясну мылада у ладоні.
Ладонь мыя зытришшала,
Кольцы маі зыбрижжалі,
Сьвёкар-бацька спужаўсі-тка,
Сьвякрова-матка улякнулыся;
— Ні пужайся, сьвёкыр-бацька,
— Ні ўлікайся, сьвякрова-матка,

— Ня вы мне спраўлялі,
— Ня вы суражалі,
— А справіў сударь-бацька
— Судариня-матка.

Крутае, 1918.

Шейнъ, Б. П., № 262; М., I, 1, № 169. *Романовъ*, Б. С., II, на с. 265 № 11; с. 269 № 1; с. 278 № 7; VIII, с. 222, 227, *Безсоновъ*, Б. П., № 130. *Радченко*, Г. П, на с. 32 № 89. *Розенфельдъ*, Б. П., на с. 90 № 68, с. 82 № 30. *Добровольскій*, С. С., IV на с. 259 № 28.

№ 177.

Чий гэта лён лі балота,
Лі балота ня полыный?
(імя) лён, лі балота ня полыный.
— А што-ш ён ня полыный?
— Ці за бальшой гульнёй,
— Ці за крєпкім сном?
Ні за бальшой за гульнёй,
Ні за крєпкім сном —
За бальшой работый.

(там сама).

№ 178.

Як за гарою за крутою,
За сьсянòй кымяною
Праржаў коня варонінькій,
Коня приржаў—праўду скызаў.
Пупаў коня ні к хызяіну,
Ў пусту хату (Карпіну),
(Карпа) гриву ні расцосываіць,
Капыцікі ня выцисціць,
Стойла ня выміціць.
— За цым-жа ты за ім ні приглядаіш?
— Ці ты к деўкам цаста ходіш?
— Ці ты ‘т девык позна ходіш?
„Да девак іду—кыня вяду,
„Да ‘ткуль коня гладык будіць;
„Аўса коню я ня сыплю,
„Пойла каню я ні стаўлю.
Як за гарой, за крутой,
За сьсяной камяной
Праржаў коня варонінькій.
Коня праржаў—праўду сказаў.
Пупаў коня к (імя).
Ў каня грива расцосана,
Капыцікі ў кыня выцисціны
Стойла ў кыня высслана.

Ён за деўкым ні ўхажваў,
Каню авёс ўсягды сыпаў,
Деўкі йдуць, з сабой завуць,
Скажу, деўкі, я вам праўду —
Ёсь ў мяне конь варонінькій.

(там сама).

№ 179.

А хто ў нас
Да девак лас,
Пад пец лазіў—
Курэй лавіў?
(імя) курэй лавіў
Ў штаны садіў;
Ў штаны садіў
Дамоў насіў.

(там сама).

Романовъ, Б. С., VIII, с. 220. *Никифоровскій*, Б. П., № 311.

№ 180.

Сонейка йішло па гарам йіграя,
Месяц йішоў, па запольлю сьвісьця,
Хваліўся той сёй жаной,
Выхваляўся (імя) сваёй.
— Даў-жа мне бог да жанушку—душку,
— Толькі мне зь ёй ды пры ўгораді жиць,
— Ў гораді жиць—мне пісарам быць,—
— Жане маей ўсё пісарахай,
— Толькі мне суды судіць,
— А жане маей пірасуживаць,
— Дяцём маім пірапісываць.

(там сама).

№ 181.

Прыляцелі галубы—
Селі—палі на ральлі,
Сталі яны варкуваць
І аб аральлю крыльлям біць:
— Лепшы аральля раньняя,
— Чым позьняя.
— На раньняй—пшаніца,
— На позьняй мятліца.
Ой, у Слоцкім на рынку
П'юць мужыкі гарэлку
І аб жаночак гаворуць:
— Лепшы жонка першая,
— Чым летая—другая.

— Ой, я зь першай дзяця меў,
— А з другой угадаваў,
— А з трэцьцяй разайшоў.
— Ідзіця, дзеці, служыць,
— Чым лі мачыхі гадзіць.
Пайшлі дзеткі служыць,
Ні сталі мачыхі гадзіць.

Плоскае, 1913.

Шейнъ, Б. П., № 216, 217; М. I, 1, № 524. *Дмитріевъ*, С. П., с. 82-83. *Романовъ*, Б. С., I на с. 38 №№ 70, 71; VIII, с. 184. *Радченко*, Г. П. на с. 184 № 129. *Розенфельдъ*, Б. П., на с. 76, № 36. *Булгаковскій*, П.; на с. 117 № 10. *Zieńkiewicz*, .P G., с. 326 *Малевичъ*, Б. П., на с. 134 № 42 *Д.-Запольскій*, П. П., на с. 147 № 13.

№ 182.

Як па масту па калінавым
Там бег коня варонінькій,
На тым кані доб моладзец (імя),
У пагонь ушла (імя):
— Пастой (імя) скажу табе,
— Скажу табе—люблю цябе,
— Люблю цябе—і замуж пайду.

(там сама).

№ 183.

Бумажинька, бумажинька (Васіха),
бумажинька,
Выхаділа, выхаділа на вуліцу
выхаділа;
Выглідала, выглідала сабе выглідка
выглідала,
Выглідык мой, выглідык мой (Цімоха),
выглідык мой,
Выгліжан ты, выгліжан ты, на вуліцы
выгліжан;
Ты на вуліцы, на вуліцы, на шырокай,
на шырокай;
На вуліцы міжа мальцаў,
міжа мальцаў,
Міжа большых, міжа мальцаў.

Крутае, запіс Г. Даўгялы, 1919.

№ 184.

Высок, высок у бару лясок,
Вышей яго у бару нетуці.
Багат, багат, наш хызяін

Багацей яго ў гараду нетуці.
Сам ён ходіць у золаці,
Жана яго ў сірабрэ,
А деці ў жамчушках,
А сам сядіць за столікам,
Жана яго на лавацкі,
Деці яго вакруг стала,
А сам ён п'ець зіляно віно,
Жана яго—салодкій мёд,
Деці яго—сіцицию,
Слугі яго—вадіцию.

Крутае, 1919.

№ 185.

Засею я лён, лён канапелькі,
Наляцелі пташкі вірабейкі,
— Пусьці, пусьці, мамка!
— На вуліцку пагуляць,
— Пташак вірабеік паганяць.

Забулдычына, 1914.

Безсоновъ, Б. П., № 86.

№ 186.

Іван, Іван старый дзед!
А што гэта за зельля
Ды сіняя карэньня?
— Гэта зельля—купéна
— Дзявоцкая ўмываньня,
— Малёцкая ўціраньня;
— Дзявоцкая красата,
— Малёцкая сухата.

Трахімёнкі, 1914.

Шейнъ, Б. П., № 228; М. I, 1, № 223. *Дмитріевъ*, С. П., с. 224. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 216, 225. *Крачковскій*, Б. П., с. 135—137.

№ 187.

Бумажинька (Мархушинька)
Белый сырок (Ліксандрацка)
Выхаділа на вуліцу,
Выгладала сабе выглідка.
Выглідык мой (Ліксандрацка),
Выгліжин ты на вуліцы,
На вуліцы, на широкэй,
Міжа мальцыў, міжа больших,
Міжа мушчин—мужицкій сын,

Міжа паноў—ён паньскій сын,
Міжа купцоў—купецкій сын
Выглідык мой, (Ліксандрацка).

Гл. № 184. Крутае, 1920.

№ 188.

Дубраванька зялёная,
Чаго рана зашумела?
Яшчэ вятры ня веялі,
Дробны дажжы ня скокалі.
Мыладая (Домна),
Чаго рана заплакала?
Яшчэ сваты ня ехалі,
Правай рукі ні давалі
Зылатога пірсьня ні мінялі.

Нікрапольле, запіс Ів. Маркава, 1914.

№ 189.

За лесам, за белай бярозай
Калёскі тарочуць, гандляры едуць,
Чарнілы вязуць.
— Жонычкі, лябёдкі, купляйця чарнілы.
— На што-ш нам чарнілы—
— Мы і так чарненькі,
А так мы чарненькі, як чорны вораны.
За лесам, за белай бярозай
Каляскі тарочуць, гандляры едуць,
Бялілы вязуць.
— Деванькі, лябёдкі! купляйця бялілы.
— На што-ш нам бялілы—мы і так белянькі,
— Мы і так бяленькі, як белы лябёдкі.
У ва 'ржи, на мяжи калёсы скрипелі,
Там едуць таргоўцы, таргуюць бялілам
— (Жигульскія) деўкі, купляйця бялілы!
— Біз бяліл мы белы, біз румян мы румяны.

Марацовы, 1919.

Шейнъ, М. I, 1, № 195. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 128 № 88 абв. на с. 250 № 33, на с. 269 № 20.

№ 190.

— Купала, Купала, а дзе ты бывала?
„Бывала, бывала у сьвікряткі у дворы,
„У сьвякрованькі на ў рукаве.
— Купала, Купала, а што-ш ты едала?
„Едала, едала кулагу ня прэлу,

„Кулага ня прэла—місычка кырава,
„Місычка карэла—ложачка ня мыта.
— Купала, Купала, а дзе-ш ты сыпала?
„Сыпала ў пухавой пярыні,
„У пухавой пярыні, у белый засьцілкі.

Нікрапольле, 1914.

№ 191.

Мыладзіца мыладая!
Чаго ня йдзеш на вуліцу, на шырокую?
— Як-жа мне йці на вуліцу, на шырокую
— Сьвёкар кажыць:—„мядзьведзіца“,
— А сьвякрова:—„пахмурніца“,
— Дзівяры кажуць:—„зілянýха“,
— А залоўкі:—„шчыбятуха“.
Жына мыя вінчальная
Ня ўмела атказаць:
Мядзьведзіца—у цёмным лесі,
Пахмурніца—цёмная ночка,
Зілянуха—траўка мураўка,
Шчыбятуха—сарока ў лóзі.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 257; М. I, 1, № 200. *Безсоновъ*, Б. П., № 149. *Радченко*, Г. П., на с. 131 № 17. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 217, 220; М., II, на с. 247 № 342. *Zieńkiewicz, P. G.*, на с. 142 № 6. *Киркоръ*, С. Я., с. 256.

ПЕСЬНІ ПРАЦЫ

ПЕСНІ ПРАЦІ

I.

Вынікі зьбіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне песень, якія сьпяваюцца пры працы.

Песьні, якія сьпяваюцца пры палявых працах, падзяляюцца на жніўныя, талачанскія, сенакосныя і інш. У такім парадку і разьмяркуем іх па месцах запісаў.

Жніўныя песьні запісаны ў наступных мясцовасьцях:

Аршанскі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Романовъ, Б. С., II), Чаркасы—1 (Шлюбскі).

Віцебскі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шейнъ. М. I, 1), Бабініцкая воласьць—13 (Романовъ, Б. С. VIII), Барсукі—4 (Шлюбскі), Белая Дуброва—3 (тс.), Васкавічы—1 (Шейнъ, Б. П.), Воранава—1 (Шейнъ, М., I, 1), Лескавічы—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Лескавіцкая воласьць—2 (Шлюбскі), Мадзеліна—1 (Шейнъ, М., I, 1), Нікрапольле—13 (Шлюбскі), Пышнікі—1 (тс.), Сініцы—5 (Романовъ, Б. С., VIII), Ужляціна—1 (Шлюбскі), Шчэрбінская воласьць—3 (Романовъ, Б. С., VIII).

Вяліскі п.: Казакова—6 (Романовъ, Б. С. VIII), Крутое—8 (Шлюбскі), Марацова—3 (тс.), Маклок—2 (Романовъ, Б. С., VIII), Нівы—1 (Шлюбскі), Сінякі—4 (тс.), Узкае—2 (Романовъ, Б. С., VIII), Усьвяты—2 (Шейнъ, Б. П.), Шаршні—2 (Шлюбскі), Маложы—1 (Ив. Кузьмин, О собирании произведений народ. словесностности, „Известия Велиж. Уезд. Совета". 1919, № 124).

Гарадоцкі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—9 (Шейнъ, Б. П.), Казьяны—4 (Романовъ, Б. С., VIII), Куксінская воласьць—1 (Шейнъ, Б. П.), Болецк—2 (Романовъ, Б. С., VIII), Віроўля—1 (тс.), Мішневічы—5 (тс.).

Дзісьненскі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Шейнъ, М., I, 1), Дзісна—1 (Дмитріевъ, С. П.), Заулкі—5 (Романовъ, Б. С., VIII), Леанпольская вольсьць—14 (Добровольскій, С. С., IV).

Дрысенскі п.: Валейкава—1 (Романовъ, Б. С. VIII), Гирдюкі—1 (тс.), Табалкі—2 (тс.).

Лепельскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—21 (Романовъ, Б. С., VIII),—7 (Шейнъ, Б. П.),—8 (Czeczot, 1846), Арэхаўна—2 (Шейнъ, М., I, 1), Ветрына—4 (тс.), Апанаска-

вічы—7 (Шейнъ, Б. П.), Бабч—3 (тс.), Дуброўкі—23 (тс.), Капціевічы—2 (тс.), Косаўшчына—1 (Шлюбскі), Несінская воласьць—6 (Романовъ, Б. С., VIII), „Ушачскій округ"—3 (Шейнъ, Б. П.), Чашнікі—39 (тс.).

Нова-аляксандраўскі п.: Браслаў—4 (Романовъ, Б. С., VIII).

Парэцкі п.: Інькава—3 (Добровольскій, С. С., IV).

Полацкі п.: Арлоўка—2 (Шлюбскі), Полацак—1 (тс.).

Себескі п.: па паштовым шляху з Себежа ў Люцын—6 (Анимелле, Б.Б.К.), Езерская воласьць—1 (Шейнъ, Б. П.), Далосцы—3 (Романовъ, Б. С., VIII), без азначэньня валасьцей і вёсак—6 (тс.).

Сеньненскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—3 (Романовъ. Б. С., II), Аўсішча—1 (тс.), Беліца—5 (тс.), Дубсвцы—1 (тс.), Латыгава—4 (тс.). Лісічынская воласьць—1 (тс.), Нямойта—1 (тс.), Запольле—1 (тс.), Расна—2 (тс.), Сьлідцы—4 (тс.), Цюцькі—1 (тс.), Замочак—2 (Романовъ, Б.С. VIII), Плоскае—6 (Шлюбскі).

Сураскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—6 (Шейнъ, Б. П.), Казловічы—2 (тс.).

Апрача пералічанага, у Раманава зьмешчана I песьня (Б. С., VIII), азначаная і ў Віцебскай губэрні.

Некаторыя жніўныя звычаі запісаны ў такіх мясцовасьцях: Аршанскі п., (Шейнъ, Б. П.), Любавічы (тс.); Віцебскі п.: Шчэрбінская воласьць (Романовъ, Б. С., VIII), без азначэньня воласьці і вёскі (Шейнъ, М.. I, 1); Вяліскі п.: Крутое (Шлюбскі); Гарадоцкі п.: без азначэньня месцаў запісаў (Шейнъ, М., I, 1), Лепельскі п.: Бабч (Шейнъ, Б. П.), Чашнікі (тс.); Полацкі п.: Забулдычына (Шлюбскі), Себескі п. (Романовъ, Б. С. VIII), па паштовым шляху з Себежа ў Люцын (Анимелле, Б.Б.К.). Сеньненскі п.: Плоскае (Шлюбскі); Нова-аляксандраўскі п. (И. К. Этнографическіе очерки (Ковенскія Губ. Вѣд., 1890, № 31—45).

Закранутаму пытаньню прысьвечаны нарыс А. П. (Пщелко). Зажинки и обжинки (Витебскія Губ. Вѣдом., 1903, № 207, 240, 283); некаторыя матар'ялы датычныя Віцебшчыны, знаходзім у Шэйна (Б. П., аб боге „Раю").

Талочныя песьні запісаны:

Аршанскі п.: Мошкава—5 (Шейнъ, М., I, 1).

Віцебскі п.: Воранава—1 (Шейнъ, Б. П.).

Дзісьненскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—5 (Шейнъ, Б. П.), Заулкі—6 (Романовъ. Б. С., VIII).

Дрысенскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—1 (Шейнъ, М., I, 1).

Лепельскі п.: без азначэньня валасьцей і вёсак—2 (Романовъ, Б. С., VIII), —3 (Шейнъ, Б. П.), Ветрына—2 (Шейнъ, М., I, 1), Дуброўкі—1 (тс.),—5 (Шейнъ, Б. П.), Ізабеліна—1 (Романовъ, Б. С., VIII), Капціевічы—2 (Шейнъ, М., I, 1), Косаўшчына—2 (Шлюбскі), Скачыхі—2 (тс.). „Ушачскій округъ"—6 (Шейнъ, Б. П.), Чашнікі—11 (тс.).

Нова-аляксандраўскі п.: Браслаў—3 (Романовъ, Б. С.. VIII).

Полацкі п.: Арлоўка—4 (Шлюбскі), Гарбаценкі—2 (тс.), Забулдычына—6 (тс.), Пазьнякова—1 (тс.), Юравічы—2 (тс.).

Сеньненскі п.: без азначэньня воласьці і вёскі—1 (Романовъ, Б. С. II), Беліца—2 (тс.), Ганчарова—1 (тс.), Дубоўцы—1 (тс.), Зенькава—7 (тс.), Неймата—1 (тс.), Цюцькі—2 (тс.), Латыгава—1 (тс.), Ульлянавічы—2 (тс.), Сянно—1 (тс.), Плоскае—1 (Шлюбскі).

Сураскі п.: Кашавічы—1 (Шлюбскі).

Талочныя звычаі запісаны ў Себескім п., па паштовым шляху з Себежа ў Люцын (Анимелле, Б. Б. К.) і адносна ўсёй Віцебскай губэрні—знаходзяцца ў Шэйна (Б. П.). Некаторы матар'ял ёсьць у нарысе (Пщелко): Толока (Витебскія Губ. Вѣд., 1903, № 139) і ў працы Нікіфароўскага: „Простонародныя примѣты и повѣрья"...

З другіх катэгорый песень, якія ўжываюцца пры гаспадарчых працах запісаны:

Песьні сенакосныя. Віцебскі п.: Нікрапольле—1 (Шлюскі), Вяліскі п.: Крутае—1 (тс.), Туры—1 (тс.), Дзісьненскі п. Дзісна—1 (Дмитріевъ, С. П.), Парэцкі п.: Бародзенская вол. — 1 (Шлюбскі), Сураскі п.. Кашавічы—5 (тс.).

Песьні пры араньні. Дзісьненскі п.: Дзісна—1 (Дмитріевъ, С. П.).

Песьні ільняныя. Полацкі п.: Забулдычына — 1 (Шлюбскі).

Песьні пастухоўскія. Лепельскі п. Косаўшчына—1 (Шлюбскі).

Песьні рыбака. Сураскі п.: Астроўскія—1 (Сапуновъ, Рѣка Зап. Двина, с. 494).

Песьні стругаўскія. Вяліскі п.: Будніца—2 (Шлюбскі), гл ў Сапунова (Рѣка Зап. Двина, с. LXIX) перапрацоўка народнай стругаўской песьні Вяліскага павету.

Беларускія песьні, злучаныя з палявой працай, разглядаюцца ў досьледзе акад. Е. Карскага „Бѣлорусы, III, 1, на старонках 197-205 укл. у разьдзеле: „Обряды и пѣсни при полевыхъ работах, особенно жнивные".

II.

Жніўныя і талочныя звычаі.

З палявых прац сяляне зьвяртаюць асаблівую ўвагу на „жніво“ і „талаку“.

Калі дажынаюць збожжа і снапы складзены ў „ба́бкі“, жанчыны зьбіраюцца каля маленькага кавалачку нязжатага збожжа, які кідаецца „богу на бараду“ і з дажатага ўюць вянок з калосьсямі, у часе яго завіваньня сьпяваецца асобная песьня, якая завецца „казёл“; пры сьпяваньні першай часткі „казла„ ці „першай барады“ памінаецца асоба, якую ня любяць і хочуць аблаяць, а пры сьпяваньні „другой барады“ памінаецца той гаспадар, чыё дажата збожжа. Песьня гэтага разраду па ўсёй Беларусі існуе толькі адна, розьніца ў некаторых драбніцах. Ёсьць „казёл“ і з „мàцернай“ лаянкай. Калі вянок сплецены, яго кладуць на галаву аднэй жанчыне і, сьпяваючы песьні, ідуць да гаспадара. Дарогай сьпяваецца асаблівы від песень, які завецца „раёк“. Разам з вянком жанчыны прыносяць да гаспадара і сноп таго збожжа, якое дажалі. Вянок вешаецца на абразы, а сноп становіцца ў кут. Гаспадар частуе жней гарэлкай і рознай ежай, а жнеі пад‘еўшы сьпяваюць песьні і скачуць (Забулдычына, 1914).

У Вяліскім павеце існуе такі звычай: пры самым сканчэньні жніва сьпяваецца „зажинацная“ песьня, і пакідаецца невялікі кавалак нязжатага збожжа; ён павінен быць абавязкова круглым, велічынёй ушыркі і ўдоўжкі каля аршыну; завецца ён „барадой“. Усе жнеі, паклаўшы сярпы, сядзяцца каля „барады“, а адна з іх, пераважна дзяўчына, „дажынаіць бараду“. Перад пачаткам „дажынаньня“ яна загадвае якую-небудзь загадку, напрыклад, калі будзе парны лік „пясьцей“— выйдзе замуж, а ня будзе—ня выйдзе. Кожных тры „пясьці“ кладзецца асобна. Барада зжынаецца ня ўся — крыху пакідаецца. Пакінутая жнеямі барада завязваецца вузлом, пад вузел у зямлю кладзецца кавалак хлеба, каб на наступны год лепей урадзілася збожжа і сярпом гэты вузел убіваецца ў ніву пры словах: „ніўка, ніўка, падай маю сілку“! Каля барады жнеі ядуць бліны, хлеб, п‘юць гарэлку, мёд, пасля чаго ідуць да гаспадара (Крутае, 1919).

Калі жняя ў полі жне „праствалосая“, то ня будзе радзіцца збожжа (Крутае, 1919). Калі серп, якім жне жняя хтонебудзь прынясе да хаты, то будзе дождж (Плоскае, 1915).

Па сканчэньні „талакі“ гаспадар, у каго яна адбывалася, павінен быў „задáць пір“. У гэты дзень уся вёска ня паліць печак і нічога ня варыць есьці; усе зьбіраюцца да таго гаспадара, у каго была талака, і ён павінен усіх „прыхажáнак“ частаваць ежай і гарэлкай. На талаку мелі права прыходзіць зусім незнаёмыя людзі, якіх гаспадар павінен быў частаваць, як сваіх найлепшых сяброў і найбліжэйшых сваякоў. Стравай у талаку асеньнюю (у „прачысьцінскій пост“) было: 1) „халаднік“ з буракоў і квасу, 2) „бульба“, 3) „крупéня“ з бобам альбо гарохам, заваложаная алеем, 4) „камы“ з каняплямі, 5) каша бульбяная“, 6) аўсяны кісель, а ў заможных сялян у дадатак да пералічанага 7) мёд 8) і рыба; стравай у талаку вясновую было: 1) „поліўка“ з мясам, 2) „крупеня“ з мясам, 3) „камы“ з душáмі“, 4) кісель і частка ежы з поснага меню. У час ежы п‘ецца гарэлка і ўвесь час сьпяваюцца песьні. Пасьля „вячэры“ моладзь да раніцы скача ў сенях, а старыя сядзяць за сталом, п‘юць гарэлку і ўвесь час сьпяваюць. (Забулдычына, 1915).

У сучасны момант песьні „ў талацэ“ ўжо ня ўжываюцца.

Песьні, якія сьпяваюцца ў час жніва, завуцца „жнéйнымі“ (Лепельск. п., 1921) або „жніво“ (Крутае, 1919); песьні талочныя—„талачáнскімі“ (Забулдычына, 1915), выраз „талаку іграць“ гаворыць і аб сьпяваньні песень і аб звычаях, злучаных з талакой (Крутае). Сенакосныя песьні „іграюцца на пагоду“ (тс.).

III.

Тэксты жніўных песень.

№ 192.

Працистая маць!
Хаді бараду абжинаць,
Сваей правай рукой,
Зылатым сваім сярпóм,
І мізіным пярстом.
Стаяў казёл на мяжэ,
Дівуваўся бараде:
— Діва, діва—бырада
— Придаўжусінька была?
А ция-ш то бырада
Цорным шоўкам увіта,
Сатой, мёдам паліта?
(Сямёнава) бырада
Цорным шоўкам увіта,
Сатой, медам паліта.
Ты, хызяюшка, ні ляжи,
Бародушку абліжи!
Вазьмі пумяло—
Пыгыняй кымароў.
Шугý-пугý кымару
З (Сямёнавай) бырады
У (Васількіну) быраду [1]).

Марацова, 1919.

Шейнъ, Б. П., № 354; М. I, 1, № 298, *Радченко*, Г. П., на с. 60 № 17. *Романовъ*, Б. С., XII, на с. 289 № 38, VIII, с. 264, 266-267, 271, 272. *Чубинскій*, Т. III, на с. 227 № 2. *Метлинскій*, Ю. П, с. 325-326. *Кузьмин*, Ив. О собирании произведений народной словесности (Изв. Велижского Уезд. Сов...", 1919, № 124.

№ 193.

Ішоў казёл пу мяжы
Дівуваўся бырады:
— Ция ета бырада
— Ўся шоўкам увітá? [1])

[1]) Так бараду „пераганяюць" ад гаспадара, у якога скончылі жаць, да гаспадара, у якога пачынаюць жаць.

Салодкім мёдам паліта?
— (Якушова) бырада
— Ўся шоўкам увіта—
— Уся шоўкам увіта
— Саладкім мёдам улітá [1]).
(Дарýтушка) ні гуляй,
— Цорный шоўк тэй разьвівай;
— (Дарутушка) ні ляжи—
— Бародушку абліжи.

Гл. № 192. Сінякі, 1919.

№ 194.

Ішоў казёл пы мяжи,
Дівaваўся бырады.
Дівa, барада! Дівa, бырада!
Дівавалася каза,
Што былтаіцца ў казла.
Дівa, барада! Дівa, бырада!
А тый, козінька казёл,
Пыкажи мне й свой хахол!
Дівa, барада! Дівa, бырада!

Гл. № 192, 193. Крутае, 1919.

№ 195.

Ішоў казёл пу мяжи,
Дівуваўся бырады
— Чыя гэта бырада } 2.
— Уся медам улітá? }
(Імя гаспадара) барада ўся мёдам уліта. 2.
Уся бярёзкый увітà.
А ты хазяін (імя) ні ляжи—
Бародку абцаши, (абіліжи).

Гл. № 192-194. (там сама).

№ 196.

Ішоў казёл па мяжэ,
Дзіваваўся барадзе:
Дзівa! Дзівa!
У (імя) барада
Уся гнідамі увітà,
Вашамі высажана,

[1]) Калі мала гаспадар частуе гарэлкай то тагды, заместа „мёдам“, сьпяваецца „дёгцям“.

Блахамі выстрачана.
Ішоў казёл па мяжэ,
Дзіваваўся барадзе:
Дзіва! Дзіва!
У (імя) барада
Уся шоўкам увітá,
Злотам высажана
Срэбрам выстрачана.

Гл. № 192-195. Забулдычына, 1914.

№ 197.

Ляжыць казёл пыд мяжой,
Дзівіцца бырадой:
Бародынька-бырыда!
А чыя-ш-та бырыда—ўся дёхцім уліта,
Бяростаю увіта?
Бародынька-бырыда!
(Сямёнкіна) бырыда ўся дёхцім уліта,
Бяростый увіта.
Бародынька-бырыда!
(Аўдотычка) ні ляжы, бародынькý абліжы,
Бяростыньку абдяры.
Бародынька-бырыда!
Ляжыць казёл пыд мяжой,
Дзівуіцца бырадой
Бародынька-бырыда!
А чыя-ш то бырыда ўся мёдам уліта,
Уся мёдам уліта, чорным шаўком увіта,
Бародынька-бырыда!
(Стыхванькіна) бырыда ўся мёдам уліта,
Уся мёдам уліта, чорным шаўком увіта,
Бародынька-бырыда!
(Кыцярынычка) ні ляжы—бародыньку абліжы,
Бародыньку абліжы, чорный шоўк абдзяры,
Бародынька-бырыда!
Я ўсю ночку ні спала—бародыньку лізала,
Бародынька-бырыда!

Гл. № 192-196. Барсукі, запіс П. Стэфніка, 1921.

№ 198.

Сядзеў казёл на мяжэ,
Дзіваваўся барадзе:
Дзіва, дзіва!
Чыя-ш гэта барада
А ўся-ш дёгцім уліта

І бяростай увіта?
Дзіва, дзіва!
(Пітракова) барада,
А ўся-ж дзёгцям уліта
І бяростай увіта.
Дзіва, дзіва!
А (Васіха) ні ляжы,
Бародыньку чырадзі.
Дзіва, дзіва!
А чыя-ш гэта барада
А ўся-ш мёдам уліта
Чорным шоўкам увіта?
Дзіва, дзіва!
(Юстынава) барада
А ўся-ш мёдам уліта,
Чорным шоўкам увіта.
Дзіва, дзіва!
А (Галена) ні ляжы,
Бародыньку сьціражы.
Дзіва, дзіва!

Гл. № 192-197. Белая Дуброва, 1914.

№ 199.

А мы сягоньні пыжаліся,
І с полюшку убраліся.
А мы сягоньні пажнём
Ды хазяіна ражном,
А хызяюшку цыпельнікам,
Каба гутувала вячєрушку.

Шаршні, 1915.

Романовъ, Б. С. VIII, с. 266, 267.

Р а ё к.

№ 200.

Ішоў раёк дарогаю,
Ішоў раёк шырокаю.
Ніхто раёк ні пярэйміць,
К сабе ні заверніць.
(Імя) выйдзі панок, піраймі раёк.
—Ідзі раёк на мой дварок,
—Мае двары мяцёныі,
—Мае сады зялёныі,
—Мае дамы вясёлыі,
—Мае сталы дубовыі,

— Напітачкі мядовыі,
— Закусачкі цукерныі.

Заблудычына, 1914.

Шейнъ, Б. П., № 359, 360; М. I, 1, № 301, 302. *Романовъ*, Б. С. VIII, с. 267—269. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 256 № 15.

№ 201.

У нас сягодні вайна была:
Усё поля зваявалі,
У снапочкі павязалі,
І копачкі падлічылі.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 379. 380; М., I, 1, № 315. *Дмитріевъ*, С. П., с. 255, *Tyszkiewicz*, O. P. B.. с. 397. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 261. *Zieńkiewicz, P. G.* на с. 228 № 8. *Киркоръ*, Э. в. В., на с. 233 № 68. *Носовичъ*, Б. П., на с. 98 № 20.

№ 202.

Ішоў бог дарогай,
Ніхто бога ні пярэйміць
І ды сябе ні заверніць.
Пірыняў яго (імя):
— Ка мне, божа, ка мне
— Ды ў маё гумно.
— Хадзі, божа, у маё гумно.
— Маё гумно вялікая,
— Піраплоты высокіі
— Ёсь дзе богу пасядзець,
— На дабро паглядзець.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 363; М. I, 1, № 305—309. *Сербовъ*, Б. С., на с. 146 № I; на с. 147 № III. *Розенфельдъ*, Б. П., на с. 80 № 42. *Zieńkiewicz*, P. G., на с. 226 № 5. *Киркоръ*, Э. в. В., на с. 224 № 43. *Янчукъ*, П. М. № 29, 71.

№ 203.

Выхадзіла грозна туча
С-пад цёмнага лесу,
Да ня вышла;
Толькі выслала буйнага ветру
Да дробнага дажджу.
Выхадзіла наша гаспадынька
Ранінька на ніўку,
Ды ня выйшла;
Толькі выслала нявестак
Лябёдак, дачок-пірапёлак.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 369, 370, 371; М., I, 1, № 322. *Романовъ*, Б. С, II., на с. 275 № 21; VIII, с. 260, 269, 272. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 253 № 3. *Карскій*, Б. П., XXI, № 74, *Носовичъ*, Б. П., на с. 96 № 11. *Czeczot*, P. w. N. D., № LVIII. *Tyszkiewicz*, W., с. 340.

№ 204.

Зялён наш бор, зялён,
Над усімі барамі зялён,
А багат наш пан, багат,
Над усімі дварамі багат.
Кылі яго варот
Тры ручайкі працікаіць:
Адзін ручэй—зілянò віно,
А другій ручэй—салоткі мёт,
А трэцьці ручэй—ярышная піва,
Зялёная віно—ля дзетак ля яго,
Салоткі мядочак—ля суседцыў ля яго,
А ярышная піва—ля самога ля яго.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 381—384 ўкл. *Czeczot*, P. w. N. D., № LXII.

Пірапёлка.

№ 205.

Пірапёлка, сізая галоўка!
Ні літай па полю,
Ні зьбірай калосься,
Ня ві гнязьдзечка
Бліска лі дарошкі,
Ня ві гнязьдзечка,
Ні нясі яечкі,
Пастушкі пагонюць,
Гнязьдзечка распоруць,
Канюшкі паедуць—
Яечкі паберуць.

Пазьнякова, запіс Г. Гарбачэнка, 1920.

Шейнъ, Б. П., № 327. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 250, 258.

№ 206.

Пірапёлка, сізая галоўка!
Ні літай па полю, ні зьбірай калосься
Ня ві гнязьдзечка бліска лі дарошкі,
Канюшкі наедуць—піряпёлку застрэлюць
Пастушкі пагонюць—гнязьдзечка распоруць
Пірапёлку ў юшку, а пер'я на падушку,
Ношкі на панчошкі, а кішкі на пыдвяскі.

Арлоўка, 1915.

Гл. № 205.

№ 207.

Перапёлка, ой ня ві гнязьдзечка бліска лі дарошкі.
Канюшкі паедуць—гнязьдзечка раскапаюць,
Пірапёлка!

Табе маладзенькай ўсё жаль будзіць,
Што дзетак ня будзіць,
Пірапёлка!

Пастушкі пагонюць—гнязьдзечка распоруць,
Пірапёлка!

Табе маладзенькай ўсё жаль будзіць,
Што дзетак ня будзіць,
Пірапёлка.

Гл. № 205, 206. Полацак-Віцебск, 1915.

№ 208.

Ні пайду я дамоў
Я тут зыначую.
Буду нычаваць
На белай бярозі,
Буду праклінаць
Мужа ў дарозі.
Ох, убі, божа!
Сьвёкра на парозі,
А сьвякроўку на пе́чы
Ты каменьням у плечы.
Ох, убі, божа!
Сьвёкра качаргамі,
А мужа пірагамі.
Божа, мой мілый!
Божа, мой любый!
Каму я ўчыніла,
Кыла каго́ піла
І сьміялась,
Таму я й дысталась.
А сь кім хадзіла,
Сь кім гыварыла,
Тэй за плячмі стаіць
Ручачкі ломіць
Дробны сьлёскі роніць.

Плоскае, 1913.

Шейнъ, Б. П., № 317, 318. *Романовъ*, М., I, с. 147—148. Б. С., II, на с. 287 № 7. VII, на с. 29 № 14; VIII, с. 514; пачатак песьні параўн. з *Радченко*, Г. П., на с. 59 № 14. *Розенфельдъ*, Б. П., на с. 22 № 28. *Добровольскій*, С. С., II, на с. 61 № 109; IV, на с. 397 № 42-бв. *Zieńkiewicz* P. G., с. 224.

№ 209.

Жоначкі, дамоў—ціляткі рыкаюць!
Мужчынкі, дамоў, ні дроў, ні палена
І хатка акалела.
Дзяўчынкі дамоў—музыкі іграюць—
Малойчыкі гуляюць.

(там сама).

№ 210.

А пара нам дамоў ісьці,
Згубіла зара ключы
Кыла постуці ідучы.
— А хто-ж мае ключы знайдзіць
— Тый-жы ў восінь замуж пойдзіць.
А дзяўчынка йшла і ключыкі знайшла
І ў восінь замуж зайшла.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 314, 315. *Романовъ*, Б. С., VIII, с. 197, 251, 252, 254. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 255 № 13. *Киркоръ*, Э. в. В., на с. 212 № 21. *Носовичъ*, Б. П., на с. 95 № 9. *Czeczot*, P. w. N. D., LXXIX.

№ 211.

— Ой, дубра́ныч, шырокая поля!
— На здароўя, жнейкі маладыя,
Сярпы залатыя!
— Прыхадзіця заўтра параненьку,
— Як сонейка ўзыдзіць.
— Прынасіця па бу́ханку хлеба,
— Па беламу сыру,
— І па малому сыну.
Сонейка ўзышло,
Расіца апала.
Расіца апала,
Жнеяк ні бывала.

(там сама).

Шейнъ Б. П., № 313. *Романов* Б. С., II, на с. 281 № 6; VIII, с. 240-241. *Дембовецкій*, О. М. Г., I, на с. 538 № 4, на с. 543 № 34.

№ 212.

А, дзеванькі, у двор пара,
Ледзяная раса́ пала.
А мядовая раса́ пала,
А мядовая раса—таткіна.
Па лядовай расе пайду—
Маі ножанькі ва льду.
Па мядовай расе пайду—
Маі вусьцікі ў мяду.

Нікрапольле, запіс Ів. Маркава, 1914.

Романовъ, Б. С., II, на с. 384 № 15.

№ 213.

Сілязенька, ці высока літаіш?
Быстры крыльлі маіш,—
Ці пірыляціш шырокая поля,
Глубокая мора?
Ці піранясеш таткуву нéву
К сьвёкру на падвор'е?
Ні піралячу шырокага поля,
Глубокага мора
Ні пірынясу таткавы незі
К сьвёкру на падвор'е.

(там сама).

Романовъ, Б. П., VIII, с. 197, *Косичъ*, Л. Б., с. 66.

№ 214.

А вялік наш бор, вялік
Над усімі барамі;
А багат наш пан, багат
Над усімі панамі;
Яго коні вараныі
І слугі маладыі,
Яго коні, як жар-цьвет гараць,
Яго слугі, як мак цьвятуць.

(там сама).

Tyszkiewicz, О. Р. В., на с. 397 № II, *Анимелле*, Б. Б. К. IX, с. 109.

№ 215.

Закацілась жаркая сонца
За цёмны лясок.
Ні баюся я ні стуку, ні груку,
Ні цёмныя ночкі.
Толькі баюся госпада бога,
Свайго нілюбога.
Мяне гóспад бог пакараіць,
Ён мяне і пажалеіць.
Ой, нялюбый і б'ець і караіць
Ён мяне ні жалеіць.

(там сама).

Романовъ, Б. С. II. на с, 285 № 19, *Косичъ*, Л. Б. с. 62, *Мезерницкій*, Н. Т. П., 1910, I, на с. 88 № 3.

№ 216.

Зыкацілыся яркыя сонца за цёмный лясочык.
Зыхацелыся мне мыладзенькай
К свайму татыньку ў госьсі.
Ні баюся я ні ночкі цёмнай,

Ні тучынькі грознай.
Толькі баюся я госпада бога,
Яшчо свайго нілюбога.
Госпад божанька—ён пыкыраіць,
А нялюбый—пыбіваіць;
Госпаду божаньку я пымалюся,
А нялюбыму пыкаруся.

Гл. № 215. Барсукі, 1921.

№ 217.

А жонычкі, лябёдычкі!
Ай, пойдзім мы дамовачкі.
А нас дамоў ні пускаюць
Запустáці загыняюць,
Нашы дамы далёкіі,
А пòстуці шырокіі,
А сем міль борамі іці,
А восьмую дарогай,
Дзевятую дубравай,
А дзесятую—татульку
На вячэру.

(там сама).

Шейнъ, Б. П. № 300, 302; М. I, 1, № 264. *Носовичъ*, Б. П., на с. 95 № 10. *Czeczot*, P. w. N. D., № LVII.

№ 218.

А каліна-маліна!
Ня стой над вадой,
Нї раўняйся са мной.
Было тагды раўнувацца,
Калі я была у татулькі;
Бялей была твайго цьвету,
Красьней была тваіх ягóд,—
Асталася мужыку—
Ссушыў, як ліпінку у духý.

(там сама).

Шейнъ, Б. П, № 293. *Романовъ*, Б. С., II, с. 246 № 175; на с. 25 № 207; на с. 282 № 11; VIII. с. 242, 252, 255. 261. М., I, с. 153. *Розенфельдъ*, Б. П., на с. 65 № 14. *Д.-Запольскій*, П. П. с. 104 № 494. с. 177 *Никифоровскій*, Б. П. № 1725. *Розенфельдъ*, Б. П. на с. 41 № 57. *Анимелле*, Б. Б. К. на с. 108.

№ 219.

Як пайду я дарогаю,
Пушчу голас дубровáю.
А хто-ж мой голас зачуіць—
Тый-ж мяне пыжалеіць.

Зачуў голас мой татулька.
— То маё дзіця пяець,
— Дзіця пяець, поля красіць—
— Нявестычка людзей сьмяшыць.
— Дзіця пяець, як звон зьвініць—
— Нявестачка, як гром грыміць.

(там сама).

Дембовецкій, О. М. Г., I, на с. 542 № 28.

№ 220.

А гула пчолка, была
Па бару літаючы,
Салоткій мёд зьбіраючы.
Салодкій мёд на кануну,
А жоўцінькій воск
Ня сьвечычкі.

(там сама).

№ 221.

Добрый вечар сцюдзёная хатка
Ды ня родная матка.
Ні пытаіш: ці пілі, ці е́лі?
Толькі пытаіш:—ці многа нажалі?
Ці многа жжалі?
А мы жжалі поля ні сьмірно́я,
Поля ні сьмірноя, копы ні злічоны.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 303. *Романовъ,* Б. С., II, на с. 275 № 20; на с. 288 № 35; VIII, с. 253. *Радченко,* Г. П., на с. 55 № 2. *Косичъ,* Л. Б., с. 67.

№ 222.

Ні пайду дамоў
Я тут заначую,
Журбы ні пачую.
У мяне дома
Ня родная мамка,
Ня роднінькій татка,
Ні спітаіць:
— Ці баляць ручкі?
— Ці баляць ношкі?
Ды спытаіць:
— Ці многа нажала,
— Да ці многа жжала.
Я жжала поля ні зьмячона
І копы ні лічоны.

Забулдычына, 1914.

Шейнъ, Б. П., № 303. Гл. № 221.

№ 223.

А што змувіла
Шырокая поля,
Жыта едраноя,
Калосься буйноя?
— Ні магу-ж я ў полі стыяці,
— Кыласочка трымаці.
— Кыласочык галовыньку клоніць
— І саломінку ломіць.
А змувіла наша гаспадынька
Па двару ходзючы,
Зылатыя ключы носючы:
— Ні магу-ж я па двару хадзіці,
— Зылаты ключы насіці,
— Толькі-ж магу я мёд наліваці
— Ды гасьсей чыстуваці.

(там сама).

Шейнъ, Б. П., № 373, 375; М., I, 1 № 330. *Романовъ*, Б.. С, II, на с. 289 № 37. VIII, с. 248—249. *Радченко*, Г. П., на с. 32 № 88; на с. 55 № 1 *Чубинскій*, Т., III, на с. 241 № 31. *Метлинскій*. Ю. П., с. 322. *Добровольскій*, С. С., IV, на с. 199 № 30 абв. *Косичъ*, Л. Б., с. 66.

№ 224.

Накукуйся, шэра зязюлька!
Да на белай бярозі.
Як паляціць шэра зязюлька
У шчырыі бары—
Мінецца-ж тваё раньняя кукуваньня,
А позьняя вылітаньня.
Ні красуйся, малада дзяўчынка,
У сваей мамулькі.
А як зайдзіш ты ды ў чужыі людзі—
Мінецца-ж тваё белая умываньня.

(там сама).

Добровольскій, С. С., IV, на с. 16 № 6.

№ 225.

На дварэ азяро
А ва ‘зярэ белый камінь ляжыць,
А на камні сілязень сядзіць,
А ў сілізьня косы доўгіі,
А ў нашага (імя) кудры русыі,
А хочыць ён жаніціся,
А ні знаіць каго узяць.
Узяць цыганачку—ня ўмеіць жаць,
Узяць мяшчаначку—ручкі белыі,

А узяць сяляначку—йіна бога хваліць,
На ніўку ідзець—богу моліцца
І з ніўкі ідзець—богу моліцца,
Штоб ніўка падаўжэла,
Снапочкі пагусьсе́лі.

Косаўшчына, 1914.

№ 226.

Чыраз сад зялёнінькій
Бяжыць конь варонінькій,
А за ім ўдагонку мой малодзінькій су́жаный,
Ён полы засукаўшы, а шапаньку зьняўшы,
Увідзіў дзеваньку на высокім ціраме:
— Душа мая, дзеванька, піраймі майго каня
— Майго каня выранога, мяне князя мыладога,
